№ 25 (383) 9 ліпеня 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

«Беларусь увойдзе ў Эўразьвяз»
Пасьля параду.
старонка 2

Занадта прыгожая для беларусаў?
Мова, краіна, дзяржава, паліткарэктнасьць. Эсэ Аляксея Знаткевіча.
старонка 8

Закахацца ў Фігу
Інь і Ян эўрапейскага футболу.
старонка 11

500 гадоў Сьвятому Мястэчку

ІГАР ЛАСІЦА

Будслаўскі касьцёл мае статус Нацыянальнага санктуарыю Беларусі. Мястэчка на Мядзельшчыне мае значэньне, параўнальнае з Вострай Брамай у Вільні ці Чанстаховай у Польшчы. Фэст у Будславе праводзіцца штогод 2 ліпеня ў гонар абраза Божай Маці. Сёлета адзначалася 500-годзьдзе касьцёлу. Як заўжды, у Будслаў ішлі пешыя пілігрымкі з усіх куткоў Беларусі. З аднаго Берасьця выйшла 400 чалавек. Ехалі й на дызэлях, машынах, роварамі. Шлях ад станцыі Будслаў да мястэчка ідзе праз Палесьсе. Такую назву мае вёсачка, паўзь якую прайшлі шматлікія вернікі, чыя пешая пілігрымка складала чатыры кілямэтры ад чыгуначнай станцыі да сьвятыні. Пасьля беднай вёсачкі ўражвае гмах касьцёлу, кірмаш зь велізарным натоўпам сьвяточна апранутых людзей, мастацкі пленэр.
Старонка 3.

ГРОШЫ

Прыватны сэктар абараняецца

У Менску ствараецца Саюз домаўладальнікаў. Асноўная мэта новай арганізацыі — абарона правоў жыхароў прыватнага сэктару. Паводле генпляну разьвіцьця Менску, у горадзе мае быць зьнесены амаль увесь прыватны сэктар — каля 5 тыс. дамоў. Да 2015 г. пад знос пойдуць Грушаўка, Пятроўшчына, Сельгаспасёлак, вуліцы Маякоўскага, Авакяна, Жукоўскага, Арлоўская. **Старонка 5.**

З УСЁЙ КРАІНЫ

Сьвята неіснуючай вёскі

У Глыбоцкім раёне, на месцы, дзе калісьці стаяла вёска Ражкова, адбылося сьвята. Былыя жыхары выкасілі траву, падрыхтавалі лаўкі, па дарозе паставілі ўказальнікі «На сьвята». Фэст пачаўся супольнай малітвай каля крыжа, адноўленага ў 2002 г. Францам і Паўлам Вышадкамі. Пастаўлены ён быў на тым самым месцы, дзе 85 гадоў таму іх дзед Каэтан Вышадка паставіў крыж і пасадзіў абапал яго два дрэвы. **Старонка 7.**

ПАКАЛЕНЬНЕ NEXT

Палітык, які ловіць рыбу рукамі

26-гадовы Юрась Губарэвіч — адзін зь нямногіх палітыкаў, які мае адпаведную адукацыю — ён скончыў магістратуру па спэцыяльнасьці «дзяржаўнае кіраваньне». Юрась — дэпутат Белаазерскага гарадзкога Савету. «Сытуацыю ў краіне трэба мяняць», — мяркуе ён. **Старонка 6.**

РЭКЛЯМА

Тэрмінова прадаецца

працоўны самаходны кормазавод:

млын-зернедрабілка-міксэр для вытворчасьці камбікармоў на шасі а/м. МАН 12192, 1993 г.в., прабег 310 тыс. км.;
агрэгат DAVEKE-GEHL MIX-ALL 170, малатковы млын і зернедрабілка — магутнасьць 5-6 т/гадз., міксэр корму, аб'ём 2,5 т, бак кармавога масла 500 л (ёсьць магчымасьць упрыскваньня), вагі-дазатар і самапагрузка кормадабавак.

Пагрузка і разгрузка кармоў — вінтавым альбо пнэўматычным чынам, шнэк да 5 м вышынёй, шлангі 30 м. Матор агрэгата DEUTZ BF619130C, 131 кВт, 17000 мотагадзін, тэхагляд прайшоў у 2004 г. Кошт 32000 Эўра (дамоўны).

Месца: г.Шаўляй, Літва. Тэлефоны (370) 68779702, (370) 41598091. Кестуціс Макунас E-mail: ruvera@siauliai.omnitel.net

Выключаныя з унівэрсытэту за патрабаваньне спыніць русіфікацыю

Студэнтаў філфаку Яўгена Скрабутана і **Алеся Курсевіча** 2 ліпеня выключылі з Гарадзенскага ўнівэрсытэту. На сьцяне навучальнага корпусу і асфальце юнакі напісалі словы «**Зубр**» і «**Спыніць русіфікацыю!**», за што былі затрыманыя міліцыянтамі. Цікава, што затрымліваў іх былы студэнт беларускага філфаку таго ж унівэрсытэту, які пайшоў служыць у міліцыю.

Выключэньне адбылося на прапанову нарады дэканаў і прарэктараў з ініцыятывы прарэктара па выхаваўчай рабоце **спн.Бадзюковай** пасьля ліста кіраўніка гарадзенскай міліцыі **генэрала Белашэўскага**. Выгнаць праз непасьпяховасьць было няможна: яны вучацца добра.

Дэкана філфаку **сп.Церлюкевіча** пад пагрозай звальненьня змусілі падаць у рэктарат «прадстаўленьне» на выключэньне студэнтаў. Тым ня менш, як стала вядома «НН», у гэтай заяве дэкан прасіў «не ламаць маладыя лёсы» і даць давучыцца, згадваў, што з студэнтамі правялі тлумачальную працу і прымусілі бясплатна адпрацаваць на карысьць унівэрсытэту. Выкладчыкі філфаку называюць выключэньне «непрыемнай неспадзяванкай». «НН» будзе сачыць за справай.

Аркадзь Шанскі

Поўная хроніка рэпрэсій і супраціву — **старонка 10.**

«Беларусь увойдзе ў Эўразьвяз»

Не выключае Аляксандар Лукашэнка

«Прыйдзе час, і палітычныя адносіны між Беларусяй і ЭЗ будуць прыўкраснымі, як зь дзяржавамі Усходу, з Расеяй. Гэты час не за гарамі», — заявіў кіраўнік Беларусі, прымаючы 6 ліпеня даверчыя лісты пасла Аўстрыі ў Расеі й Беларусі (па сплучэньні) Мартына Вукавіча. «У нас ёсьць уласныя інтарэсы, свае адметнасьці. Мы трохі адрозныя ад ЭЗ. Але мы ня члены ЭЗ. Можа быць, праз гэта і адрозныя. Як толькі мы знойдзем кампраміс, як толькі нашы інтарэсы супадуць — упэўнены, што, можа быць, і Беларусь стане членам Эўразьвязу», — падкрэсьліў Аляксандар Лукашэнка.

Гэтая ў сваім родзе гістарычная заява — упершыню кіраўнік дзяржавы вызнаў магчымасьць далучэньня Беларусі да ЭЗ — была падпісаваная недыпляматычным выпадам. «Тое, што асобным членам ЭЗ нешта не падабаецца ў Беларусі, — прабачце, нам таксама многае недаспадобы ў пэўных дзяржавах Эўразьвязу. Але мы ставімся да гэтага цярпіма».

Апошняе гучала б натуральна, калі б Эўразьвяз быў зацікаўлены ва ўступленьні Беларусі, а не наадварот. Між тым Беларусь не ўваходзіць у лік эўрапейскіх палітычных прыярытэтаў, і краіне прыйдзецца зрабіць нямала высілкаў, каб прычапіцца да эўрацягніка. Пакуль галоўная ўмова паляпшэньня адносінаў, якую ставіць Брусэль, — правядзеньне ў Беларусі свабодных выбараў.

А ўсё ж пасол Аўстрыі заверыў у адказ, што Вена гатовая падтрымаць крокі Менску, скіраваныя на разьвіцьцё ўзаемінаў між Эўразьвязам і Беларусяй.

Трэба адзначыць, што Беларусь мае асаблівыя стасункі з альпійскай рэспублікай. Аўстрыйскі «Райфайзэнбанк» кантралюе найбольшы беларускі прыватны банк «Прыёрбанк». Аўстрыя таксама адна зь дзьвюх краінаў ЭЗ, якія Лукашэнка наведаў за апошнія восем гадоў, праўда, з прыватным візытам — ён там катаўся на горных лыжах.

Кіраўнік Беларусі апошнім часам шмат выступае й робіць шмат гучных заяваў. Такая актыўнасьць вымушае ўзгадаць, што 17 ліпеня сканчаецца тэрмін, да якога мусіць быць прызначаны канстытуцыйны рэфэрэндум, каб ён мог адбыцца адначасова з выбарамі ў парлямэнт.

Мікола Бугай

PHOTO: BYMEDIA.NET

Пасьля параду

Кампазыцыя «Атлеты пад калёнамі» з параду 3 ліпеня быццам бы скрадзеная зь фільму «Алімпія» Лені Рыфеншталь. Які сэнс быў закладзены ў сцэнаграфію гэтага палітычна-вайсковага шоў? Камэнтар кінакрытыка Андрэя Расінскага.

На парадзе 3 ліпеня не было новых вынаходак. Улада як відовішча ўлады — для аднаго чалавека і аднаго актора. Калі вэтэраны ехалі на машынах, яны махалі рукой галоўнаму гледачу: відовішча пабудавана так, быццам гэта яны абавязаныя яму жыцьцём, а ня ён — ім.

Праехалі танкі, праляцелі самалёты — у краінах з імпэрскай ці таталітарнай традыцыяй вайсковы парад натуральны: Францыя, Расея, Паўночная Карэя. Прайшла сельскагаспадарчая тэхніка — некаторых вайскоўцаў падобнае суседства абурае, але што ў нас не ваюе? Трактар — гэта перадавая зброя бітвы за ўраджай. Як перадавой зброяй у барацьбе за эканамічную легітымацыю зьяўляюцца лядоўні «Атлянт» і тэлевізары «Гарызонт».

Абавязковыя збраяносцы — спартоўцы, якія паказалі кампазыцыю «Атлеты пад калёнамі». Гэтая сцэнка быццам скрадзеная зь фільму «Алімпія» Лені Рыфэншталь. Суворыя рэжымы заўжды любілі грэцкую клясыку.

Заклікі змагацца за мір у прамове 2 ліпеня гучалі рэзка і агрэсіўна, была ў гэтым нейкая інтрыга, раздражнёная недамоўленасьць, імпэт.

Кадры заўжды гавораць больш за словы. У свой час Міхаіл Ром зьдзекаваўся з нацысцкай хронікі: у кадрах з фашыстоўскім кіраўніцтвам аніводнага штацкага. У нашых кадрах штацкі быў. Безмундзірны прэм'ер прытуляўся да мяжы кадру — а ўсё астатняе з фуражкамі і ў мундзірах.

І ўсё ж такі гэтая непрагаворанасьць, недамоўленасьць… Галоўная інтрыга не прагучала. Навошта такі вайсковы шык, супраць каго такі бразгат? Сёлетні парад — ідэальны час для абвяшчэньня пра чарговае ўсенароднаабраньне. Абвяшчэньне не прагучала. Інтрыга застаецца: бразгат зброі ўсё яшчэ стаіць у вушах.

Андрэй Расінскі

Лукашэнка — іхны Бог

У Маладэчне на платах масава зьявіліся надпісы «Слава Лукашэнку», «Ура Лукашэнку», «Лукашэнка — розум, гонар і сумленьне нашай эпохі» і нават «Лукашэнка — наш Бог». Па-расейску, вядома.

ІЛ

ФЭЛЬЕТОН

Пад фанфары

Пераклад з расейскай. Чытаецца бадзёра, урачыста

Працягваем трансьляцыю з параду, прысьвечанага n-годзьдзю з дня вызваленьня Беларусі ад разгулу нацыяналістаў і анархіі беспарадку. Толькі што па залітым сонцам праспэкце адгрукатала грозная вайсковая тэхніка, стройнымі шыхтамі прайшлі прадстаўнікі ўсіх родаў войскаў, паветра яшчэ трымціць пасьля віражоў нашых трох крылатых баявых машынаў. Сьледам на парад выходзяць тыя, хто сымбалізуе вайсковую славу часоў мінулых, на каго раўняюцца сёньняшнія байцы: дружыньнікі Ўладзімера Чырвонае Сонейка, стральцы Івана Жахлівага, суворыя чудабагатыры... Замыкаюць шэсьце партызаны-вызваліцелі на насарогах з заапарку, якія гоняць калёну палонных немцаў.

Працяг на старонцы 16.

ТБМ падключыла «Microsoft»

Працоўны юбілей мовааборонцаў

15-я ўгодкі першага зьезду Таварыства беларускай мовы прайшлі сьціпла, у працоўнай абстаноўцы. 27 чэрвеня на сядзібе ТБМ адбылося ўрачыстае паседжаньне Рады. Старшыня арганізацыі Алег Трусаў, нібы падкрэсьліваючы працоўны настрой, паўзьверх шэра-зялёнай кашулі павязаў гальштук такога ж колеру (толькі крыху сьвятлейшага адценьня).

Падводзячы вынікі 15-гадовай працы, актывісты ТБМ не забыліся й на пэрспэктывы. Сяргей Кручкоў, намесьнік старшыні, адзначыў, што выхад праграмы праверкі артаграфіі «Літара 1.0», ініцыяваны ТБМ, стаў штуршком для кампаніі «Microsoft». Цяпер фірма Біла Гейтса паабяцала ўвесьці беларускую ў стандартны набор моваў, якія падтрымліваюцца ў тэкставай праграме «Word». А гэта значыць, што беларускамоўныя карыстальнікі праграмы змогуць ня проста працаваць з тэкстамі, але ўжываць пры гэтым беларускія каманды. «Раней яны казалі, што гэта немэтазгодна, але цяпер згадзіліся з намі. Беларуская мова ўвойдзе ў стандартны набор, куды кампанія ўключыла каля 30 моваў сьвету», — адзначыў С.Кручкоў.

Віншавалі тэбээмаўцаў са сьвятам прадстаўнікі Таварыства беларускай школы. Старшыня Алесь Лозка выказаў спадзеў, што ягоная арганізацыя актывізуе сваю дзейнасьць, бо ТБШ хутка мае атрымаць ад гарадзкіх уладаў памяшканьне на вул.Лермантава. Кіраўнік Беларускага ліцэю Ўладзімер Колас, гаворачы пра посьпехі ліцэістаў, зазначыў, што рэнамэ Ліцэю павышаецца. Аддаць сваіх дзяцей у гэтую навучальную ўстанову хочуць нават некаторыя дэпутаты палаты прадстаўнікоў.

Каб расьцягнуць задавальненьне, кіраўніцтва ТБМ вырашыла адзначаць 15-годзьдзе арганізацыі цягам некалькіх месяцаў — ад канца чэрвеня (дата першага зьезду) да канца верасьня (дата афіцыйнай рэгістрацыі). Пры канцы верасьня (арыентоўна 28-га) тэбээмаўцы маюць правесьці вечарыну бардаўскай песьні, якая й завершыць сьвяткаваньні. Надалей, як кажа А.Трусаў, гэткія вечарыны маюць стаць традыцыйнымі й будуць адзначацца як Дзень беларускай бардаўскай песьні.

Адам Воршыч

НАВІНЫ

Арышт дырэктара Філярмоніі

У Магілёве зачыняецца абласная Філярмонія. Арыштаваны яе дырэктар Уладзімер Браілоўскі. Ён утрымліваецца ў сьледчым ізалятары ў Менску. Яму інкрымінуецца крадзеж і прысваеньне грошай. Дасьледуецца дзейнасьць Філярмоніі пры правядзеньні канцэртаў вядомых выканаўцаў. Падазраюць, што У.Браілоўскі заключаў дамовы зь фіктыўнымі суб'ектамі гаспадараньня.

Напад на Антончыка

7 ліпеня каля 8-й ранку невядомыя напалі на прафсаюзнага дзеяча Сяргея Антончыка. Яны спрабавалі запіхнуць яго ў машыну, але ён вырваўся і ўцёк на прыпынак. Нападнікі зьехалі на «жыгулях» 9-й мадэлі (дзяржнумар 2138 МІ). Міліцыю выклікаў вартаўнік аўтастаянкі. С.Антончык лічыць прычынай свой удзел у стварэньні інфармацыйнай сеткі «Айчына».

«НарВолі» абмяжоўваюць волю

«Гнюснасьцю» назваў рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч рашэньне апэляцыйнай рады пры Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасьці, што таварны знак «Народная воля» справядліва зарэгістраваў вытворца бялізны «Сэрж» Сяргей Атрошчанка. Юрысты не выключаюць, што блізкі да ўладаў бізнэсовец паставіць пытаньне аб спыненьні выхаду найбольшага апазыцыйнага выданьня.

Джоны

Джон Эдвардз, сэнатар з Паўночнай Караліны, стаў кандыдатам Джона Керы на пасаду віцэ-прэзыдэнта. Харызматычны малады дэмакрат быў абраны пасьля таго, як папулярны сэнатар-рэспубліканец Джон Маккейн адхіліў прапанову Керы стварыць дзьвюхпартыйны тандэм.

МБ; БелаПАН

Балтыка дачакалася

Пераможцам конкурсу для падпісчыкаў стаў Патапенка Ігар зь Менску, які атрымае ўзнагароду — паездку на адпачынак на Балтыйскае мора. Віншуем! На фота — цырымонія лятарэі. Лёсы вырашае навучэнка Коласаўскага Ліцэю Каця Савіцкая.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Дзьве сотні чалавек выйшлі на Кастрычніцкую плошчу 7 ліпеня, каб «Ланцугом неабыякавых людзей» узгадаць пра журналіста Зьмітра Завадзкага, які зьнік бяз знаку чатыры гады таму.

IN MEMORIAM

Мы разьвіталіся з генэрал-лейтэнантам

Яўгенам Бачаровым

Нечаканая злая хвароба вырвала з жыцьця чалавека, якім незалежная Беларусь магла ганарыцца. Яўген Бачароў — баявы генэрал, які спазнаў рэальную вайну. Тым больш пераканана й сьвядома ён падтрымаў беларускую незалежную дзяржаўнасьць і стаў ля пачатку нашых Памежных войскаў.

Няўмольная сьмерць забірае ад нас лепшых. Шчыра спачуваю родным і блізкім Яўгена Міхайлавіча. Пухам яму беларуская зямля.

Вінцук Вячорка

Мы смуткуем з нагоды сьмерці

Надзеі Батурыцкай

нашай сяброўкі і аднадумкі.

Сем'і Рагойшаў, Рыжыкавых, Шупенькаў, Акаловічаў

Фэст 500-годзьдзя

МІКОЛА НОВІКАЎ

Працяг са старонкі 1.

Дзіўна, але на кірмашы найбольш прыкметнымі былі праваслаўныя шапікі, дзе ішоў гандаль і збор сродкаў на храмы ды праваслаўную адукацыю. Затое на набажэнствах праваслаўная царква прыкметная не была.

Сьвяткаваць па традыцыі пачалі 1 ліпеня. У сьвяточнай імшы ўзялі ўдзел, акрамя кардынала Сьвёнтка, больш за 100 сьвятароў з усёй Беларусі, у тым ліку ўніяты. Прысутнічалі прадстаўнікі мясцовых уладаў, але не было нікога з уладаў нацыянальных, нават кіраўніка камітэту па рэлігіях і нацыянальнасьцях. Ксёндз, што вёў імшу, заклікаў каталікоў і праваслаўных жыць як браты, як касьцёл і царква, што стаяць у кожным мястэчку разам і глядзяць адно на аднаго як брат і сястра. Але вучэньне Лютара назваў ерасьсю, у спыненьні распаўсюду якой значную ролю адыграў Будслаў. Карані тэрарызму, алькагалізму, наркаманіі вывеў з атэізму. Маліліся за Беларусь, касьцёл і ўлады Беларусі.

Як звычайна на Будслаўскі фэст, усё набажэнства йшоў дождж, але перашкодзіць ён ня мог. Толькі шэрагі сьвятароў у белым з золатам адзеньні былі падкрэсьленыя чорнымі парасонамі. Бусла, які праляцеў над касьцёлам падчас імшы, усе ўспрынялі як добры знак.

Пры такой колькасьці людзей не было штурханіны і вялікага сьмецьця. Зусім не было п'яных, хаця працавалі кавярні на ўсю моц. Чыгунка таксама павіншавала каталікоў, пусьціўшы дадатковы дызэль, зручны для пілігрымаў. А вясковая бабка, якая пры пасадцы ў дызэль абавязкова хацела «вагон з кабінэтам», выклікала дадатковыя добрыя ўсьмешкі на тварах.

Ігар Ласіца

МІКОЛА НОВІКАЎ

Змаганьне зь бел-чырвона-белым

У адрозьненьне ад мінулых гадоў, сёлета ў Будславе міліцыя мела загад распраўляцца з нацыянальнай сымболікай

Аўтару ўдалося зрабіць здымак маёра (справа), што рваў сьцяг.

Сёлета пакланіцца Маці Божай у цудадзейным абразе вырашыў і я зь сябрамі. Выйсьці з Глыбокага 30 чэрвеня нам не ўдалося, мы выйшлі ў дарогу раніцай 1 ліпеня і да дзесяці гадзін змаглі дагнаць глыбоцкую пілігрымку ў Параф'янаве Докшыцкага раёну. З сабою мы ўзялі бела-чырвона-белы сьцяг, які сымбалізуе кроў Хрыста на плашчаніцы.

Каля касьцёлу ў Параф'янаве адпачывалі некалькі пілігрымак — з Глыбокага, Полацку, Шаркаўшчыны. Моладзь радасна вітала наш сьцяг, масава прасілі сфатаграфавацца пры ім. З Параф'янава мы пайшлі разам з глыбоцкай пілігрымкай. Але праз два кілямэтры адной пэнсіянэрцы, якая ішла ў пілігрымцы, не спадабаўся сьцяг, і яна запатрабавала ад ксяндза, каб той прагнаў нас з калёны. Нас папрасілі згарнуць сьцяг, на што мы не пагадзіліся і засталіся чакаць пілігрымку з Полацку. Зь ёй мы прайшлі яшчэ пяць кілямэтраў.

У полацкай пілігрымцы знайшліся маладзёны, якім таксама не спадабалася, што мы ідзём са сьцягам. Таму нейкіх пяць кілямэтраў, што заставаліся да Ілава, мы прайшлі самі ўтрох. Варта адзначыць, што людзі ў вёсках нас сустракалі вельмі прыязна.

Прыйшоўшы ў Ілава, мы сталі чакаць астатніх пілігрымаў, бо ў Ілаўскім парку зьбіраліся ўсе пілігрымы зь Віцебскай дыяцэзіі. Да Будслава заставалася сем кілямэтраў, ісьці туды гэтым разам мы вырашылі зь мёрскай пілігрымкай. Яна ішла апошняй. Усю калёну здымала БТ. Перад намі апэратар БТ апусьціў камэру. Хутчэй за ўсё, нехта з БТ і падказаў міліцыянтам, што ў калёне ёсьць чалавек з нацыянальным сьцягам.

Да Будслава заставалася кілямэтра паўтара, у нас ужо быў прыўзьняты сьвяточны настрой, але яго сапсавалі міліцыянты. Нас сустрэлі аж дзьве міліцэйскія машыны. Зь першай зь іх, нумар 10-01 МО, выскачылі маёр з капітанам і, не адрэкамэндаваўшыся, з грубай лаянкай выцягнулі майго сябра з калёны. Сьцяг адразу быў парваны. Потым схапілі і мяне, у мяне на шыі была белая хусьцінка з чырвонай паласой. Яна таксама была парваная. З нас пазрывалі бел-чырвона-белыя значкі, прычым у сябра яго вырвалі з кашулі «зь мясам». Калі б на нас было яшчэ адзеньне ў нацыянальных колерах, яго б таксама, напэўна, падралі. Усё гэта суправаджалася страшэнным расейскім матам. Міліцыянты не пасаромеліся нават сьвятара, які ішоў побач з намі. Прашманаўшы нашы сумкі, нас адпусьцілі. Паводзілі сябе міліцыянты як бандыты. І калі ў нас такая міліцыя, то такая і ўлада.

Як нам стала вядома, у Будславе 1 ліпеня міліцыянты таксама адбіралі ў «зуброўцаў», якія прыйшлі зь пілігрымкай, бел-чырвона-белыя сьцягі й сьцягі арганізацыі, а Міхася Кандрашова затрымалі за бел-чырвона-белую павязку на галаве.

У мінулыя гады ніхто зь міліцыі ня меў ніякіх прэтэнзій да сымболікі. А сёлета нехта ўбачыў кадры з Будслава па тэлевізіі і загадаў навесьці «парадак» з сымболікай. Так міліцыянты сапсавалі нам сьвяточны настрой, хаця само сьвята было вельмі цудоўным.

Зьміцер Лупач, Глыбокае—Будслаў

«За апошнія гады — чатыры цуды Маці Божае Будслаўскае»

Сёлетні фэст у Будславе супаў з 500-годзьдзем мястэчка. У 1504 г. вялікі князь літоўскі й кароль польскі Аляксандар Ягелёнчык падараваў манахам-францішканам 600 моргаў лесу. З таго часу пайшла гісторыя касьцёлу і мястэчка. У 1588 г. тут адбыўся цуд зьяўленьня Маці Божай, а ў 1613 г. касьцёлу быў падараваны абраз Божай Маці, які аказаўся цудатворным. З 1990-х Будслаўскі касьцёл ізноў стаў цэнтрам фэстаў. Пра Будслаў і значэньне пілігрымак у сьвятыя мясьціны карэспандэнту «НН» распавядае пробашч менскага Чырвонага касьцёлу Сьвятых Сымона і Алены Ўладзіслаў Завальнюк.

Уладзіслаў Завальнюк: Ужо ў часы Вялікага Княства Літоўскага людзі ў Будслаў ішлі ня толькі з бліжэйшай акругі (можна згадаць хаця б Латвію). Пілігрымкі маюць вялікую духоўную значнасьць: сам рух вернікаў у кляштар ці да манахаў-пустэльнікаў можна параўнаць з рухам крыві ў арганізьме чалавека. Гэта працэс абнаўленьня, працэс жыцьця! Людзі бачаць новыя мясьціны свайго краю, знаёмяцца зь іншымі людзьмі. Гэта людзі, занятыя добрымі думкамі 3—5 дзён. У Польшчы пілігрымкі да Чанстаховы доўжацца 27 дзён: чалавек бярэ адпачынак і ідзе пехатою з Гданьску ў Чанстахову. І што цікава, тыя, хто адзін-другі раз пайшоў у пілігрымку, заўсёды жадаюць ісьці яшчэ. Гэта паказвае, што дзейнічае нейкі вышэйшы дух.

Каб у нас абудзіць дух у людзей, трэба заклікаць, каб яны ішлі пілігрымамі — ці ў Будслаў, ці ў Жыровічы (за Слонімам), ці ў Тракелі (за Лідай), ці ў Гудагай, ці ў Лагішын (пад Пінскам).

«НН»: Ці стане Будслаў для Беларусі тым, чым для палякаў ёсьць Чанстахова?

У.З.: Першыя афіцыйныя звароты ў дзяржаўныя структуры, каб далі 2 ліпеня дзяржаўны выхадны дзень, былі ў 1991 г. Тады якраз у парлямэнце вызначаліся сьвяты: прызначылі Божае Нараджэньне, Вялікдзень (другі дзень), Дзяды і Дзень маці Божае Будслаўскай. Гэта ўсё было афіцыйна!

Цяпер мы толькі разгортваем працу. 10—12 год — гэта толькі першыя парасткі. Сёлета ўпершыню ня толькі ў Эўропе, а можа, і ў сьвеце мы распачалі традыцыю пілігрымкі на роварах. Ад нашага касьцёлу 29 чалавек ехалі пілігрымамі 4 дні. Вельмі многіх гэта інтрыгуе, людзі цікавяцца. На наступны год будзе ўжо хмара!

«НН»: Вядомы цуды, якія адбываліся ў Будславе раней. А цяпер ці бываюць яны?

У.З.: За апошнія гады ўжо чатыры выпадкі дапамогі Маці Божае. Адно здарэньне — у Глыбокім: малады чалавек трапіў у аўтааварыю, восем дзён ляжаў у Полацку без аніякай надзеі. Лекары сказалі маці: «Усё, забірайце». Яна зьвярнулася да Маці Божай — і адбыўся цуд: сёньня гэты чалавек скончыў унівэрсытэт, працуе і ўдзячны Маці Божай. Падрабязьней пра ўсе гэтыя выпадкі я б хацеў падрыхтаваць анал.

Мы не зьбіраемся на пустым месцы «разьдзьмухваць» славу гэтай сьвятыні — Маці Божая сказала: «Сам Сын уславіць». Па-першае, туды трэба вельмі многа ўкласьці матэрыяльных сродкаў. Што казаць, калі там няма нават элемэнтарных навесаў над плошчай, дзе людзі маглі б схавацца ад дажджу. Сёлета, напрыклад, усе прамоклі да ніткі.

Па-другое, Будслаў не павінен быць цэнтрам толькі раз на год — нон-стоп круглы год! Хто пажадаў бы наведаць Маці Божую — сеў на аўтобус і паехаў. Значыць, трэба арганізаваць невялікі гатэль, сталоўку (можа, ня самай высокай якасьці, але з даступнымі цэнамі). Трэба, каб чалавек мог нешта купіць на памяць — кнігі, фотаальбомы, буклеты пра гэтую мясьціну.

«НН»: Ці шмат людзей было сёлета на фэсьце?

У.З.: На набажэнстве тысяч 10—15 стаялі на плошчы, але далей — мора людзей. Яны былі на набажэнстве ў 7 ці 10 гадзінаў і на 13 ужо не пайшлі. Увесь час яны зьмяняліся.

«НН»: Чым ёсьць Будслаўская сьвятыня для Беларусі?

У.З.: Для Беларусі вялікая ласка, што Будслаўскі касьцёл у 1994 г. атрымаў ад Апостальскай сталіцы статус Меншай Базылікі (Basilica Minoris), а ў 1998 г. адбылася каранацыя цудатворнага абраза папскімі каронамі. Базылік ва ўсім сьвеце — некалькі дзясяткаў, а кароны папскія азначаюць велічную годнасьць і хвалу ня толькі Будслава, але ўсёй Беларусі.

Будслаў славуты яшчэ й тым, што там заўжды зьбіраліся і каталікі, і праваслаўныя, і ўніяты. Людзі прыходзяць да сваёй Маці!

«НН»: А на сёлетнім фэсьце неяк адзначалася 500-годзьдзе самога Будслава?

У.З.: На жаль, не было ні навуковай канфэрэнцыі, ні «круглага стала», ні літаратурнай вечарыны, хаця патрэбна было б. Але яшчэ ня позна — увесь год лічыцца юбілейным.

«НН»: Апрача Беларусі, адкуль прыбываюць пілігрымы ў Будслаў?

У.З.: З Масквы і Пецярбургу заўжды прыяжджаюць па 100—200 чалавек (амаль па 2 вагоны). Латвія, Літва — таксама, ужо ня кажучы пра Польшчу. З Украіны прыяжджаюць. З пасольстваў прыяжджаюць — польская, францускага, нямецкага. Пазамінулым годам былі студэнты з Афрыкі. У Гомелі працуюць сёстры маці Тэрэзы з Калькуты (Індыя) — яны таксама прыяжджалі.

Гутарыў Адам Воршыч

Прыватны сэктар абараняецца

У Менску ствараецца Саюз домаўладальнікаў. Асноўная мэта новай грамадзкай арганізацыі — абарона правоў жыхароў прыватнага сэктару сталіцы, якім пагражае знос дамоў. Паводле генпляну разьвіцьця Менску, у горадзе мае быць зьнесены амаль увесь прыватны сэктар — каля 5 тыс. дамоў. Найперш пад знос пойдуць Грушаўка, Пятроўшчына, Сельгаспасёлак, забудова ў раёнах вуліц Маякоўскага, Авакяна, Жукоўскага, Арлоўскай ды інш. — іх маюць прыбраць да 2015 г. «Зачыстка» рэшты прыватнага сэктару расьцягнецца да 2030 г. Карэспандэнт «НН» гутарыць з адным з арганізатараў новага Саюзу Канстанцінам Міронавым.

Канстанцін Міронаў: Пад кожнай хатай ёсьць 7 сотак зямлі. Забудоўшчыку Менгарвыканкам прадае іх за 8—10 тыс. даляраў за сотку. А нам хоча заплаціць па 80 тыс. рублёў.

К.М.: Гэта тое, з чаго пасьля вайны (калі не лічыць «сталінак») пачынаўся Менск. Гэтыя землі даваліся для будаўніцтва ў 50-я — 60-я гады. Тым людзям, якія на той момант былі больш багатымі, больш прадпрымальнымі, казалі: «Будуйцеся! Дзяржава ня можа вырашыць вашых жыльлёвых праблем, таму вырашайце іх самі». Зямля выдзялялася дзяржавай, пастановай Менгарвыканкаму. Гэта ня быў самабуд, ва ўсіх ёсьць дакумэнты. Але як толькі далі зямлю, літаральна з 1965 г., сталі абмяжоўваць людзей у магчымасьці будавацца: ад падмурку да вільчака не вышэй за 3,2 м, мансарду ставіць нельга, прыбіральню перанесьці ў дом нельга…

Будавацца было нельга, бо гэта забаранялася. А цяпер гэтым дакараюць: «Стаіць вёска ў горадзе. Мы вас ашчасьлівім тым, што адселім адтуль».

У 1991 г. усе забароны на будаўніцтва былі зьнятыя: у дзяржавы скончыліся грошы. Можна было пайсьці узяць дазвол і пачаць будаўніцтва. Пасёлкі пачалі відазьмяняцца, пачалі зьяўляцца катэджы. Думалі, што гэта будзе працягвацца, што гэтая частка гораду будзе паступова набываць выгляд, адпаведны сучаснаму гораду. Яшчэ б гадоў 15—20…

У людзей акты на пажыцьцёвае спадчыннае валоданьне зямлёй. Некаторыя прыватызавалі свае ўчасткі. Але ёсьць такі панятак, як «забіраньне ўчастку для дзяржаўных патрэбаў». Паводле нашых законаў, нават прыватызаваную зямлю можна забіраць з гэтым абгрунтаваньнем. А сам панятак не раскрываецца: дзяржава захацела — і ўсё! Для якіх жа дзяржаўных, калі гэта аддаюць забудоўшчыку?

«НН»: Але ці можа сталіца абысьціся без мадэрнізацыі?

К.М.: Ёсьць у нас пляны таго, што тут зьбіраюцца ставіць. Напрыклад, у 1-м Ізмайлаўскім завулку, дзе ў зону зносу трапілі некалькі добрых дамоў, зьбіраюцца ставіць катэджны пасёлак. Людзі абураюцца: «Як так? Дайце нам крэдыты й дазвол, мы будзем самі будаваць».

У некаторых раёнах пакінуты некранутымі кавалачкі тэрыторыі. Зносіцца ўвесь раён, акрамя аднаго кавалачка ўсярэдзіне. У камітэце архітэктуры кажуць: «Ён упісваецца ў сучасную забудову». Глядзіш гэтую тэрыторыю — там стаіць пара дамоў сярэдняй якасьці й некалькі развалюх. Пачынаеш пытацца ў мясцовых жыхароў, хто жыве ў тым раёне, — кажуць: «Сем'і чыноўнікаў з камітэту архітэктуры». Складаецца ўражаньне, што гэтыя ўчасткі пакінулі некранутымі, зыходзячы зь нечых асабістых інтарэсаў.

«НН»: Ці многа тых, хто хацеў бы застацца жыць у прыватным доме?

К.М.: Адсоткаў 80 тых, хто жыве ў гэтых раёнах, выступаюць за тое, каб іх пакінулі там жыць. Мы самі будзем кіраваць сваёй уласнасьцю, калі ня зможам пабудавацца — прадамо. Калі дзяржава хоча дапамагчы, хай выдасьць крэдыты, а не — то й самі абыдземся. У нас Канстытуцыя гарантуе розныя віды ўласнасьці.

Адсоткаў 20 кажуць: «Хутчэй бы ўжо зьнеслі, надакучыла так жыць». Вядома, надакучыла — людзі па 30 гадоў ня могуць жыць нармальна, ім забараняюць упарадкаваць сваё жытло: маўляў, вас хутка будуць зносіць. І цяпер людзі задумваюцца: ці трэба перакрываць страху на хаце, калі хутка будуць зносіць?

«НН»: А чаму вы ня хочаце перабірацца ў кватэры? Ці, у адпаведнасьці з Жыльлёвым кодэксам, атрымліваць грашовую кампэнсацыю?

К.М.: Няма ясных мэханізмаў кампэнсацыі. Нават калі я пагаджуся, каб мой дом зьнесьлі, па якой цане мне будуць яго кампэнсаваць? Зямля нагул ня ўлічваецца, бо яна без забудовы не прадаецца.

Уладальніку, у якога забіраюць участак, закон гарантуе атрыманьне жытла «ў межах гэтага населенага пункту». Значыць, мне заміж майго дому ў цэнтры гораду могуць прапанаваць Шабаны, Серабранку — гэта нераўнацэнны абмен! Хто купіць за нармальную рынкавую цану дом, які знаходзіцца ў зоне зносу?

Пад кожнай хатай ёсьць 7 сотак зямлі. Забудоўшчыку Менгарвыканкам прадае іх за 8—10 тыс. даляраў за сотку. У нас ня хочуць купляць участкі па рынкавай цане, а інвэстарам прадаюць ужо па ёй. Менгарвыканкам выступае пасярэднікам паміж людзьмі й забудоўшчыкамі. Для нас удзел Менгарвыканкаму быў бы аптымальны не як пасярэдніка, а арганізацыі, якая б рэгулявала правядзеньне камунікацый, каналізацыйных калектараў і г.д.

«НН»: А кампэнсацыі за прыватызаваную зямлю?

К.М.: Плацілі мы па 80 тыс. руб. за прыватызацыю — столькі нам і вернуць. Гарвыканкам імкнецца скарыстаць вялізарныя прагалы ў заканадаўстве. У нас не прапісаны мэханізм кампэнсацыі за гэтую зямлю. У нас зямля ніколі не была абсалютнай уласнасьцю. Мы самі падпісваем паперы ў акце пра прыватызацыю: калі дзяржава будзе ў нас забіраць зямлю, то мы не пратэстуем. Гэтыя акты — фількава грамата. Яны толькі для таго, каб грошы заплацілі.

«НН»: Ці зьвярталіся вы да праваабарончых арганізацый?

К.М.: Праваабарончыя арганізацыі холадна паставіліся да гэтай тэмы. Многія зацыкліліся на агульнапалітычных пытаньнях. Яны ня хочуць працаваць з лукашэнкаўскім электаратам, а ў Сельгаспасёлку ён у вялікай ступені лукашэнкаўскі. Некаторыя проста кажуць: «Нам бы вашы праблемы: у нас кватэры няма, а вы баіцеся, што вам дадуць заміж вашых харомаў кватэру».

«НН»: А партыі?

К.М.: Мы сутыкнуліся зь нежаданьнем партыяў лезьці ў гэтыя справы. Усе ідуць на выбары пад агульнапалітычнымі лёзунгамі. Таму ўзьнікла ідэя Саюзу домаўладальнікаў (або Партыі дробных гаспадароў).

«НН»: Арганізацыя ствараецца пад канкрэтную задачу?

К.М.: Канкрэтную, але доўгачасовую. Настрой у нас баявы. Калі нам удасца дамагчыся адмены пастановы пра знос, гэта магло б даць стымул для далейшай кансалідацыі людзей на доўгатэрміновай аснове.

Гутарыў Аркадзь Шанскі

PHOTO BYMEDIA.NET

Забужане атрымаюць кампэнсацыі

«Польшча павінна выплаціць кампэнсацыі сваім грамадзянам, што ў выніку другой сусьветнай вайны былі вымушаныя пакінуць сваю маёмасьць на тэрыторыях былой Заходняй Беларусі і Украіны ды выехаць у Польшчу ў яе цяперашніх межах», — гэтак пастанавіў Эўрапейскі суд па правах чалавека ў Страсбургу.

У 1944—53 г. у рамках «рэпатрыяцыі» з Заходняй Беларусі і Украіны ў Польшчу выехалі каля 1 мільёна 240 тысячаў палякаў, сярод якіх было шмат і такіх, хто проста назваўся палякам, каб уцячы са сталінскага СССР.

Паводле дамоваў паміж ПНР і савецкімі Беларусяй, Украінай і Расеяй, гэтыя людзі, вымушаныя пакінуць сваю маёмасьць (у Польшчы іх завуць «забужане», бо перасяліліся з-за Бугу), мелі права на раўнавартасныя кампэнсацыі ад польскіх уладаў. Некаторыя зь іх атрымалі нерухомасьць у заходняй Польшчы, на былых нямецкіх тэрыторыях ці ў Гданьску. Добрая ж частка «забужанаў» дагэтуль ніякіх кампэнсацыяў не дачакалася, бо дзяржава папросту ня мела сродкаў, каб выплаціць ім адпаведныя грошы ці перадаць адпаведную нерухомасьць.

Сёлета спадар Ежы Бранеўскі з гораду Вялічка накіраваў пазоў у Эўрапейскі Суд у Страсбургу супраць польскай дзяржавы і запатрабаваў кампэнсацыю за дом, пакінуты ў Львове. Справа «Бранеўскі супраць Польшчы» скончылася паразай польскай дзяржавы.

Цяпер Польшча мае паўгоду, каб выплаціць сп.Бранеўскаму кампэнсацыю за нерухомасьць і 12 тысячаў эўра судовых выдаткаў.

Перамога Бранеўскага сталася сыгналам для іншых «забужанаў». Дзяржава можа чакаць каля 80 тысячаў падобных заяваў на суму нават 10 мільярдаў злотых, ці 2,5 мільярда даляраў, якіх польскі буджэт, натуральна, ня мае.

«Гэта добрая навіна. Мы пакінулі ў Заходняй Беларусі нямала маёмасьці і цяпер, калі аб'яднаем намаганьні ўсіх сваякоў, можа, назьбіраем на прыстойнае жытло для каго-небудзь з нашых маладых тут у Варшаве», — кажа Тэрэза Скірмунт, дачка Станіслава Скірмунта — брата прэм'ера БНР.

Польскія ўлады заяўляюць, што будуць шукаць «рэальны кампраміс з «забужанамі» што да памеру кампэнсацыяў. Галоўнае, аднак, як кажуць самі «забужане», гэта каб грамадзяне маглі ведаць, што дзяржава іх не падмане, але выканае свае абяцаньні хай сабе і праз паўстагодзьдзе.

Аляксей Дзікавіцкі, Варшава

Партызаны акупавалі Маскву

І ўцякалі з Гораду Сонца

Апошні месяц вызначыўся дзьвюма культурніцкімі акцыямі: на Маскоўскім кінафэстывалі партызаніла «Акупацыя» Андрэя Кудзіненкі, а мастак Артур Клінаў актыўна пашыраў ідэі партызанства ў менскіх прыгарадах. Абедзьве падзеі — пасьпяховае і актуальнае культур-партызанства.

АЛЯКСЕЙ СМОЛЬСКІ

Унізе з мэгафонам — Артур Клінаў, уверсе з тэлефонам — Піт Паўлаў. Побач бубнач «NRM» Алег Дземідовіч.

Беларускія партызаны ў Маскве

Маскоўскі паказ фільму «Акупацыя. Містэрыі» з самага пачатку суправаджаўся скандалам. Раздражнёнае Міністэрства культуры Беларусі накіравала дырэкцыі фэстывалю ліст, дзе выкрывалася «шкоднасьць карціны» й яе падрыўны характар. Падобны ўчынак менскіх чыноўнікаў толькі падагрэў цікавасьць публікі да беларускага фільму, і ніводная фэстывальная публікацыя не абыходзілася без узгадкі пра забарону карціны ў сябе на радзіме.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У Маскве Андрэя Кудзіненку, вялікага аматара швэдраў, прымусілі набыць гальштук.

Яшчэ Фэліні казаў, што «цэнзура — гэта рэкляма за дзяржаўны кошт», і лепшай рэклямнай кампаніі фільму «Акупацыя» і ўявіць сабе цяжка.

Рэжысэра Кудзіненку, прадусара Дэбалюка і актора Колбышава прэса ўпарта прасіла растлумачыць прычыны варожасьці родных чыноўнікаў да аўтэнтычнага беларускага фільму. Супрацоўніца беларускай амбасады, якая часам прытулялася да здымачнай групы, клялася й бажылася, што фільм ёй надзвычай падабаецца. У гэтым яна не арыгінальная: менскія забаронцы карціны таксама пускалі сьлязу й нат выказвалі спадзяваньне, што «Акупацыю» будуць паказваць у школах.

А на сайце пасольства Беларусі ў Маскве зьявіўся абураны ліст вэтэрана, які заклікаў Мікіту Міхалкова, кіраўніка фэсту, «у імя расейска-беларускага саюзу» выключыць «Акупацыю» з праграмы. «Праяўіце мужнасьць — у мірны час гэта ўсё ж такі лягчэй і прасьцей, чым на перадавой альбо ў партызанскіх схватках з ворагам!» — патрабаваў «генэрал-маёр у адстаўцы, удзельнік партызанскага руху ў Беларусі». Пільны генэрал праявіў надзвычайную абазнанасьць што да фэстывальных справаў і палітычнай сытуацыі ў Беларусі і, відаць, пэрыядычна зазірае на сайт беларускай амбасады, нягледзячы на свой «дзявяты дзясятак».

«Праўда-КПРФ» праявіла яшчэ большую дасьведчанасьць і ўжо загадзя называла фільм «заведама паклёпніцкім да кіраўніцтва рэспублікі». Дзе там яна гэтае кіраўніцтва вышукала, сказаць немагчыма, — ці то ў партрэце Марлен Дытрых, ці то пад курыную страхой.

«Фільм зьняты зь непадробнай жарсьцю і разам з тым даволі сучасна, з разуменьнем кіно як актуальнага фальклёру», — меркаваньне расейскага топ-крытыка Андрэя Плахава.

«Акупацыя», магчыма, часам і нагадае «Ўскраіну» Пятра Луцыка, але некалькі разоў за паўтары гадзіны экраннага часу ў фільме адбываюцца прарывы ў сфэру ўражвальнага, сапраўднага гуманізму», — пішуць сьціплыя на камплімэнты «Известия» і дадаюць, што «фільм быў злачынна абмежаваны ў сродках». Дарэчы, гэты артыкул да беларускіх чытачоў не дайшоў. «Известия» ў Беларусі выйшлі зусім зь іншымі матэрыяламі.

АЛЯКСЕЙ СМОЛЬСКІ

- «Праўда-КПРФ» назвала фільм «Акупацыя» «заведама паклёпніцкім да кіраўніцтва

Пра фільм «Акупацыя. Містэрыі» адразу гаварылі як пра фаварыта конкурсу «Пэрспэктывы», дзе на фэстывалі былі прэзэнтаваныя гульнёвыя дэбюты.

Кудзіненку прымусілі набыць гальштук на заключную вечаровую цырымонію, пасадзілі побач зь Дзьмітрыем Месхіевым, яўным пераможцам вялікага конкурсу, і патлумачылі, дзе і як выходзіць для ўзнагароджаньня.

Варта адзначыць, што фільм Месхіева «Свае» таксама закранае тэму акупацыі — і, як у фільме Андрэя Кудзіненкі, у гэтай конкурснай карціне мяжа паміж сваімі й чужымі размытая, а адносіны паміж людзьмі вельмі няпростыя.

І хаця ўрэшце журы Маскоўскага фэстывалю вырашыла не аддаваць усе прызы фільмам пра партызан і акупацыю, а ўзнагароду «Пэрспэктывы» атрымала паліткарэктнае японскае кіно «Гатэль «Вэнэра», беларускі партызанскі рэйд па расейскай тэрыторыі адбыўся. Ёсьць вялікая ўвага, розгалас, зацікаўленасьць. З 7 ліпеня фільм паказваюць на вялікім экране ў расейскім Кінацэнтры, а неўзабаве распачнецца выпуск карціны на відэакасэтах.

Не прыходзіцца сумнявацца, што фільм дойдзе да беларускага гледача, незалежна ад таго, жадае Міністэрства культуры далучацца да славы і прыбыткаў самага пасьпяховага беларускага кінапраекту ці не жадае. Кінапіраты і відэачаўнакі ў краіне не выводзіліся.

Фільм «Акупацыя» сапраўды партызанскі. І ня толькі таму, што ён на традыцыйную беларускую тэму. Карціна здымалася за грашы, за свае капейкі, на энтузіязьме — і паза межамі ўсялякіх Мастацкіх радаў і бюракратычных структураў. Гэта фільм, створаны «ў лесе» беларускай культуры, якая хаваецца й выжывае ў самых неспрыяльных умовах.

Культурніцкі выбух рыхтуецца незаўважна — і раптам, нечакана заяўляе пра сябе.

Партызаншчына не зьнікае.

Партызаны ў электрычцы

Калі фільм «Акупацыя» партызаніў на тэрыторыі суседняй дзяржавы, то Артур Клінаў вырашыў перанесьці мастацка-партызанскія ідэі ў беларускія масы.

У якасьці аб'екту захопу была выбраная электрычка «Менск—Маладэчна» .

15 чэрвеня разамлелыя пасажыры пятага вагона пачулі мэгафоннае запрашэньне на прэзэнтацыю трэцяга нумару часопісу «рАРТызан». Як высьветлілася, часопіс гэты прысьвечаны Гораду Сонца, увасобленай утопіі Тамаза Кампанэлы, — і так шчасьліва здарылася, што менавіта гэтым горадам зьяўляецца Менск.

Шакаваны дачнік прарваўся да мэгафона і абвясьціў, што «вы не валодаеце беларускай мовай, хаця я яе і ня ведаю», «што вы лухту верзяце» і «Менск быў збудаваны пасьля 45-га году».

Частка пасажыраў, якая схавалася за аркушыкамі бульварных газэтак, ажывілася, калі Піт Паўлаў распачаў беларускія песьні, а адзін дзядок нат паспрабаваў штосьці замовіць.

«Забаўна, файна, мне спадабалася», — казалі маладыя людзі, сьведкі нечаканай прэзэнтацыі. У некаторых гледачоў мову адняло.

Імпрэза, да якой маглі далучыцца ўсе, хто пажадае, прадоўжылася ў лесе, дзе ўвагу прыцягнула канцэптуальная мастацкая кампазыцыя «стол». На стале ў шахматным парадку стаялі беларускія чарнілы і ляжалі цыбуліны. Назвы чарнілаў — атракцыён: «Радзівілаўскае», «Услада», «Казанова», «Любава», «Ісьціна». («Ісьціна» скончылася першай.)

Пра Горад Сонца распавёў сам Клінаў і культуроляг Максім Жбанкоў, які ўзгадваў менскую сталінскую архітэктуру. Выступалі «Гарацкія», сьпявала Кася Камоцкая. А Ільля Сін, якому не дае спакою слава эгіпэцкіх мумій, наладзіў чарговы пэрформанс у зарасьніку, дзе яго ўрэшце, забінтаванага, закапалі.

«рАРТызан» забаронена выстаўляць у бібліятэках, школах — любых дзяржаўных установах, і таму часопіс пайшоў у народ, у лес.

І хаця «цягнікова-лясная» прэзэнтацыя часопісу не была такой гучнай, як фэст з «Акупацыяй», гэта таксама культурнае партызанства. Артур Клінаў кажа, што «партызанства» — гэта не альтэрнатыўная культура, гэта — актуальная культура. Афіцыйная культура для яго — нецікавая, бо не актуальная.

Сьвятлана Зелянкоўская ўзгадвае, што на Маскоўскім кінафэсьце ніхто яе й не спытаў пра «Настасьсю Слуцкую». «Слуцкую…» папросту ня ведаюць, гавораць пра «Акупацыю». Беларускае культур-партызанства выпрацоўвае якасныя мастацкія творы й эфэктыўна іх падае.

А што ўлада?

«Улады — гэта таксама партызаны. Толькі з суседняга партызанскага атраду», — кажа Андрэй Кудзіненка.

Андрэй Расінскі

Палітык, які ловіць рыбу рукамі

26-гадовы Юрась Губарэвіч — адзін зь нямногіх палітыкаў, які мае адпаведную адукацыю: ён скончыў магістратуру па спэцыяльнасьці «дзяржаўнае кіраваньне». Юрась — дэпутат Белаазерскага гарадзкога Савету.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ю.Губарэвіч вырашыў заняцца палітыкай пад уплывам фільму «Дзеці хлусьні», зь якога ён даведаўся, што ёсьць у краіне людзі, якія ўладзе супрацьстаяць.

Юрась Губарэвіч: Сытуацыю ў краіне трэба мяняць

«НН»: Юрась, у Беларусі шырока распаўсюджана меркаваньне, што мясцовыя саветы нічога не вырашаюць. Што ты як дэпутат гарсавету можаш сказаць?

ЮГ: Наша практыка паказвае, што варта спрабаваць нешта рабіць. Вада і камень точыць. Асабліва калі ты не самотны, а маеш паплечнікаў. Мы нядаўна дамагліся адмены ў раёне мясцовага збору за карыстаньне аб'ектамі добраўпарадкаваньня і інфраструктуры, які плацілі ўладальнікі аўтамабіляў, прычым ня толькі з нашага, але і двух суседніх — Івацэвіцкага і Пружанскага — раёнаў. Збор быў незаконны, таму што не было канкрэтызацыі, што зьяўляецца аб'ектам падаткаабкладаньня. Пасьля таго як мы пачалі яго абскарджваць ва ўсіх інстанцыях, вэртыкаль спусьціла разнарадку ў райсавет, і той сам адмяніў збор. Самае цікавае — абгрунтаваньне, зь якім яго адмянілі: маўляў, у раённым бюджэце знайшліся грошы, таму збор можна адмяніць. Дык гэта значыць, што калі разабрацца — і грошы ў бюджэце знаходзяцца, і ёсьць што красьці! Калі арыштоўваюць *высокапастаўленага бярозаўскага чыноўніка* — значыць, ёсьць што красьці! Цяпер мы з камандай зьбіраемся дамагчыся вяртаньня людзям гэтых грошай. А наступным пытаньнем мы хочам даведацца, куды ідуць грошы ад суботнікаў.

«НН»: А дзе гарантыя, што вы, прыйшоўшы да ўлады, ня будзеце красьці?

ЮГ: Усякая ахвота красьці адпадае, калі сыстэма празрыстая. Проста людзям трэба тлумачыць, куды ідуць грошы. Яны нават у большасьці выпадкаў гатовыя заплаціць грошы, калі ведаюць, што гэта пойдзе туды і туды. Як з гэтым зборам: 2% людзей, якія ведалі закон і былі ўпэўненыя ў сваёй правасе, проста адмаўляліся плаціць збор, і ДАІ не магло нічога зь імі зрабіць. Гэта паказвае, што калі чалавек адстойвае сваё права і ведае закон, у яго ніхто не адбярэ яго грошы. Людзі павінны кантраляваць уладу. І, натуральна, патрэбная выбарнасьць вышэйшых пасадаў. Мэр ці стараста гораду павінен быць пададказны людзям.

«НН»: Цяпер модна распрацоўваць стратэгіі разьвіцьця для паасобных рэгіёнаў. Ці ёсьць у вас стратэгія разьвіцьця Белаазерску і Бярозаўскага раёну?

ЮГ: Мы шукаем магчымасьці, каб зрабіць грунтоўную дасьледчыцкую працу над стратэгіяй. Гэтая стратэгія павінна ўключаць два моманты: прывабнасьць для жыхароў і прывабнасьць для інвэстараў. Які рэгіён першы гэта зробіць, той мае найлепшыя шанцы на інвэстыцыі. Але зразумела, што рэалізацыя стратэгій цяпер упіраецца ў агульную сытуацыю ў краіне, што гэта праца на будучыню.

«НН»: Як складаюцца твае стасункі з дэпутатамі пасьля восеньскіх давыбараў, калі цябе і тваіх паплечнікаў хаялі ў газэтах і дзе толькі маглі?

ЮГ: Гарсавет — гэта неадназначнае ўтварэньне. Траціну дэпутатаў складае звычайнае балота без акрэсьленай жыцьцёвай пазыцыі, траціну — група «Ініцыятыва». Падчас давыбараў нас спрабавалі зьнішчыць, але гэтыя падзеі дазволілі вызначыць, хто ёсьць хто. Людзі, якіх мы лічылі прагрэсіўнымі, паказалі сябе не з найлепшага боку. Улады дзейнічалі цынічна: некаторых былых сябраў нашай групы проста вымушалі выступаць супраць нас на сэсіі, выкарыстоўвалі розныя рычагі: не дамо кватэры альбо пэрспэктывы для дзяцей... Але гэтыя падзеі крышталізавалі тую групу, якая ёсьць цяпер: гэта людзі, якія не паламаліся. Наша цьвёрдая пазыцыя прывабна выглядае ў вачах белаазерцаў. Звычайныя белаазерцы кажуць, што ўвесь бруд, які ўлада на нас хацела выліць, — яна сама запэцкалася ў гэтым брудзе. А мы выйшлі з гэтай гісторыі ў белых пальчатках. У доўгатэрміновай пэрспэктыве страта большасьці ў гарсавеце нічога не вырашае, паколькі нічога не вырашае гарсавет.

«НН»: Эфэкт Белаазерску, дзе большасьць у гарсавеце склалі дэмакратычныя дэпутаты, — гэта выпадковасьць ці вынік вашай працы?

ЮГ: Белаазерск — гэта стандартнае мястэчка з звычайнымі людзьмі. Нічога выбітнага, ніякага супэрдэмакратычнага насельніцтва там няма. Такія вынікі былі магчымыя і ў любым іншым горадзе. Трэба рабіць стаўку на грамадзкую актыўнасьць. Калі я вярнуўся пасьля ўнівэрсытэту, там было 4-5 грамадзкіх актывістаў, якія ёсьць у кожным мястэчку, расчараваныя выбарчымі кампаніямі 1996, 1999 гадоў. Зь іх усё і пачыналася. Яшчэ з пачатку 90-х дзейнічала творчая сябрына «Агмень» пад старшынствам вядомай паэткі Ніны Мацяш. Мы працавалі з 2000 году, выдавалі газэту, шмат працавалі з настаўнікамі, жанчынамі. Аказалася, што і настаўнікі не такія кансэрватыўныя, трэба толькі ўмець зь імі працаваць.

«НН»: Ці зьвязваеш ты сваю далейшую кар'еру зь Белаазерскам?

ЮГ: Мая прысутнасьць там увесь час не патрабуецца. Цяпер я старшыня Берасьцейскай абласной рады Партыі БНФ. Мая дзейнасьць усё больш пашыраецца на тэрыторыю ўсёй вобласьці, працягваю жыць у Белаазерску, але даводзіцца шмат езьдзіць па раёнах, размаўляць зь людзьмі. За гэтыя 3—4 гады ў Белаазерску знайшлося багата новых маладых пэрспэктыўных людзей, якія могуць пераняць гэтую справу і весьці яе далей без маёй прысутнасьці. А для сябе я бачу сваю працу скіраванай на зьмену сытуацыі ў Беларусі любымі законнымі мэтадамі.

«НН»: І таму ты ідзеш на парлямэнцкія выбары?

ЮГ: Так. Гэта можна ацэньваць паразнаму. Адзінае, у чым я перакананы, — што людзі шукаюць альтэрнатывы, ім надакучыла тая сытуацыя, якая ёсьць. На мясцовых выбарах за нас таксама прагаласавалі таму, што чакалі альтэрнатыву. У нашых асобах яны яе пабачылі. У Белаазерску супраць нашых кандыдатаў не перамог ніводзін вылучэнец ад улады. Была татальная наша перамога, і таму цяпер не вылучацца на выбары — гэта значыць падмануць гэты народ. Ён не пабачыць альтэрнатывы, ён пабачыць тыя самыя твары ўладных вылучэнцаў — і гэта падштурхне людзей да чарговай апатыі.

«НН»: Як ты ацэньваеш пэрспэктывы дэмакратычных кандыдатаў на выбарах у ПП?

ЮГ: Спадзявацца на вялікае прадстаўніцтва ў палаце прадстаўнікоў ня варта. У найлепшым выпадку некалькі дэпутатаў-дэмакратаў здолеюць прарвацца. Ёсьць вялікая моладзевая плынь, якая прыйшла зь сярэдзіны 90-х гадоў. Гэтае пакаленьне павінна прайсьці і ўзяць на сябе адказнасьць за лёс Беларусі. Павінна быць утворана нейкая дэпутацкая група, але не такая, як «Рэспубліка», якая пачала працаваць толькі пасярэдзіне тэрміну. Практыка паказвае, што нават невялікая група дэпутатаў здольная варушыць працэсы і ўплываць на ўладу. Я думаю, гэта будзе лепш, чым тая сытуацыя, якая ёсьць цяпер у ПП.

«НН»: Як ты вырашыў заняцца палітыкай?

ЮГ: У прынцыпе, гэта ідзе ад майго бацькі, які заўсёды цікавіўся навінамі, слухаў «Свабоду». Але рашучы крок я зрабіў пасьля паказу па тэлевізіі азаронкаўскага фільму «Дзеці хлусьні». Зь фільму вынікала, што ёсьць ня толькі дурная ўлада, але і людзі, якія ёй супрацьстаяць. Наколькі б гаматна ні быў зроблены гэты фільм, але ён паказаў, што ва ўсеагульным балоце ёсьць купка людзей з адрознай пазыцыяй. Даверу да фільму не было, і мне стала цікава даведацца, што ж гэта за апазыцыя і што яны прапануюць. Калі даведаўся зь першакрыніц, мяне гэта пераканала. Так што ня ўсё дрэннае ў гэтых фільмах. Той, хто з галавой, знойдзе сабе станоўчыя адказы.

Ю. ГУБАРЭВІЧ

Жонка Ю.Губарэвіча зь Менску, але пераехала за мужам жыць у Белаазерск.

«НН»: Як складваецца тваё сямейнае жыцьцё, як сям'я ставіцца да палітычнай дзейнасьці?

ЮГ: Я жанаты і маю маленькую дачку. Мая жонка зь Менску, але пераехала са мной жыць у Белаазерск. Мы лічым, што жыць можна дзе заўгодна, калі ставарыць сабе годныя ўмовы для жыцьця. Я спадзяюся, што займаюся палітыкай даволі пасьпяхова, таму ў жонкі і бацькоў няма падставаў ставіцца да гэтага адмоўна. Палітыка, праўда, прыносіць перашкоды мне і жонцы (яе як жонку Губарэвіча не бяруць на працу ў Белаазерску), але я бачу вынікі дзейнасьці, і мае блізкія таксама гэта бачаць, яны ставяцца з разуменьнем. Ведаюць, што сытуацыю трэба мяняць і павінен быць нехта, хто гэтым будзе займацца.

«НН»: Чым ты займаешся ў вольны час?

ЮГ: Белаазерск — гэта край азёраў, каля гораду іх тры: Белае, Чорнае і Спораўскае, таму я зь дзяцінства люблю плаваць і лавіць рыбу. Рыбу я лаўлю рукамі. Гэта трэба ўмець, тут ты ўжо самнасам з рыбай, гэта не падман, не чарвяк, тым больш ня сетка. Ня кожную рыбу так зловіш, але кіляграмаў 10 за вечар можна налавіць.

Гутарыла Вераніка Дзядок

БІЯГРАФІЯ

Юрась Губарэвіч у 2000 скончыў Беларускую дзяржаўную політэхнічную акадэмію па спэцыяльнасьці інжынэр-электрык, у 2003 г. атрымаў дыплём магістра дзяржаўнага кіраваньня (Акадэміі дзяржаўнага кіраваньня пры прэзыдэнту Украіны і Унівэрсытэту Паўночнага Лёндану). З 1996 да 1998 ў Маладым Фронце, з 2000 — старшыня Цэнтру рэгіянальнага супрацоўніцтва (Белаазерск), у 2003 абраны намесьнікам старшыні Белаазерскага гарсавету.

Сьвята неіснуючай вёскі

У Глыбоцкім раёне, на месцы, дзе калісьці стаяла вёска Ражкова, адбылося сьвята гэтай вёскі. Былыя жыхары выкасілі траву на месцы правядзеньня сьвята, падрыхтавалі лаўкі для гасьцей, па дарозе да вёскі паставілі ўказальнікі «На сьвята».

Сьвята пачалося супольнай малітвай каля крыжа, адноўленага ў 2002 г. Францам і Паўлам Вышадкамі. Пастаўлены ён быў на тым самым месцы, дзе 85 гадоў таму іх дзед Каэтан Вышадка паставіў крыж і пасадзіў абапал яго два дрэвы. Паводле яго задумы, гэтыя дрэвы павінны былі расьці, сымбалізуючы рост і росквіт Ражкова. Дрэвы вырасьлі ў два абхваты, але вёска, на жаль, зьнікла. Яна трапіла ў сьпіс непэрспэктыўных, таму яе жыхары, хто пад прымусам, а хто і добраахвотна, пакінулі гэтыя мясьціны. Большасьць пасялілася ў суседняй Дзеркаўшчыне, хтосьці пераехаў у Глыбокае, а хтосьці ўвогуле падаўся ў далёкі сьвет, далей ад калгаснага «раю». Хаця для паўночнай Беларусі Ражкова была не такой ужо малой вёскай: 22 хаты і, паводле польскіх архіўных дакумэнтаў 1930 г., 120 чалавек. Разьмяшчалася яна на ўскрайку (ражку) зямлі ў лесе паміж Глыбоцкай і Дунілаўскай гмінамі. Адсюль і назва.

Пасьля супольнай малітвы сьвята перамясьцілася на пляцоўку насупраць крыжа. Там адбыўся канцэрт, падрыхтаваны супрацоўнікамі Дзеркаўшчынскага ДК. Былі ўзгаданы ўсе ражкоўскія сем'і, коратка распавялі пра іх лёсы — як яны перажылі і польскія часы, і прыход першых саветаў, і ваеннае ліхалецьце, і калектывізацыю. Для кожнага «ражкоўца» быў падрыхтаваны музычны падарунак. Толькі, на жаль, песьні былі ўсе па-расейску, адна была нават польская. Для беларускай песьні месца на сьвяце не знайшлося, хаця сама праграма сьвята вялася па-беларуску. Відаць, такая беларуская рыса: любіць чужое, не паважаючы і забываючы сваё роднае.

На здымках:
Былы жыхар вёскі Іван Адамовіч расказвае свой верш.
Ражкоўцы каля адноўленага крыжа.

Асобна хацелася б адзначыць лёс Яніны Квач, найстарэйшай жыхаркі Ражкова, якая мае ўжо 95 гадоў. Маладой дзяўчынай паехала яна на заробкі ў Варшаву. Удалося ёй там зарабіць грошы, але неспадзявана пачалася вайна. Варшава была занята немцамі. Заходнюю ж Беларусь у гэты час заняла Чырвоная армія. Больш за месяц дзяўчына мусіла дабірацца да родных мясьцін, якія зрабіліся ўжо замежжам. Ёй пашчасьціла дабрацца да Ражкова жывою, але зароблених грошай данесьці не ўдалося. І мусіла яна зноў цяжка працаваць, перажыла вайну, калектывізацыю, падняла на ногі дзяцей.

Да канца 70-х гадоў усе жыхары пакінулі Ражкова. Засталася толькі адна жанчына, Уліма Філіповіч. Яна сказала: загіну ці з голаду, ці з холаду, але нікуды адсюль не паеду. Хатка ў яе была старая, дзіравая, адрамантаваць ніхто не дапамог, вёска была ж непэрспэктыўная. Так і знайшлі кабету замерзлую ад зімовых маразоў.

Пасьля канцэрту людзі сабраліся на супольны абед. Была ўзьнята чарка за былых насельнікаў вёскі і іх нашчадкаў. Разьяжджаліся людзі са сьлязьмі на вачах, цяжка было пакідаць мясьціны, дзе яны нарадзіліся, дзе прайшло дзяцінства.

З начальства ўдзел у сьвяце прыняў дырэктар мясцовага ААТ «Канстанцінаў Двор» Віктар Асон. Сам ён не тутэйшы, але ідэю падтрымаў, выдзеліў аўтобус, сам ад пачатку да заканчэньня прысутнічаў на сьвяце. Астатнія праігнаравалі, не было ні сельсавецкіх работнікаў, ні раённага начальства.

Тым ня менш, сьвята людзям спадабалася, і яны вырашылі часьцей зьбірацца разам. На месцы вёскі засталіся толькі старыя дрэвы, некалькі кустоў бэзу і камяні на месцы падмуркаў хат. А колькі такіх вёсак у Беларусі?! Зь іх зьнікненьнем зьнікае цэлы пласт нашай гісторыі, культуры, зьнікае гістарычная памяць народу. І пакуль жывыя былыя жыхары, яшчэ ёсьць шанец захаваць гэта для нашчадкаў. Такія сьвяты варта праводзіць, каб памятаць пра свае карані. Бо заўтра можа быць ужо позна.

Зьміцер Лупач, Глыбокае
Фота аўтара

УЛАДЗІМЕР ДЗЯНІСАЎ

Дрэва

Стаяла на няміскім узвышшы дрэва. Стары, магутны каштан, з разложыстымі галінамі, бы рукамі, што кранаюць неба. Менскі старажыл. Пазіраў з пагорку на мітусьлівую беганіну ды адным сваім выглядам замаруджваў навокал час. Зь якога месца вуліцы ні зірнеш на дрэва — убачыш надзейнага вартаўніка маляўнічых дамкоў за яго сьпінай, вежаў Марыінскага касьцёлу і нават, калі ўглядзецца, ратушнага вяршка. Унізе ўжо спляжылі старыя падмуркі, заваліли дзьве вялікія таполі, рыюць чарговы катлаван у пластах XVII ст. Дзікі плюшч ужо не зачырванее ў кастрычніку на шурпатай цаглянай сьцяне, а папараць, што расьце ў расколінах, засыплюць друзам. Мы ж ня будзем ужо маладымі ў параўнаньні зь немалым векам магутнага дрэва, затое зразумеем, чаму Рым і цяпер называюць «вечным горадам».

Што замінае гэтым убогім праектавальнікам бачыць? Зрэзалі пагорак на Верхнім горадзе, зьнявечылі спрадвечны менскі ландшафт. Стопчуць і той, на якім стаяла дрэва. Пазбавяць духу даўніны рэшту няміскіх дваро́ў, дамкоў, ды ўтыркнуць побач шкляную сьмярдзючую пачвару, хіба што з блакітнымі вокнамі, маўляў, каб нагадвалі падземную рэчку.

Мы прамаўляем словы «Менск», «Няміга», «Сьвіслач», «Пярэспа», «Неба», «Зямля», «Дрэва» як зачур ад калецтва.

Вольга Бабкова

Бунт на канцэрце Карнелюка

Канцэрт расейскага сьпевака Ігара Карнелюка ў Баранавічах прайшоў не на цэнтральнай плошчы, а за зачыненымі дзьвярыма Дому культуры. Канцэрт быў арганізаваны ў рамках Дня Рэспублікі. На плошчы сабраліся сьвет людзей з букетамі і цярпліва чакалі канцэрту. Адсутнасьць артыста выклікала абурэньне народу, і людзі рушылі ў бок ДК. Ад пранікненьня ў залю іх стрымлівала міліцыя. На канцэрт жа трапілі толькі тыя, хто прыйшоў першы. Як заля запоўнілася, дзьверы замкнулі. Народ бунтаваў.

Беспрацоўных Горадні пасылаюць у войска

Гарадзенскі цэнтар занятасьці пачаў даваць зьвесткі для ахвотных завэрбавацца ў войска паводле кантракту. Сьпісы вакансій даюць самастойна вайсковыя часьці й ваенкаматы. Патрабуюцца арміі музыкі, электрыкі, будаўнікі. На сёньня ў войску прафэсіяналаў — кантрактнікаў, афіцэраў і прапаршчыкаў — 52% асабістага складу.

МБ; БелаПАН

Выгадная прафэсія сутэнёра

Што «жрыцы каханьня» запаланілі шашу Менск—Масква ў раёне Воршы, добра вядома ўсім. Але з большым камфортам яны абслугоўвалі кліентаў у гатэлі «Ворша». Арганізаваў іхнюю працу адзін спрытны месьціч. Ён дамовіўся з абслугай гатэлю, каб тая перадавала яму інфармацыю аб падарожных, якія ня супраць пазабавіцца з прастытуткамі. У «штаце» было 6 аршанак. Пасьля «працы» сутэнёр развозіў падначаленых па дамах, забіраючы большую частку іхняга заробку, які складаў ад 20 да 30 даляраў. Зводніцкі «бізнэс» працягваўся больш за год, пакуль ня быў спынены супрацоўнікамі праваахоўных органаў. Пасьля сьледзтва, якое даказала больш за дзесяць выпадкаў зводніцтва, адбыўся суд. Сутэнёр атрымаў год умоўна, дзяўчаты пакараныя невялікімі штрафамі. З чаго відаць, што ў нашай краіне займацца сутэнёрствам выгадней, чым палітыкай.

Яўген Жарнасек, Ворша

Расейскае бачаньне гісторыі Беларусі не зьмянілася

25 чэрвеня ў Полацкім унівэрсытэце адбыўся «круглы стол» з удзелам расейскіх і ўкраінскіх навукоўцаў. У склад расейскай дэлегацыі ўваходзілі філёзафы і гісторыкі, якія вывучаюць усходнеславянскую цывілізацыю, сярод іх — загадчык сэктару гісторыі расейскай філязофіі РАН Міхаіл Громаў і галоўны навуковы супрацоўнік Пушкінскага дому ў Санкт-Пецярбургу Геліян Прохараў. Найбольш востра дыскусія разгарнулася па пытаньнях гісторыі Беларусі. Расейскія гісторыкі па-ранейшаму лічаць, што беларускія землі ў XIV ст. былі «захоплены» Літвой. Беларускі бок таксама выказаў нязгоду адносна цьверджаньня, што на беларускую культуру найбольшы ўплыў аказала праваслаўная царква. Адбыўся карысны абмен думкамі. Бакі пагадзіліся з тым, што ў кожнай краіне могуць існаваць свае трактоўкі гісторыі, якія трэба паважаць.

Васіль Кроква, Полацак

ОРТ перасеклі кабэль

У Баранавічах усе кабэльныя кампаніі, як на загад, спынілі трансьляцыю ОРТ. Як патлумачылі ў адной з кампаній, падчас сходу Беларускай тэлевізійнай асацыяцыі прадстаўнік Міністэрства інфармацыі заявіў, што дазвол на рэтрансьляцыю ОРТ выдаваецца больш ня будзе. Таму ў заявах той канал ня варта нават згадваць, каб потым не перарабляць дакумэнтаў. Як выявілася, у Беларусі ОРТ ня мае пагадненьня аб рэтрансьляцыі. З нашай краінай такую дамову падпісала толькі НТВ. Баранавіцкія кабэльшчыкі зьбіраюцца замяняць ОРТ польскімі, украінскімі ці балцкімі каналамі.

Руслан Равяка, Баранавічы

Сталоўка для маламаёмных

Міжнародная харытатыўная арганізацыя «Caritas» адчыніла ў Віцебску дабрачынную сталоўку для нямоглых. Цягам 11 месяцаў маламаёмныя віцябляне будуць атрымліваць бясплатнае гарачае харчаваньне.

belngo.info

Цяжкая навука

Аляксей Знаткевіч

У цяперашнім рэжыме найбольш турбуе яго комплекс непаўнавартасьці — нацыянальнай і агульначалавечай, — піша журналіст Аляксей Знаткевіч, — тым больш што гэты ж комплекс адаб'ецца і на наступных пакаленьнях. Каб загаіць раны мінулага, трэба быць гатовымі да кампрамісаў.

PHOTO BYMEDIA.NET

Пры канцы 1980-х у беларускія гарады разам з джынсамі-«варонкамі» і аднолькавымі турэцкімі швэдрамі прыйшлі новыя цікавыя словы — напрыклад, «рэкет». Дагэтуль памятаю сваё ўражаньне 14-гадовага хлопца ў магілёўскім ДК «Хімвалакно», дзе ў 1988-м адбываўся першы ў Беларусі «Всесоюзный» рок-фэстываль. Размаляваны Лявон Вольскі на сцэне рыкаў у мікрафон: «А зараз песьня, прысьвечаная такой сацыяльнай зьяве, як прастытуцыя!» Што такое прастытуцыя, я ўжо ведаў.

1990-я гады таксама прынесьлі новыя прыгожыя словы. Але некаторыя зь іх дагэтуль застаюцца малазразумелымі. Скажу болей, на пару такіх слоў адукаваныя людзі ў нашай частцы сьвету часам рэагуюць як маладзенькая настаўніца, якая пабачыла на кляснай дошцы намаляванае крэйдай «х.й». Адно з такіх слоў — паліткарэктнасьць.

Слова для тых, хто яшчэ вучыўся ў СССР, нечым дужа падобнае на ленінскі «Рабкрын». Усе ведаюць, што яго трэба рэарганізаваць, некаторыя нават ведаюць як, але ніхто не пацікавіўся, навошта гэта трэба.

Наконт паліткарэктнасьці ўсе ведаюць, што прыдумалі яе ў адной з заходніх лябараторый. Большасьць здагадваецца, што яна падобная да каларадзкага жука: толькі пусьці яе ў краіну — пажарэ ўсю бульбу. Што праўда, мала хто цяміць, чым яна адрозная ад нашых родных «талерантнасьці», «памяркоўнасьці», «рахманасьці» ды «млявасьці» і ці розьняцца нечым апошнія чатыры між сабой.

Крытыкуюць паліткарэктнасьць беларусы рэдка — важнейшых дзялоў хапае. Хіба што «Советская Белоруссия» час ад часу пакпіць на тэму саломіны ў чужым воку і бервяна ў сваім.

Затое расейскія мэдыі сьцябаюцца як толькі могуць. «Як так — нэгра нэграм назваць нельга?! Нас у школе вучылі, што Расея — радзіма сланоў, на Чукотцы жывуць чукчы, а ў Амэрыцы нэграў лінчуюць», — шчыра падзівіцца чарговы Браток-2, прыехаўшы ў ЗША.

Камэнтатары ў больш рэспэктабэльных «Известиях» па-сяброўску ўшчуваюць сваіх эўрапейскіх і амэрыканскіх калег: вам няма чаго рабіць? Агульныя высновы: «з раскошы шалеюць» і «ў нас гэтага няма».

Чарнаскурая сястра

Паліткарэктнасьці ў сэнсе здаровага розуму сапраўды часам не стае. Памятаю, як некалькі гадоў таму мяне павесяліў у тых жа «Известиях» артыкул пра нейкую расейскую тэнісістку (ня Ганну Курнікаву, клянуся!). Апавядаючы пра яе шлях шматлікіх перамог і рэдкіх параз, газэта называла рэйтынгі суперніц. Але раптам я даведаўся, што яна прайграла «чернокожей Винус Вильямс». Дзе ў рэйтынгу была гэтая чарнаскурая лэдзі, «Известия» не напісалі.

Магчыма, Вінус Уільямс тады была першым нумарам, і газэтчыкі вырашылі, што кожны чытач гэта ведае. Магчыма, я быў адзіны, хто ня ведаў рэйтынгу і ведаў, што Вінус Уільямс — нэгрыцянка. Наколькі памятаю, «Известия» паведамілі пры канцы артыкулу, што расейскую тэнісную зорку хутка чакае змаганьне зь сястрой Вінус — «чернокожей Сереной Вильямс». Я не жартую. Рэйтынгу другой чарнаскурай тут ізноў не было, але прынамсі ўсе даведаліся, што паміж сёстрамі Уільямс няма расавых канфліктаў. Ці былі сярод суперніц расейскай зоркі іншыя «каляровыя» і якога колеру яна сама, газэта таксама не напісала. Карацей, паліткарэктнасьці на вас няма!

Як вучыць псыхалёгія, мы больш здольныя ўспрымаць як асоб менавіта людзей сваёй групы — расавай, этнічнай, сацыяльнай, эканамічнай ці палітычнай. Чым далей ад цябе група — тым больш падобнымі паміж сабой здаюцца людзі. Толькі пабачыўшы нейкую колькасьць азіятаў, я заўважыў, што японцы не падобныя да кітайцаў, а карэйцы нечым адрозніваюцца ад першых і другіх. Я магу колькі хочаце спрачацца з актывістам Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі — БНФ, але для прыхільніка «саюзнай дзяржавы» мы абодва застанемся «нацыяналістамі».

Паліткарэктнасьць карысная, калі яна прымушае паглядзець на свае стэрэатыпы нібыта збоку.

Але бываюць сытуацыі, калі паліткарэктнасьць пачынае браць на сябе зашмат. Найперш гэта адбываецца, калі чалавек забараняе сабе гаварыць ці пісаць тое, што лічыць праўдай, каб не пакрыўдзіць пэўную групу людзей. Праблема ў тым, што ён пры гэтым непазьбежна пачынае арыентавацца на найніжэйшы элемэнт групы — папросту кажучы, на дурня.

Млекакормячыя лепшыя за сысуноў

Другая праблема зьяўляецца, калі са сваёй паліткарэктнасьцю лезуць у чужую хату — у чужы культурны код. Напрыклад, калі б Вінус Уільямс, прыехаўшы ў Маскву, пачала б вучыць усіх мясцовых жыхароў, што нэграў трэба называць «афроамерыканцамі», нават калі тыя жывуць у Нігерыі.

Нешта падобнае адбывалася ў савецкай Беларусі, калі, напрыклад, у 1930-я пасьля пастановы Саўнаркаму ў беларускай мове ўкаранялі слова «яўрэй» замест «жыд». Акрамя «жыда», іншага слова ў жывой мове да таго часу не было. Але яно, без сумневу, рэзала расейскамоўнае вуха і блытала яго, як выразы «маеш рацыю» ці «я араў». Для такога вуха слова «млекакормячае» хоць і сьмешнае, але лепшае за слова «сысун».

Праблема тут не ў канкрэтным слове. Тым больш што, у адрозьненьне ад 30-х гадоў мінулага стагодзьдзя, яно цяпер нясе значна большы ідэалягічны цяжар, чым саўнаркамаўскі «яўрэй». Дазвол на ўжываньне слова «жыд» у 1940-я ненадоўга вярнулі тыя, хто хацеў, каб хутка не засталося пра каго гаварыць. Таму беларусы і прыдумалі, натхніўшыся іўрытам, паліткарэктнага «габрэя».

Праблема ў тым, што, калі чужынец патрабуе зьменаў у тваім культурным кодзе на капыл свайго, ён звычайна мае на ўвазе, што ўвесь твой код — непаўнавартасны, а таму варта пераняць ягоны. З часам ты можаш сам у гэта паверыць, асабліва калі цябе да гэтага заахвочваюць, у розныя часы па-рознаму — калі адсутнасьцю ўнівэрсытэтаў зь беларускай мовай выкладаньня, калі кпінамі, а калі і куляй у патыліцу.

Можна запярэчыць, што пераход на чужую мову ў значнай ступені адбываўся і адбываецца добраахвотна — маўляў, беларусы і бяз вонкавага ціску самі прызнаюць перавагу чужога культурнага коду. Гэта, аднак, менш за палову праўды. Так, магутная расейская культура (як «высокая», так і «масавая») дагэтуль застаецца моцным стымулам для вывучэньня расейскай мовы, і ня толькі ў Беларусі. Але ў адмове ад беларускай мовы нельга недаацэньваць узровень прымусу — эканамічнага, адукацыйнага, сацыяльнага і палітычнага — сьпярша ў Рэчы Паспалітай, потым у Расейскай імпэрыі, міжваеннай Польшчы, СССР, і нават цяпер, у Рэспубліцы Беларусі. Закрыцьцё Коласаўскага ліцэю — толькі адзін зь нядаўніх прыкладаў.

Цікава, што ў ЗША, дзе зьявілася сучасная канцэпцыя паліткарэктнасьці, саманазвы некалькіх народаў на той час ужо ператварыліся ў зьнявагу. Напрыклад, у амэрыканскім варыянце ангельскай мовы абразьлівымі лічацца словы «Polack» і той самы «Yid», які зьвязаны з мовай ідыш.

Натуральна, культурны код не абмяжоўваецца мовай. Калі турыст прыяжджае ў Японію, ён можа папрасіць для сябе відэлец замест палачак для ежы. Калі ж ён патрабуе ад японцаў побач зь ім выкінуць палачкі і карыстацца толькі відэльцамі, гэта ўжо не турыст. Гэта — акупант.

Некаторыя аналітыкі выказвалі думку, што беларуская нацыя можа без праблем існаваць і зь перавагай расейскай мовы. Часам за гэтым простая ідэя: дзяржава ўжо ёсьць, яна і нацыю сфармуе, калі ўжо не сфармавала. На гэта можна сказаць, што любая краіна — занадта сур'ёзная рэч, каб яе даверыць дзяржаве. Асабліва ў нас, дзе пакуль часта, амаль паводле формулы французскага караля, «дзяржава — гэта прэзыдэнт». Чалавек схільны верыць, што ён беларус, калі жыве ў Рэспубліцы Беларусі, але ён можа думаць і па-іншаму.

У адным з сацыялягічных дасьледаваньняў каля дзьвюх трацін апытаных беларусаў называлі сябе праваслаўнымі, але пры гэтым толькі крыху больш за палову адказалі, што вераць у Бога. Пры гэтым было яшчэ працэнтаў пятнаццаць каталікоў і некалькі працэнтаў пратэстантаў.

Часам маюць на ўвазе, што ёсьць іншыя культурныя коды, якія дазволяць беларусам застацца «адзінымі і непаўторнымі». Тут спрачацца цяжка, але варта зрабіць некалькі ўдакладненьняў.

Такімі кодамі для любога народу могуць быць, акрамя мовы, супольная гісторыя, рэлігія і звычаі. З гісторыяй у нас па-ранейшаму цяжкавата, бо згоды наконт яе няма. Няма і адзінай рэлігіі: нягледзячы на перавагу праваслаўных, каталіцкая меншасьць — гэта мільёна паўтара, і пратэстантаў таксама нямала. Застаюцца звычаі — стандартныя мадэлі паводзін у розных сытуацыях.

Цьвік на лаўцы

Тут лепей было б пакласьціся на ацэнкі небеларусаў, бо ў сваёй групе чалавек заўсёды схільны бачыць асоб, а ў чужой — схемы. Услых, аднак, табе звычайна гавораць толькі прыемныя з гэтых схем. Беларусаў звычайна называюць спакойнымі, гасьціннымі і працавітымі.

Калі заканамернасьці шукаюць у сваёй групе, звычайна знаходзяць прыемнае. Але ёсьць і выняткі. Пра тое, што ўсур'ёз сказаць сорамна, можна пажартаваць. Адсюль і анэкдоты пра цьвік на лаўцы беларуса (мо так і трэба?) ці пра жаданьне асьлепнуць на адно вока ў адказ на прапанову Бога «зрабіць нешта табе, а суседу ўдвая».

Незалежна ад таго, добрыя ці кепскія звычаі цяперашніх беларусаў, усе гэтыя звычаі, як культурны код, адасабляюць іх ад іншых народаў. Многія дасьледчыкі лічаць, што якраз звычаі найпавольней зьмяняюцца ў параўнаньні з мовай, меркаваньнямі пра сваю гісторыю ці рэлігіяй. Нездарма паэт Рыгор Барадулін любіць называць беларусаў «кшчонымі паганцамі». Хрост можна прыняць за адзін дзень, але потым стагодзьдзямі класьці ахвяры старым багам.

Аднак хацелася б засьцерагчы ад неапраўданага аптымізму ці пэсымізму наконт моцы звычаяў. Тое, што раней рабілася стагодзьдзямі, цяпер можа адбывацца значна хутчэй. Прычына простая: навукова-тэхнічнае развіцьцё паскараецца, зьмяняючы эканоміку і за ёй — грамадзтва, таму людзям даводзіцца да яго прыстасоўвацца. Селянін з тэлевізарам у хаце часьцей за ўсё застаецца селянінам, часам і пераехаўшы ў горад. Але калі чалавеку даводзіцца пераяжджаць з гораду ў горад на новую працу кожныя некалькі гадоў, захаваць стары лад жыцьця і звычаі робіцца ўсё цяжэй. А менавіта гэта часта адбываецца ў сучасных рынкавых эканоміках. Таму зьмены да рынку могуць аслабіць у Беларусі адно з надзейных апірышчаў нацыянальнай тоеснасьці.

Мяне могуць запытаць: «Ну і што?» Прычым так могуць запытаць ня толькі людзі, якім абыякава, ці застануцца беларусы народам, а Беларусь — асобнай дзяржавай. Беларускія аптымісты любяць прыгадваць прыклад Ірляндыі, якая мову практычна страціла, а жыве нішто сабе і да ангельцаў не хінецца. Пры гэтым некаторыя забываюць пра каталіцтва, якое

паліткарэктнасьці

было сур'ёзным апірышчам у адасабленьні ад пратэстанцкай Брытаніі. Тыя, хто пра каталіцтва памятае, часам забываюцца прыгадаць, чым Ірляндыя заплаціла за гэтае апірышча. У Бэлфасьце і рэшце Паўночнай Ірляндыі дагэтуль няма поўнага міру, хоць і Брытанія, і Ірляндыя даўно ў Эўразьвязе.

Беларуская мова занадта прыгожая для беларусаў?

Можна запярэчыць, што і мова беларусаў не аб'ядноўвае, а хутчэй разьднаўвае. І гэта будзе праўдай. Таварыства беларускай мовы любіць спасылацца на вынікі перапісу насельніцтва, калі 74% жыхароў назвалі роднай мовай беларускую. ТБМ называе гэта фактычным рэфэрэндумам аб статусе мовы. Але ў гэтым фактычным рэфэрэндуме быў хутчэй адказ на пытаньне «Кім Вы сябе лічыце паводле нацыянальнасьці?». Вось 74% і адказалі — беларусам. Тое, што на адкрытае пытаньне аб нацыянальнасьці беларусамі назваліся крыху больш за 80 працэнтаў, паказвае, што мала хто пакуль аддзяляе нацыянальнасьць ад мовы. У дадатак гэта ўскосна сьведчыць пра павагу да мовы з боку тых, хто яе практычна не ўжывае.

Цікавейшы адказ на пытаньне, якой мовай людзі карыстаюцца ў побыце. Тут таксама быў фактычны рэфэрэндум, але зь іншым пытаньнем: «Ці гатовы вы актыўна падтрымаць беларусізацыю?». Пагадзіліся 37%. Пры гэтым ясна, што многія зь іх па-беларуску дома не размаўляюць. Мой сваяк неяк патлумачыў: «Прыйшлі да нас, пытаюцца, на якой мове дома размаўляем. Я думаю: гаворым звычайна па-расейску, але ж гэта няправільна, мы ж па-беларуску павінны гаварыць. Сказаў ім, што на беларускай». Ведаю, што так казалі і некаторыя іншыя, хто па-расейску дома размаўляе часьцей. Таксама магчыма, што нейкі працэнт з тых, хто гаворыць «па-тутэйшаму», назваў у перапісе мовай побыту небеларускую, адказаўшы «не» на пытаньне аб беларусізацыі.

37% — гэта больш за тых, хто галасаваў супраць расейскай як другой дзяржаўнай у 1995 г. Тады многія не разумелі, што фактычнае пытаньне было «Ці падтрымліваеце вы русіфікацыю?». Але й 37% «супраць» — гэта па-ранейшаму менш за палову.

Тым ня менш, адмовіцца ад мовы «для адзінства ў народзе» не дазваляюць некалькі прычынаў. Першая прычына мастацкая: мова каштоўная сама па сабе, незалежна ад таго, ці падабаецца табе дзяржава і нават народ. Як казаў мой знаёмы ангелец, французская мова надта прыгожая для французаў.

Другая прычына маральная. Нават калі ты верыш, што дзяржава і народ бяз мовы захаваюцца, адмаўляцца ад яе беларусу крыху сорамна. Гэтак чалавек можа сказаць, што любіць сваю сям'ю, дзе кожны, як і ён сам, мае нейкую хваробу нагі, але яму шкада грошай на лячэньне. Таму, маўляў, лепей кожнаму па адной назе ампутаваць.

Трэцяя прычына прагматычная. Нага — штука карысная. Існаваньне жывой мовы і павага да яе нават тых, хто на ёй рэдка ці нават зусім не гаворыць, — гэта сур'ёзнае апірышча нацыянальнай тоеснасьці. Незалежна ад таго, наколькі моцнымі застануцца іншыя апірышчы. Калі беларусам прыводзяць прыклад нямецкамоўнай Аўстрыі, дык забываюць просты факт, што нямецкая мова не замяняла аўстрыйскай. Аўстрыйскай проста не было і пакуль не зьявілася. Некаторыя гэтаму запярэчаць: маўляў, аўстрыйцы ці ірляндцы цяпер ужо маюць свае варыянты мовы, адрозныя ад нямецкай ды ангельскай. Я таксама ўжо колькі разоў бачыў у «Белорусской деловой газете» беларускія словы, якіх няма ў слоўніках расейскай мовы і якіх не ўжываюць у расейскіх СМІ. Але гаварыць, што «БДГ» піша нейкай новай мовай, пэўна не выпадае.

У сучасным сьвеце мову лягчэй страціць, чым некалі, калі большасьць людзей стабільна жылі ў сваёй вёсцы і мелі кантакты зь іншымі «тутэйшымі». Але мову цяпер лягчэй і адрадзіць. Той жа тэлевізар можна скарыстаць як для русіфікацыі, так і для беларусізацыі. Гэтая «неназойлівая» тэхналёгія ўжо даўно для многіх людзей займае ладную частку зносін з навакольным сьветам. Тое самае часткова можна сказаць і пра FM-радыёстанцыі.

Могуць яшчэ спытаць, чаму я ўвесь час падкрэсьліваю выбар паміж аднаўленьнем і зьнікненьнем, паміж расейскай і беларускай мовамі. Штука ў тым, што немагчыма стаяць на адным месцы. Калі ты ня йдзеш у нейкім кірунку, ты абавязкова перамесьцішся ў кірунку супрацьлеглым, часам незаўважна для сябе. Рэальнае дзьвюхмоўе магчыма толькі пры ўмове, што будзе дастаткова людзей, для якіх беларуская мова будзе ня роўнай зь іншымі, а «раўнейшай за іншыя».

Актуальны лукашызм

Адзін з пэрсанажаў расейскага пісьменьніка Віктара Пялевіна падзяліў пэдэрастаў на актыўных, пасіўных і актуальных. Першыя і другія атрымалі свае схільнасьці ад прыроды, і да іх пытаньняў няма. Трэція ж даведаліся пра тое, што пэдэрастыя — гэта актуальна, з часопісу «Птюч», і да іх пытаньні будуць заўжды.

Падобную мэтафару можна правесьці і ў палітычным жыцьці. Чыноўнік часта можа быць разумнейшы за апазыцыйнага актывіста. Але нешта не дазваляе хваліць яго за гэта. Пытаньне ў тым, ці верыць сам чыноўнік у справядлівасьць таго, што кажа і робіць. Альбо ён даведваецца, што цяпер актуальна, з апошняга выступленьня прэзыдэнта.

> Любая краіна — занадта сур'ёзная рэч, каб яе даверыць дзяржаве.

У адным эсэ былога чэскага дысыдэнта (а пасьля прэзыдэнта) Вацлава Гаўла ёсьць аповед пра загадчыка крамы «Садавіна-гародніна», які ў вітрыне павесіў лёзунг «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!». Паводле Гаўла, сапраўдны тэкст гэтага лёзунгу меў бы выглядаць прыкладна так: «Я, дырэктар Х., ведаю, чаго ад мяне чакаюць. Я паслухмяны, і на мяне можна пакласьціся». Гавал тлумачыць, што такі лёзунг загадчыку павесіць было б сорамна. Таму даводзіцца падманваць іншых і сябе тым, што ты нібыта верыш у дзяржаўную ідэалёгію.

Нехта скажа, што і сярод праціўнікаў цяперашняга рэжыму ў Беларусі, і сярод эліты ў дэмакратычных краінах ёсьць дастаткова такіх загадчыкаў, якія дзейнічаюць у страху страціць выгады і выгоды. Розьніца, аднак, у тым, што ўмовы аўтарытарызму вырабляюць такіх людзей канвэрным мэтадам. Тут ужо не настолькі важна, *што* ты гаворыш і робіш. Важнейшае тое, што ты гаворыш і робіш гэта на загад зьверху.

Пакаленьне БРСМ

Пару гадоў таму, вяртаючыся зь сябрам з бару «Тройка», што на менскай плошчы Свабоды, мы напаткалі кампанію маладзёнаў гадоў па 20. Ідучы насустрач, тыя нешта гучна абмяркоўвалі, і адзін радасна сказаў, невядома пра каго: «Хорошо им Лукашенко дал!» Я не стрымаўся і сказаў хлопцу нешта кепскае пра ягонага куміра. Завязалася дыскусія.

Іх было чацьвёра, але кожны зь іх быў на паўгалавы ніжэйшы і кіляў на 10 лягчэйшы за мяне ці майго сябра. Таму хлопцы ня сталі пераводзіць спрэчку ў практычнае рэчышча. Толькі той, што быў пахваліў Лукашэнку, увесь час сьвідраваў мяне поглядам і зрэдку пытаўся ў нефармальнага лідэра чацьвёркі: «Можно, я его ударю?»

Аднак у цэлым мы гаварылі як культурныя людзі: «А што табе Лукашэнка кепскага зрабіў?» — «А што ён зрабіў добрага?» — і гэтак далей.

Адзіны важкі аргумэнт нашых апанэнтаў у падтрымку Лукашэнкі гучаў так: «У мяне дзед — рускі, у Брэсцкай крэпасьці пагіб. І ўвогуле, славяне — браты». Я ня стаў гаварыць: «Лукашэнка дрэнны, бо мой дзед-беларус браў Бэрлін, а адзіная небеларуска-бабуля напалову палячка, напалову ўкраінка». Мой сябра не сказаў, што ён этнічны расеец, які нарадзіўся на Волзе і вырас у Калінінградзкай вобласьці. Але нашы аргумэнты таксама наўрад ці гучалі бліскуча.

Гэтая гутарка прымусіла мяне задумацца над фармулёўкай «лукашызму», якую можна было б выкласьці ў некалькіх сказах. Не для спрэчак на вуліцы, бо такім чынам увогуле цяжка некага пераканаць ці ў нечым пераканацца, але для сябе. І тут я зразумеў, што ў цяперашнім рэжыме мяне найбольш турбуе яго комплекс непаўнавартасьці — нацыянальнай і агульначалавечай. Калі Лукашэнка гаворыць, што высокія думкі можна выказаць толькі па-расейску ці па-ангельску, альбо калі ён дзяўбе сваіх міністраў на чарговай нарадзе ў жывым тэлеэфіры — гэта зьявы аднаго кораня.

Неяк Сьвятлана Алексіевіч на пытаньне, ці можа яна паўдзельнічаць у «круглым стале» і гаварыць пры гэтым па-беларуску, адказала прыкладна так: магу, але я ня буду роўная сама сабе. Лукашэнка таксама ня можа застацца «роўным самому сабе» яркім палемістам-дэмагогам, гаворачы па-беларуску.

Каб стаць «роўным самому сабе» ў мове, якую ты ведаеш горш за сваю асноўную, трэба прыкласьці немалыя намаганьні. Можна таксама проста не камплексаваць з гэтай нагоды. Сьвятлана Алексіевіч — сусьветна вядомая пісьменьніца, яна прызнаная ў расейскай культуры за сваю, і выглядае, што тут нейкага комплексу ў яе няма. Лукашэнка ж, нягледзячы на ўсе ягоныя посьпехі ў справе атрыманьня і трыманьня ўлады, відавочна, ня можа проста зьмірыцца зь «няроўнасьцю самому сабе». Таму трэба «апусьціць» астатніх.

Але тое самае тычыцца і шмат якіх іншых сфэр. Публічныя напады на чыноўнікаў — ня толькі шоў для патэнцыйных выбаршчыкаў і практыкаваньне, каб падтрымаць асабістую адданасьць. Гэта таксама і праява таго самага комплексу непаўнавартасьці, толькі прафэсійнай. Гэтыя публічныя «апусканьні» мелі і дагэтуль маюць папулярнасьць. Лукашэнкавы комплексы падзяляюцца значнай часткай насельніцтва. Праблема ў тым, што гэта заахвочвае заставацца ва ўрадзе толькі людзей, у якіх праблемы з годнасьцю. А каб стаць сапраўдным прафэсіяналам, звычайна трэба мець хоць нейкі запас павагі да сябе, нават самалюбства.

Дарэчы, тады на разьвітаньне лідэр кампаніі нашых апанэнтаў сказаў, што мы ўсе беларусы — але па розныя бакі барыкад. Было ясна, што сказаў ён гэта абсалютна шчыра. Ён ня быў «актуальным лукашыстам».

Лідэр «Маладога фронту» Павал Севярынец пісаў пра пакаленьне цяперашніх 25—30-гадовых як пра пакаленьне «МФ». Натуральна, толькі мізэрная частка моладзі непасрэдна брала ўдзел у гэтай арганізацыі і далёка ня ўсе падзялялі яе ідэі. Але Севярынец мае рацыю ў тым сэнсе, што гэтае пакаленьне аб'ядноўвае нешта супольнае. Яно фармавалася ва ўмовах, калі розьніца ў думках і ідэалёгіях была нечым натуральна зразумелым і незаўважным, як паветра. Ад позьняга Гарбачова да раньняга Лукашэнкі можна было больш-менш казаць пра ідэалягічны плюралізм як пра частку «мэйнстрыму». Спроба пры канцы 1990-х стварыць у Беларусі аналяг савецкага камсамолу — БПСМ — выглядала хутчэй як спроба асобных людзей добра прыкласьціся да дзяржаўнай кармушкі.

Аднак апошнія гады ствараюць крыху іншую сытуацыю. Новае пакаленьне моладзі фармуецца ва ўмовах, калі палітычныя альтэрнатывы ўладзе апынуліся паза «мэйнстрымам». Каб пра іх даведацца, трэба прыкладаць намаганьні. Нездарма Беларускае тэлебачаньне часта выбірае замоўчваньне нейкіх крокаў апазыцыі замест крытыкі.

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у 2001 годзе Аляксандар Лукашэнка быў раззлаваны тым, што моладзь прагаласавала супраць яго. Дэмакраты любяць паўтараць, што час іграе супраць Лукашэнкі, бо моладзь, якая зьмяняе старэйшыя пакаленьні, яго не падтрымлівае. Але тут небясьпечна цалкам верыць у «гістарычную непазьбежнасьць». На зьмену асобным цынікам з БПСМ можа прыйсьці «пакаленьне БРСМ». Як у савецкія часы, у паноўную ідэалёгію нехта паверыць проста таму, што іншую думку рэдка дзе можна пачуць.

Неяк, праходзячы праз пераход каля чыгуначнага вакзалу ў Менску, я пабачыў шмат міліцыі і пачуў магутнае шматгалосьце: «Жыве Беларусь!» Я крыху зьдзівіўся, бо ні пра якія палітычныя пратэсты на чыгуначным вакзале ня чуў. Высьветлілася, што гэта футбольныя заўзятары праводзілі гасьцей на маскоўскі цягнік. Беларуская зборная прайграла ў той дзень расейскім супернікам.

Большасьць моладзі ходзіць на гульні зборнай з чырвона-зялёнымі сьцягамі. І, мабыць, ня толькі таму, што на бела-чырвона-белыя палюе міліцыя. Выглядае, што гэты чырвона-зялёны сьцяг для часткі моладзі ўжо ўспрымаецца як натуральны знак патрыятызму.

Таму нацыянальным палітыкам, якія зьбіраюцца прыйсьці да ўлады, варта падумаць, да якіх сымбалічных кампрамісаў яны гатовыя. Напрыклад, «расейскі» варыянт — традыцыйныя герб і сьцяг, але гімн «Мы, беларусы — мірныя людзі». Тым болей што наконт свайго гімну сапраўднай згоды няма і ў нацыянал-дэмакратычным лягеры. «Магутны Божа» некаму падаецца занадта рэлігійным, «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» — агрэсіўным, а «Пагоня» — асабістым.

Гэта ж тычыцца і правапісу. Існаваньне «тарашкевіцы» — важны стымул для разьвіцьця жывой мовы. Аднак варта сем разоў падумаць таму, хто разьлічвае хутка зрабіць яе адзінай дзяржаўнай нормай, адмяніўшы «каляніяльны правапіс», як вызначыў «наркамаўку» Сяргей Дубавец.

Нават у адраджэньні мовы, у прынцыпе, трэба вялікая асьцярожнасьць, каб ня ўпасьці ў прагу рэваншу пасьля прыніжэньняў з боку цяперашняга рэжыму.

Той самы сябра, зь якім мы бок у бок вялі вулічную дыскусію, прыкладна ў тыя ж месяцы нападпітку вяртаўся дадому, і яго спыніў міліцэйскі патруль. Маладыя міліцыянты запрасілі яго праехацца зь імі да пастарунку. Сябра не адчуваў сябе вінаватым і абурана сказаў: «Эх вы, Лукашэнку служыце!» На што старшы па званьні нечакана адказаў: «А каму служыць, Пазьняку, што лі?» — «Навошта Пазьняку? Беларусі». — «Ладна, ідзі…»

> Рэальнае дзьвюхмоўе магчыма толькі пры ўмове, што будзе дастаткова людзей, для якіх беларуская мова будзе «раўнейшай за іншыя».

> У сучасным сьвеце мову лягчэй страціць. Але мову цяпер лягчэй і адрадзіць.

Аляксей Знаткевіч (нар.1974) — журналіст радыё «Свабода», перакладчык на беларускую мову твораў Уэлша, Кундэры, Кейва.

Дзень Свайго Сьцяга

Паспрабую праз «НН» выкласьці некаторыя свае разважаньні. Не хачу ўдавацца ў вялікую палітыку — гэта не мая справа. Мяне больш цікавіць ідэалёгія.

Нашы апазыцыйныя партыі і групы зашыліся самі ў сабе. Уражаньне такое, што яны думаюць толькі аб сваіх вузкапартыйных праблемах. Абы выжыць, застацца на плаву. Кругом апатыя, пэсымізм, людзі пазашываліся ва ўласных праблемах і маленькіх радасьцях. А моладзь тым часам слухае расейскую папсу, рэжым дзе толькі можа навязвае чырвона-зялёную сымболіку — на матчы, дэманстрацыі, ужо і на аўтанумары. Але не чыноўнікі трымаюць гэтыя сьцягі, а самі маладыя людзі. Якія яшчэ і рагочуць ад шчасьця. Іншыя праяўляюць «сьмеласьць», нацягваючы на сябе майку з надпісам «СССР» ці партрэтам Чэ Гевары. Бач ты, «антыглябалісты». Буша няйнакш як дэбілам не называюць. А з «Пагоняй» майку надзець — абсерацца…

Неяк пасьля менскага тэнісу заходзіць да мяне сябар з сваёй новай гірлой-малалеткай. У ейных руках чырвона-зялёны флажок. І абое такія радасныя: нашы выйгралі. Кажу ёй: табе ня сорамна? Ён мне: ды будзе табе, чаго ўжо цяпер… Адказваю: можна ня лезьці ў палітыку і ні ў чым ня ўдзельнічаць, але ёсьць жа элемэнтарныя нормы прыстойнасьці, у кожным разе ня пэцкацца. Яна пайшла паліць, а ён мне ціха: а ведаеш, я ўжо зьмірыўся…

Калі б у свой час наша палітычная эліта не распылялася б на **дробязі** (у тым ліку рознага кшталту зборы подпісаў, мітынгі, дэманстрацыі, выбары ў дваровыя рады і да т.п.), а стварыла паралельнае (хай сабе й падпольнае) беларускае жыцьцё з сваімі традыцыямі, салідарнасьцю, сваёй культурай, адукацыяй, сваімі нормамі і правіламі, то наўрад ці каго можна было б прымусіць узяць у рукі чырвона-зялёны сьцяг ці партрэт найвышэйшага чыноўніка, бо гэта лічылася б **дрэнным тонам**. Каб працавалі падпольныя беларускія школы, дзе выкладалі б сапраўдную гісторыю Беларусі, каб у кожнага школьніка ці студэнта быў прыгожы і цікавы падручнік гісторыі, каб кожны ведаў, што такое 25 Сакавіка ці бітва пад Воршай і да т.п., то паняцьце «вызваленьне Беларусі» ўспрымалася б паіншаму, а псыхалягічная і ідэалягічная база рэжыму звузілася да мінімуму, мабілізацыйная гатоўнасьць моладзі была б максымальнай. **Рэжым перасталі б заўважаць**, што азначала б яго палітычную сьмерць.

Гэта, вядома, прыгожая фантазія. Сёньня можна прапанаваць толькі малое, але рэальнае. Давайце для пачатку аб'явім **свой** Дзень беларускага Сьцяга і Гербу. Гэта **19 верасьня** — дзень абвяшчэньня Бел-чырвона-белага сьцяга і гербу «Пагоні» дзяржаўнымі ў 1991 г. Хай у гэты дзень усе актывісты і пэсымісты пачэпяць на вопратку значкі, хай адважныя вывесяць нашы сьцягі, запусьцяць шары, аклеюць гарады налепкамі… Калі ў гэты дзень незнаёмыя людзі па значках убачаць адзін у адным **беларуса,** а значыць **свайго** — хоць трохі стане цяплей на душы. А нехта чужы хай затрасецца ад злобы.

Ігар (пэсыміст), 41 год, Менск

Ад Рэдакцыі. Тэмы, якія клапоцяць Вас, трывожаць сёньня і многіх беларусаў. Досыць пачытаць хоць і падборку лістоў за апошні тыдзень. Падзяляем Вашы памкненьні, не падзяляем Вашага пэсымізму. У апошнія гады беларускае даказала, што ўмее выжываць і разьвівацца ў самых неспрыяльных умовах. Паралельнае грамадзтва якраз-такі стварылася там, дзе гэта ідзе ад патрэбаў людзей (некаторыя інтэлектуалы нават крытыкуюць яго ўтварэньне, называюць гэта памылкай, напрыклад палітоляг Віталь Сіліцкі, які сам да яго ў пэўным сэнсе належыць). Яно сапраўды напаўпадпольнае — а Вы чакаеце ад яго заўважнасьці. Зборы подпісаў, мітынгі, дэманстрацыі, выбары ў дваровыя рады — бяз гэтага яно таксама не абыходзіцца, гэта і фармуе яго традыцыі, мацуе салідарнасьць, нормы й правілы. І незалежны беларускі друк — нацыянальны й мясцовы, і незалежныя беларускія школы — Ліцэй тут самы слаўны прыклад, і незалежныя дасьледчыцкія ўстановы таксама выстаялі, хоць і задыхаюцца ад безграшоўя. Беларуская арганізаваная супольнасьць выпрабоўваецца капіталізмам, і яе выжываньне залежыць цяпер найперш ад заможнасьці яе ўдзельнікаў. Толькі цывілізацыйна вышэйшая супольнасьць будзе прыцягальнай для іншых, толькі заможныя людзі здатныя ахвяраваць грошы на разьвіцьцё культуры сваёй супольнасьці, як ахвяруюць курды ці баскі. Парадокс, што тыя — безьдзяржаўныя нацыі, беларусы ж маюць дзяржаву, а мусяць клапаціцца пра беларускую культуру самі, тым часам як афіцыйная лінія — гэтую культуру фальшаваць і абмяжоўваць. Друк і СМІ, адукацыя, навука — вось прыярытэты, якія патрабуюць Вашай дапамогі.

У Бога дзён многа, а памятных датаў у беларускім календары яшчэ болей. Каб і Ваша ідэя з Днём Свайго Сьцяга прыжылася (яе слабое месца — што яна як бы ў піку дню чужога сьцяга, тады як нацыянальны традыцыйна ўшаноўваецца ў Дзень Волі і Дзень Слуцкага Збройнага Чыну), мусова зьвяртацца да тых, каго Вы крытыкуеце, — партый, групаў. Бярыце публікацыю і ідзеце да іх. Толькі не спадзявайцеся на імгненны эфэкт. Пакуль слабыя СМІ і адукацыя, Вам цяжка будзе арганізаваць масавую кампанію. Але магчыма.

ВОДГУКІ

«Што беларусам даспадобы, тое для швэдаў…»

Цікава было прачытаць артыкулы сп.Гусачэнкі пра швэдзкія прыгоды, асабліва таму, што мне самой давялося правесьці ў тым самым горадзе Вэкшэ амаль два тыдні, таксама па студэнцкім абмене. Мяне таксама шмат што ўразіла ў гэтай краіне, але некаторыя факты ў артыкуле — перабольшаньні, і ў чытача можа скласьціся ўражаньне, што на швэдзкай мяжы стаіць апостал Пётра і адчыняе ўсім ахвотным браму ў рай.

Насамрэч усё інакш. Крымінал і там крымінал, ровар можна пакідаць незамкнёны, але раней ці пазьней яго скрадуць, дарэчы, бывае, што й з замком крадуць. Нават такая дэталь: замак для студэнтаў і выкладчыкаў усё ж быў пабудаваны ня восем гадоў таму, а ў 1908 г.

Сп.Гусачэнка хоць і быў шчыры, але ж падаваў матэрыял, нібы замарожаныя селядцы папуасам. Шмат якія пачуцьці ў нашым абмене былі падобныя да ягоных. Мае вочы бачылі і той Кронабэрг, і Гётэбарг, і Мальмё, і Стакгольм: жывуць там тыя ж людзі, але паўночныя і вельмі культурныя.

З павагай, Ганка Ш.

Прыгажосьць толькі зьверху

Тэлевізар. Нечы голас расказвае, як беларускія апазыцыянэры хочуць захапіць уладу ў свае рукі. З экрану на мяне глядзяць ці то немцы, ці то сучасныя беларусы. Якіх Лукашэнка назваў «адмарозкамі». Жах ды й толькі. Але жахліва становіцца не ад таго, што людзі нешта спрабуюць зрабіць з уладай аднаго чалавека, а ад таго, як гэта ўлада змагаецца зь імі.

Улада, якая пабудавана на жаху ўсіх перад адным. Гісторыя памятае такія выпадкі, але яна памятае і чым яны скончыліся. Некалі людзі спытаюцца: «А што далей?» А далей казка, якая пачыналася са стрэлаў па будучым прэзыдэнту, скончыцца.

А цікава, ці знайшлі тых, хто страляў тады? А можа, яны побач з Лукашэнкам цяпер? Упарадкоўваюць краіну — агароджваюць дарогі. Каб было ўсё прыгожа. Але гэта прыгажосьць толькі зьверху. А зазірнуць глыбей — як хадзілі ў «дзераўнях» у драных спадніцах, так і ходзяць, ды яшчэ трасуцца ад жаху, што прыйдуць амэрыканцы і забяруць апошні гной, што за хлевам застаўся. А што больш браць у нас?

Якубоўскі, Ворша

Пра свастыку й ідэалёгію

Ехаў надоечы ў гарадзкім аўтобусе. На адным зь сядзеньняў чорнай фарбай намаляваны вялікі фашыстоўскі крыж. Аніхто не абураўся. Усё ціха — ціп-топ, нібыта так і трэба, нібыта гэтак заўжды і было. Відаць, гэтая свастыка ў аўтобусе ўжо ня першы дзень.

Хутчэй за ўсё, намалявалі гэты крыж зусім не ідэалягічна падкаваныя на «Майн кампф» нэафашысты і не брытагаловыя РНАшнікі, а звычайныя смаркачы з 6—8 клясаў, якім папросту няма чым заняцца.

Неаднаразовыя нападкі вандалаў зьведвалі і барысаўскія габрэйскія могілкі. І там справа зусім не ў скінхедах. Ведаў аднаго хлопца, які распавядаў мне, як ён зь сябрамі «весела» праводзіў час на тых могілках. Калі я спытаў, на якую трасцу ён бурыў надмагільныя помнікі, ён ці не са «сьвятой» шчырасьцю адказаў: «Дык гэта ж прыкольна!»

Зьяўленьне свастыкі ў аўтобусе папярэднічала сьвяткаваньню 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі, якое прадстаўнікі ўлады абяцалі адзначыць супэрпампэзна. На ідэалягізацыі і міталягізацыі мінулай вайны будуецца падмурак сучаснай дзяржаўнай ідэалёгіі, якая апошнімі гадамі сілай насаджаецца моладзі праз піянерыю і БРСМ. Прымус натыкаецца на супраціў у юначых галовах. Улада безь перапынку падкрэсьлівае сваю духоўную повязь з «нашымі», таму бунтарам не застаецца нічога іншага, як перайсьці ў лягер ворага.

Ніякая ідэалёгія ня можа быць насаджана прымусам зьверху. Яна павінна быць зразумелай кожнаму грамадзяніну краіны з маленства. Магчыма, я гавару ў нечым банальныя рэчы, але найперш ідэалёгія павінна грунтавацца на мове, гісторыі, культуры, традыцы тытульнай нацыі, а не на сумнеўнай чужой гісторыі.

Вось у такой атмасфэры абыякавасьці і сустрэў Барысаў Дзень Рэспублікі. Спадзяюся, што ўрэшце замажуць свастыку, а то, далібог, сорамна перад вэтэранамі. Надпісы «Зубр» вунь жа як хутка зафарбоўваюць.

Зьміцер Панкавец, Кастрыца

ХРОНІКА

Актывіста «Зубра» **Аляксандра З.** затрымалі ў Менску 21 чэрвеня за распаўсюд улётак. 22 чэрвеня ў Менску затрымалі «зуброўцаў» **Міхаіла К.** і **Людмілу М.** Падчас распаўсюду газэты «Супраціў» 23 чэрвеня затрымалі актывістаў «Зубра» **Дар'ю Малдаванаву**, **Міхаіла Аўдзеева**, **Яўгена Афнагеля**. 23 чэрвеня Менскі гаспадарчы суд адмяніў фінансавыя санкцыі, накладзеныя на **Беларускі Хельсынскі камітэт** нібыта за няўплату падаткаў са сродкаў па праграме TACIS. У аналягічным судовым працэсе слонімскага **ГА «Воля да разьвіцьця»**, які пачаўся 22 чэрвеня, судзьдзя Алег Кадач адхіліў хадайніцтва аб улучэньні ў матэрыялы справы дакумэнтаў, якія сьведчаць на карысьць арганізацыі. З ініцыятывы Міністэрства юстыцыі Саюз палякаў Беларусі 23 чэрвеня пазбавіў **Тадэвуша Гавіна** пасады ганаровага старшыні. У Наваполацку 24 чэрвеня падчас распаўсюду ўлётак супраць трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну затрымалі актывістаў кааліцыі «5+» **Зьмітра Салаўёва**, **Аляксея Трубкіна** (БНФ) і **Іну Барысевіч**. Жонку і дзяцей **Валер'я Леванеўскага** выклікалі 24 чэрвеня ў Ленінскую пракуратуру Горадні для дачы паказаньняў — усе яны адмовіліся даваць паказаньні супраць блізкага чалавека. «Зуброўцаў» **Барыса М.** і **Насту Ц.** затрымалі ў Менску 24 чэрвеня: яны расклейвалі плякаты зь лягатыпам руху. Судовае паседжаньне на пазоў журналіста **Валер'я Шчукіна** да старшыні Полацкага гарвыканкаму, прызначанае на 24 чэрвеня, адкладзена на няпэўны тэрмін: чыноўнік у газэтных публікацыях абвінаваціў Шчукіна ў нямужнасьці. Міністэрства юстыцыі падало ў Вярхоўны суд 24 чэрвеня пазоў на ліквідацыю **Беларускай партыі працы**, што ўваходзіць у Народную кааліцыю «5+»: арганізацыі закідаюць «парушэньне заканадаўства падчас разьмяшчэньня кіраўнічых органаў і арганізацыйных структураў у рэгіёнах». Актывісты «Зубра» **Максім С.**, **Любоў М.** і **Аляксей К.** былі затрыманыя 25 чэрвеня ў Менску падчас распаўсюду газэты арганізацыі. 25 чэрвеня **Свабодны прафсаюз Беларускі** падрыхтаваў скаргу ў суд на дзеяньні Наваполацкага гарвыканкаму: мясцовая «вэртыкаль» ужо год адмаўляе ў перарэгістрацыі структурам СПБ — Наваполацка-Полацкай рэгіянальнай арганізацыі, а таксама прафсаюзным суполкам Наваполацкай ЦЭЦ і ААТ «Нафтан». Сьледчыя КДБ 25 чэрвеня працягнулі тэрмін утрыманьня **Міхаіла Марыніча** пад вартай яшчэ на 2 месяцы. Актывістаў АГП **Вадзіма Ідэдэля**, **Яўгена Лукшу**, **Віталя Філіповіча** затрымалі 26 чэрвеня ў Горадні падчас правядзеньня апытаньня людзей наконт трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну. 27 чэрвеня 16-гадовага актывіста «Зубра» **Зьмітра Кучынскага** затрымалі ў парку Горкага ў Менску падчас распаўсюду газэты «Зубр»: у пастарунку капітан міліцыі Іван Жэбіт, са словаў хлопца, зьбіў яго за патрабаваньне скласьці пратакол асабістага надгляду. Юнак падаў скаргу ў пракуратуру. 28 чэрвеня патрабаваньне вызваліць займаныя памяшканьні атрымалі віцебскія гарадзкія партыйныя арганізацыі **АГП**, **ЛДПБ**, **БСДГ** і **БСДП (НГ)**, а таксама ГА **«Самакіраваньне ды грамадзтва»**. 29 чэрвеня Ленінскі раённы суд Горадні адхіліў скаргу галоўнага рэдактара газэты «День» **Міколы Маркевіча**: журналіст абскарджваў рашэньне адміністрацыйнай камісіі, якая пакарала яго за распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных зьвестак, хаця ў газэце ўсе зьвесткі былі. Суд Маларыцкага раёну 29 чэрвеня абвясьціў папярэджаньне дэпутату райсавету сябру БНФ **Уладзімеру Малею** за сустрэчу з выбарцамі: суд вызначыў яе як несанкцыяваны мітынг. Справа разглядалася ў адсутнасьць адказчыка. 28 чэрвеня ў Менску пры распаўсюдзе газэты «Зубр» затрымалі актывістаў арганізацыі **Паўла Юхневіча**, **Кацярыну Сьмірнову**, **Любоў Кучынскую** і **Рамана Казакевіча**: на ўсіх склалі пратаколы паводле арт.172 КаАП. Дэпутатам групы «Рэспубліка» **Валер'ю Фралову** і **Сяргею Скрабцу** 29 чэрвеня адмовілі ў памяшканьні для сустрэчы з выбарцамі Бабруйску. 30 чэрвеня ўступіў у законную сілу прысуд **Аксане Новікавай**: цяжарная жанчына асуджаная на 2,5 гады абмежаваньня волі. У кватэру каардынатара «Зубра» **Я.Афнагеля** 30 чэрвеня бяз ордэру наператрус уварваліся міліцыянты й невядомыя ў цывільным: падчасператрусу знайшлі ўлёткі «Свабоду Марынічу» і забралі «зуброўца» ў пастарунак. У Барысаве 30 чэрвеня затрыманыя «зуброўцы» **Сяргей Кунец** і **Андрэй Быркоў**, якія распаўсюджвалі газэту арганізацыі. 1 ліпеня ў Менску падчас распаўсюду ўлётак былі затрыманыя актывісты «Зубра» **Л.Кучынская**, **Сяргей Пейпаловіч**, **Аляксей Шыдлоўскі**, **П.Юхневіч** і **Андрэй Барашкаў**. 1 ліпеня ў Маладэчне ня выйшаў нумар газэты **«Неделя в Молодечно»**: мясцовая друкарня адмаўляецца друкаваць выданьне пасьля публікацыі вялікага (на ўсю паласу) партрэту Станіслава Багданкевіча, які прыяжджаў у горад на сэмінар для прадпрымальнікаў і кіраўнікоў дзяржпрадпрыемстваў. 30 чэрвеня КДБ пачаў разбор паводле ліста сустаршыні прафсаюзу РЭПАМ **Генадзя Фядыніча**: старшыня Назіральнай рады ААТ «Рытм» (Гомель) Ю.Валюк прымушаў работнікаў прадпрыемства выйсьці з РЭПАМу, пагражаючы перасьледам з боку КДБ. 1 ліпеня на сталічным рынку «Ракаўскі кірмаш» ахова затрымала старшыню ГА прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва» **Анатоля Шумчанку**: заламаўшы рукі, яго зацягнулі ў сутарэньні, дзе пратрымалі гадзіну. Уначы з 1 на 2 ліпеня ў пад'езьдзе свайго дому быў зьбіты **В.Фралоў** і ягоны шафёр: невядомыя ў масках забралі ў яго партфэль з дакумэнтамі. У Мёрах 2 ліпеня за распаўсюд улётак з партрэтамі зьніклых палітыкаў затрымалі сябра АГП **Віктара Шульгу**: у яго адабралі ўлёткі й сьпіс мёрскіх сяброў АГП. У Быхаве 2 ліпеня падчас раздачы ўлётак затрымалі актывістаў «5+» **Уладзімера Шанцава** (АГП) і **Анатоля Заўялава** (ПКБ). 2 ліпеня падчас распаўсюду газэты «Зубр» затрымалі актывістаў арганізацыі: у Баранавічах — **Алену Шпіронак** і **Юлію Аўгусьціновіч**, у Менску — **Дар'ю Малдаванаву**, **Кацярыну С.** і **Л.Кучынскую**. Падчас правядзеньня апытаньня наконт трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну ў Наваполацку 3 ліпеня затрымалі прадстаўнікоў «5+» **Алеся Карніенку** (АГП) і **Аляксея Лукашэвіча**. 5 ліпеня **Партыі БНФ, АГП, БСДГ** атрымалі папярэджаньне ад Мінюсту за заклік узяць удзел у «Ланцугу неабыякавых чытачоў» 10 чэрвеня ў падтрымку «Народнай волі». 6 ліпеня ў Нясьвіжы быў затрыманы на тры гадзіны актывіст кааліцыі «Маладая Беларусь» **Мікола Арцюхоў**. 6 ліпеня міліцэйскі патруль затрымаў намесьніка старшыні Партыі БНФ **Аляксея Янукевіча**, сакратара Ўправы Партыі БНФ **Андрэя Саротніка** і сябра Сойму **Сяргея Салаша**, якія раздавалі ўлёткі Народнай кааліцыі «5+» працоўным МАЗу, якія вярталіся з другой зьмены.

АШ

Магілы ворагаў

Праходзячы міма амбасады Нямеччыны ў Беларусі, зьвярнуў увагу на разьмешчаныя на шчытах фатаздымкі. На картачках — дагледжаныя могілкі савецкіх воінаў, пахаваных на тэрыторыі Нямеччыны.

І якраз на гэтым тыдні радыё «Свабода» прапаноўвае сваім слухачам адказаць на пытаньне, ці трэба ў Беларусі парадкаваць нямецкія могілкі. Гэтая справа, як вядома, рухаецца вельмі марудна і цяжка. Галоўная перашкода — супраціў нашых вэтэранаў. Маўляў, немцы прынесьлі на нашу зямлю гора, а мы будзем даглядаць іхныя магілы! А тым больш што нашы ўласныя салдаты яшчэ далёка ня ўсе пахаваныя належным чынам. Можна зразумець гэтае пакаленьне. Але калі ўлічваць хрысьціянскую мараль, то, безумоўна, і мы павінны паставіцца да нямецкіх ахвяраў вайны проста па-людзку. Яны такія ж ахвяры, як нашыя дзяды і бацькі. Воляй свайго дыктатара Гітлера яны былі адарваныя ад сем'яў і кінутыя ў жорны вайны.

Добра, што маем ужо першыя прыклады павароту ў лепшы бок у гэтай справе. Высылаю вам два здымкі нямецкіх могілак у Беларусі. На здымку — пахаваньні нямецкіх (і іншых) салдат на могілках вёскі Тарасава, што пад Менскам. Да стварэньня гэтых нямецкіх могілак спрычынілася дзяржава. Недзе на пачатку 90-х да сустрэчы моладзі Беларусі і Нямеччыны было прымеркаванае адкрыцьцё гэтых могілак.

А вось гісторыя стварэньня могілак, што на ўскрайку Магілёва, у раёне аўтазаводу імя Кірава, там, дзе горад пераходзіць ва ўрочышча Любуж, зусім іншая. Тут, на высокім беразе Дняпра, у двухпавярховых дамках месьціўся нямецкі шпіталь. Тых хворых і параненых, якія не выжывалі, хавалі тут жа ў лесе. Адразу пасьля вайны, як распавядаў мой бацька, тут было шмат пагорачкаў з крыжамі. Крыжы пазьней зьнесьлі, а пагорачкі пачалі зарастаць. І мы падлеткамі бегалі туды ў арэхі. Так і казалі: «Пойдзем у арэхі на нямецкія могілкі».

Але вось аднойчы ў Магілёў прыехаў немец сталага ўжо веку. Ён, як аказалася, быў цяжка паранены і лячыўся ў тым шпіталі. На ягоныя грошы магілёўскімі ўладамі (яшчэ адзін добры знак) гэтыя могілкі былі адноўленыя. Цяпер яны абнесеныя мэталічным плотам, пасярэдзіне стаіць крыж і помнічак з чорнага мармуру. Пабудаваная невялічкая каплічка.

Кажуць, што гэты немец яшчэ шукаў тут беларускую жанчыну, якая працавала доктаркай у тым шпіталі, выхадзіла гэтага немца і выратавала яму жыцьцё. Ён хацеў аддзячыць ёй за гэта. На жаль, яна ўжо памерла, дык ён таксама паставіў помнік на яе магіле.

На жаль, я ня ведаю прозьвішчаў ані гэтай жанчыны, ані немца. Распавядаю гэта са словаў сваяка, інжынэра-будаўніка, які кіраваў будаўнічымі работамі на могілках.

Вядома ж, я не заклікаю ўшаноўваць памяць немцаў, што загінулі. Гэта сапраўды было б кашчунствам. Але думаю, карона не спадзе з нашай галавы, калі пераадолеем сябе і будзем хоць бы ўтрымліваць у больш-менш прыстойным стане магілы памерлых — як сваіх герояў, так і сваіх былых ворагаў.

Лявон Гуменьнікаў, Менск

Закахацца ў Фігу

эўрачэмпіянат поплеч з мужам

Тацяна Сьнітко

Я засякла час па гадзіньніку: мы з мужам прабалбаталі пра футбол паўтары гадзіны. Які жах! Колькі змарнавана часу! І кожны дзень паўтаралася тое самае — аж да 5 ліпеня. Бо сэрцу не загадаеш...

Мы, беларусы, мірныя людзі, што мы ведаем пра Партугалію? Мова — як у бразыльскіх сэрыялах. Ведаю сталага веку жанок, якімі Эўра-2004 праглядаецца як працяг дзённых сэрыялаў. Таму адна мая сяброўка думае, што Раналду — гэта той жа пацан, што і Раналдзіньё. Проста пераехаў і гуляе. Калі я распавяду сяброўцы, хто насамрэч адкуль пераехаў, яна будзе сьціслай: пляваць ёй на Дэку, выспу Мадэйру — на ўсё. Між тым цікава, што насельніцтва ў Партугаліі амаль столькі ж, як і ў Беларусі, а сама краіна, выцягнутая ўздоўж Атлянтыкі, нейкім чынам захавалася як нацыя ў суседзтве з самай жорсткай заваёўніцай Гішпаніяй... Ды яшчэ пасьпела калянізаваць ладную частку кантынэнтаў. А колькі на мапе сьвету сёньня партугальскіх імёнаў! Краіна маракоў і першаадкрывальнікаў, абаронцаў і заваёўнікаў.

Тэлевізары ў вокны

Без футболу на сьвеце было б нашмат болей войнаў. Нездарма найлепшыя вынікі ў гэтым спорце маюць стабільныя, разьвітыя краіны, у якіх не назіраецца палітычных і эканамічных катаклізмаў. Упадкаў эканомікі, рэвалюцыйных сытуацый, іншых прыкметаў нестабільнасьці. І заўзятары менавіта з гэтых краінаў — самыя актыўныя. Яны могуць з чыстым сумленьнем прапусьціць выбары ў Эўрапарлямэнт, забыць на тэрміновую працу ды іншыя складнікі неабходнага падтрыманьня жыцьцёвай стабільнасьці. Для некаторых народаў футбол увогуле — элемэнт нацыянальнай ідэі, хоць гэта мае розны падтэкст і па-рознаму праяўляецца. Скажам, ангельскія хуліганы, арыштаваныя ў Партугаліі за беспарадкі пасьля разгрому ўлюбёнай зборнай, па-свойму абаранялі свой нацыянальны гонар — так, як беларусы некалі абаранялі свой гонар на вуліцах Менску. І хоць футбол тады быў ні пры чым, сутнасьць падобная. Закранутая годнасьць — зашкалілі і перахліснулі праз край эмоцыі. А тут яшчэ гэты «комплекс выдатніка» ў ангельскага футболу... Адзін аблом — і выдатнік пачуваецца нікчэмнасьцю.

Муж неяк нагадаў, што італьянцы з гішпанцамі часам выкідаюць у вокны пасьля пройгрышу сваіх камандаў тэлевізары, а часам — жонак, якія перашкаджаюць сваёй балбатнёй глядзець важную футбольную сустрэчу. Сапраўдны італьянец дзеля футболу гатовы на ўсё.

Асаблівае значэньне мае футбол у вызваленых краінах былога сацлягеру. Маладая дзяржава Харватыя бярэ ўдзел у кожным чэмпіянаце і ўжо ў 1998-м становіцца бронзавым прызёрам. Усе экс-Саветы глядзелі на Латвію, а сама Латвія глядзіць на сваю каманду, якая гуртуе нацыю вакол футболу лепей, чым маглі б гэта зрабіць латыскія палітыкі. Зноўку бітая, ужо па нейкай шматгадовай завядзёнцы, Расея, наадварот, адчувае сваё прыніжэньне. Ня ведаю, што адчуваюць італьянцы, якія ўжо другі раз запар падводзяць. На мінулым Эўра французы забілі ім пераможны гол літаральна на апошніх хвілінах. (Мой муж кажа, што яны — «халяўшчыкі».)

Паказаць бы ім Беларусь

Суседні столік у кавярні, дзе мы глядзелі той матч, ад радасьці так моцна падскочыў, што французкія балельшчыкі перавярнулі два сталы, абліўшы нас нашымі ж напоямі з адкаркаваных бутэлек. Гэта было ў Кіеве і мы глядзелі гульню пад дахам толькі таму, што ліў дождж і ў сябра-земляка ня мелася тэлевізара. Звычайна ж сустракаліся на Майдане Незалежнасьці, насупраць вялікага таблё, дзе разам з сотнямі такіх жа балельшчыкаў пілі піва, колу, каву, сок, дзяліліся ўражаньнямі... Нехта штодня абавязкова пытаўся, ці ёсьць такое месца і такое таблё ў цэнтры Менску, а калі не — чаму. А што, калі б мы цяпер не ўтаропіліся ў футбол, а дапамаглі галадоўшчыкам, дык хутчэй зьявіліся б футбольныя тусоўкі на Кастрычніцкай плошчы і шмат што іншае? Скажам, камэнтатары, якія за кожным словам ня тычуць табе ў вочы праблемамі сваіх любімых камандаў... Наўрад ці. Электарат трэба далучаць да сьвету, а не адрываць. Уключэньне зь якога-небудзь Эстадыю да Луш — гэта далучэньне да сьвету. Радуюся за эўрапейскіх балельшчыкаў: тут яны б гэтак не павыпендрываліся, у нас «парадак»... Вось перасунулі на дзьве гадзіны адзін паўфінал — глядзіце Хатынь, потым па ўсіх каналах — былы сталічны Дзень гораду, ператвораны невукамі ў «Дзень незалежнасьці»... Вось з чаго пачынаецца фашызм: цябе пазбаўляюць выбару.

Калі я ўпершыню апынулася ў Заходняй Эўропе, замежнікі пазнавалі маю краіну толькі па менскім «Дынама». Гэта не перашкодзіла служачым пункту абмену валют прынесьці мне маленькі глёбус і папрасіць паказаць на ім Беларусь. Пашпарт падаўся дзіўным. Грошы б не памянялі.

Мы амаль нічога ня ведаем пра Партугалію, але ўжо ня дзівіць раптоўнае жаданьне вывучыць мову гэтай маленькай нацыі — такую блізкую да гішпанскай, толькі больш шыпячую і з рысачкамі, кшталту як у нас мае «ў»... Што павінна адбыцца, каб партугальцы захацелі вывучыць нашу мову, а работнікі банкаў даведаліся пра Беларусь? Рэвалюцыя? Чэмпіянат? Напэўна ж, не вайсковыя парады...

Коні на стадыёне

...Едучы па сваім Юзуфове на ровары ў шапік па каву, назіраю тры кані на нашым вясковым стадыёне. Колькі ні ездзі і ні хадзі, нічога новага тут не пабачыш — зьмяняецца толькі колькасьць коней. Гэта бачыцца сапраўдным сымбалем сёньняшняга стану айчыннага футболу. За год з гакам я ніводнага разу ня бачыла ў Юзуфове гульцоў хоць у што зь мячом. Паўз наш дом часта езьдзяць спартоўцы-вэлясыпэдысты, за вёскай скачуць зь верталёта парашутысты, уздоўж вуліцы прабягае трушком незнаёмы дачнік — гэта ўсё так, гэта здараецца. Але гэтага неяк мала. І пакуль на футбольных палях у нас будзе пасьвіцца быдла, нічога нам ня сьвеціць ні ў местачковым, ні ў агульнанацыянальным маштабе. Патрэбныя ня толькі грошы, на недахоп якіх наракае кожны першы ініцыятар чаго заўгодна новага ў нашай краіне. Патрэбна найперш зладжаная агульнанацыянальная праграма. Прэстыж спорту мусіць быць значна падвышаны найперш сярод так званых простых грамадзянаў, каб яны ў вольны час ня толькі піліпалілі-ляжалі-на-канапе.

У беларускім спорце і стаўленьні да яго звычайнага чалавека, які не належыць да сьвету вялікага спорту, назіраецца нейкі абсурд. Лядовыя палацы растуць як грыбы, але няма ніводнай установы, дзе было б ня сорамна заўтра правесьці сусьветныя спаборніцтвы. Няма адпаведнай інфраструктуры эўрапейскага ўзроўню. Куды пасяліць усіх замежнікаў — пытаньне для клюбу знатакоў. Спартовае ведамства ўзначальвае былы міліцыянт, дзякуючы якому нас, журналістаў, закідалі ў кратаваныя аўто. А спорт жа існуе не на Мясцы — атмасфэра тут мала адрозьніваецца ад агульнай беларускай. Спроба падняць на стадыёне сьцяг бязь зелені толькі, бадай, у нас на Бацькаўшчыне здольная ўспрымацца як сур'ёзная палітычная акцыя. Гэтая абсурднасьць прыгнятае. Думаецца, нашыя найлепшыя спартоўцы праводзяць большую частку году ў замежжы ня толькі дзеля добрых заробкаў.

Расчараваны Люіс Фіга пакідае поле ў часе гульні Партугалія—Грэцыя.

Інь і Ян па-футбольнаму

Я шчыра лічыла, што чэмпіянат выйграюць ангельцы, і разгублена чакала дня народзінаў сяброўкі. Ну скажыце, ці ня дзіка гучыць фраза: «Прабач, віншую, не прыйду: у мяне Партугалія—Англія»? Калі б сяброўка хоць краем вока зірнула ў тэлевізію, яна знайшла б для сябе шмат цікавага. Нават ня цямячы ў тым футболе. Больш за 22 мужыкі (лічачы арбітраў) бегаюць па траве ў трусах, і палова — пісаныя красаўцы. Прычым пад красаўцамі я маю на ўвазе — ня толькі прыгажуны. Хлопцы ж яшчэ зьдзяйсьняюць подзьвігі. Дык, халера, што яшчэ трэба для жанчыны?!

Ну хіба толькі магчымасьць паглядзець на тое безь перашкодаў з пачатку да канца. Ды ў добрай кампаніі — зь людзей, якія на тваё пытаньне: «Ці ты глядзіш футбол?» — ніколі не адкажуць: «У сэнсе — адмыслова?».

Мужчыны й жанчыны глядзяць футбол па-рознаму. Я ніколі не змагу патлумачыць, чаму заўсёды хварэю за «Ювэнтус» і за зборныя Чэхіі ды Італіі. Чаму пасьля матчу з гішпанцамі зноў рэзка палюбіла зборную Партугаліі. Жаночае спачуваньне тым, хто напачатку прайграе і мусіць адыграцца?

У мужыкоў усё інакш. Мой муж дакладна раскладзе па палічках прычыны сваёй прыхільнасьці да ангельскага футболу і халоднасьці да францускага. Прыкладна гэтак жа зробіць мой бацька. Мужчыны найчасьцей абіраюць любімыя каманды розумам паводле крытэраў тэхнічнасьці. Мы абіраем іх сэрцам, але, праўда, не заўсёды па тварах гульцоў, яшчэ па манерах на полі... Ды чорт яго ведае па чым! Вось раз спадабаліся мне сьцяг і гімн Бразыліі... Зрэшты, ня трэба пра гімны! Калі пасьля другога матчу ў групах адразу, безь пераходу, грымеў першы акорд гэтай савецкай мэлёдыі, рука сама націскала на пульт: міжвольнае бегства ад нашай ізаляцыі, жаданьне не сапсаваць уражаньня ад Эўропы.

Чэх Мілан Бараш — найлепшы бамбардзір Эўра-2004.

У адрозьненьне ад мужчыны, жанчына ніколі ня стане крычаць у экран з матчам: «Прачніся, дурань, забіваць трэба!», «Куды ты лупіш, ёлуп? Як ты мог!» Жанчына будзе вохкаць, пакуль ня скажа камэнтатару Баранаву: «Пайшоў ты са сваім Ністэльроем!» І хаця налепка з найлепшым галяндзкім бамбардзірам вісіць у яе дома на сьцяне, палюбіць чамусьці Партугалію (а мо Чэхію? Грэцыю?) і закахаецца ў Фігу. Хоць розум кажа ёй, што Фігу ня сьвеціць ні фіга, а каханьне міне дакладна 6 ліпеня а 8-й ранку. Што ня факт яшчэ перамога ўлюбёнцаў на Эўра... Якая розьніца?! І жанчына ня слухае розуму. Яна часова страчвае яго, бы стукнутая мячыкам. Калі нашыя мужы самі — ня зоркі футболу, яны звычайна толькі вітаюць пачуцьці жонак да Клюйвэрта, Дэль П'ера, Нэдведа, Руя Кошты... Хіба такое часта сустрэнеш у рэальным штодзённым жыцьці?

Зьдзівіла, што галы часьцяком пулялі ў вароты супернікаў амаль дзеці. Часам гэта былі іхнія другія ці нават першыя гульні ў зборнай сваёй краіны. Руні ў ангельцаў, Крышты яну Раналду ў партугальцаў, Хайнц у чэхаў... Разам зь нечаканым для многіх вылетам аўтарытэтаў — гішпанцаў, італьянцаў, а назаўтра ўжо й немцаў! — ды ўдалым выглядам латышоў, ды яшчэ на тле ўзьлёту грэкаў выразна праглядаецца галоўная тэндэнцыя. Ідзе да зьменаў у кантынэнтальным футболе — зьменаў фаварытаў, новых зорных генэрацыяў... Гэта надае футболу цікавасьці ды азарту. І гэта абнадзейвае. Калі-небудзь перамены абавязкова дойдуць да Беларусі.

А пакуль застаецца толькі пусьціць сьлязу — разам з Крышты яну.

Грэкі шалеюць.

Лазьня №4

Лета ў Гомелі ў чацьверты раз адзначаецца вялікім хардкор-сэйшэнам «Mass Medium»

Цяпер у Беларусі модна йграць кор. Чаму? Дзецям трэба мяса: арганізм такі. Пад яго прасьцей у стралялкі гуляцца альбо пераражываць цяжкую задушлівую бытавуху вакол. Дырэктар пляжу, начальнік усяго гэтага фэсту-бязладзьдзя — «Павук» з гурту «Rasta». «Rasta» — гэта сур'ёзна. Гэта як ФК «Гомель». Хлопцы могуць падпаліць моладзь, цікавасьць да сябе падтрымліваюць. Горад думае, ці гэта «Harley» ў Зьмітра, аднаго з вакалістаў, і ці ён сапраўдны альбо вытачаны на Сельмашы. Не, гэта ня «Harley» і не зь Сельмашу, гэта «Suzuki».

Іншая коравая зорка, «TT-34», мерапрыемства прапусьціла. Сярод адносна новых коравых бандаў можна выдзеліць «ZV!K» — новы enfent terrible гомельскай рокавай тусоўкі. Гэтыя тры банды плюс яшчэ «M.L.A.» і «КОНТУР» лёгка могуць задаволіць коравую аўдыторыю. У іх ёсьць што сказаць. Што не падабаецца, дык гэта пляжныя хлопчыкі, якіх шмат зьявілася апошнім часам. Яны хочуць іграць прыгожую і цяжкую музыку, выглядаюць проста цудоўна. MTV.

Шырока высунуліся панкі. Лепшыя тут, пасьля зьнікненьня «Мандражу», «Ацетилен». Панк з дабаўленьнем ска. Без палітычнай напругі — песьні аб праблемах, якія хвалююць усіх, сьмех з праблемаў, якія ўсіх хвалююць. Тэксты бяз лаянкі. «Мумифицирова(н)» — модная фішка. Мінімалізм. У гурце толькі бас-гітарыст і бубнач. «Гараж (104)» — каліфарнійскі панк з ідыяматычнымі словамі.

Усё пачалося 2 ліпеня а 15-й. Клюб «Адрэналін». Пераднавальнічная пахмурная сьпёка не абяцала нічога добрага. Народу сабралося больш, чым на любым гомельскім апазыцыйным мітынгу. Можна сказаць, без спазьненьняў выпусьцілі першых. «Мумифицирова(н)», «Liberum Veto», «Гараж (104)»... Не згадаў вышэй пра «Tonatos» — таксама хардкоравая банда. Гурт не ўмяшчаецца ў стылістычныя рамкі. Хлопцы любяць джаз (і йграюць яго проста на вуліцы, для ўсіх). Падключаюць духавыя, гармонік, але гэта ня брэгавіч-кор а la «Zdob si zdub».

«Адрэналін». Лета. 3-і паверх. Вокны зачынены. Жах. Лазьня. Дыхаць цяжка. Выратаваньне ад духаты альбо ад нелюбімга гурту шукалі на ніжніх паверхах: у каго былі грошы — у бары на другім, астатнія — ніжэй і ў сутарэньнях. ДК «Фэстывальны» (былы ДК Хімікаў) ператварыўся ў нефармальны стракаты мурашнік. Ахова напружана назірала за беспарадкам і чакала, калі гэта нарэшце скончыцца. Мерапрыемства падыходзіла да кульмінацыі, калі выйшлі «Stormhold» — новы гурт Нажа (славуты вакаліст «Gods Tower»). Натоўп падцягнуўся бліжэй. Тады, напэўна, заля была найбольш поўнай. Але народ пачаў стамляцца. Столькі цяжару й фізычнай напругі (музычка ўсё ж рухавая, да таго ж і дружныя рабяты скіны не даюць расслабіцца) ня кожны вытрывае. Нарэшце пачалі зьяўляцца хедлайнэры.

«Thelema», «Ацетилен». Саўнд стаў цяжэйшы. Панк. Кор. «Grenover» — сюрпрыз. Госьці зь Піцеру. Піцерцы былі разыграліся, але іх своечасова спынілі. Ladies&gentlemen… «Rasta». Усе, хто вытрываў, вядома, сабраліся. Але колькі ж народу так і не дачакалася. Зашмат на адзін дзень. Што ж, як выказаўся вакаліст, лазьня №4 завяршылася. Зь лёгкай парай! Ці, правільней, па-беларуску, лёгкі дух! Па-беларуску, дарэчы, было няшмат. Хіба Нож выгукнуў «Жыве Беларусь!».

Чаго не хапае. Вядома, каго-небудзь зь іншага рэгіёну. Усе добра ведаем пра выдатныя рок-фэсты недзе там у Ангельшчыне, Даніі ці ў ЗША. А што ў нас? У нас ёсьць горад-герой Менск. Яшчэ Басовішча... недзе ў Польшчы. А так... Фэсты ў нас ёсьць і даволі цікавыя, але ўсё ў межах, у найлепшым выпадку, рэгіёну. Стылістычнай разнастайнасьці таксама не зашкодзіла б.

Сярод зусім новых камандаў адзначу «Glofira». Хлопцы спрабуюць прасунуць тут брытанскі саўнд, накшталт «Placebo» ці «Muse». Тут прыдаліся б клюбы, але колькі іх ёсьць — «Адрэналін» з «ГЦК» ня ў стане задаволіць усе патрабаваньні. Ці не на кожнай новай афішы — новыя назвы. Адна з асноўных праблемаў — грошы. Ненармальна, калі музыкі, акрамя таго, што граюць, займаюцца яшчэ пытаньнямі адміністрацыйнымі, выпускаюць альбомы, ладзяць канцэрты. Але хопіць грузіцца. Выбары … Ой, не. Вакацыі.

Андрэй Ананьеў

Мілітарысцкае яечка

«Ты памятаеш, Алёша?» ў Тэатры беларускай арміі.

Падзеяй, што сабрала лысых ды голеных, патлатых ды абскубаных, стала адкрыцьцё Тэатру арміі ў Доме афіцэраў, заснаванага з мэтай «патрыёпцічаскага выхаваньня моладзі» ды разьвіцьця культуры.

П'еса мэтра Дударава «Ты памятаеш, Алёша?» створаная ў стылі клясычнага адзінства часу (эпізод з другой сусьветнай), месца (Магілёў) ды дзеяньня. Абарона гораду. Рэшткі арміі ціснуцца ў акопах. Толькі камкор ведае, што іх справа безнадзейная. Усе лыкаюць ня звыклы сьпірытус, а недавезены да немцаў каньяк, ворагам — пляшкі з кактэйлем Молатава — ды абмяркоўваюць нямецкіх тэарэтыкаў. Згадваецца цацачная дзяржава (адзін немец, адзін камісар, адзін камкор…). З аднаго боку — гімны ды агромністая выява Беларусі ў сучасных межах, зь іншага — рэпрэсіі ды прыхаваная іронія да ўладаў («Таварышч першы заўжды першы»). Адзіны адносна беларускамоўны — здраднік ды напаўдэбіл Ляксей: уцёк, бо «спужаўся», апраўданы за зьнішчэньне гранатай машыны з-за кута (супрацьлегласьць мужнаму камкору Аляксею). Усё — на фоне надзеі на сьветлую будучыню ды славянафільскае ідэі. Закаханая сувязістка выклікае толькі пазяханьне (сэнтымэнтальныя бабулькі выкалупваюць хустачкі). Зрэшты, тэатар — яечка з падазроным патэнцыялам пад вайсковым шалупіньнем. Раптам яго падкінула нацыяналістычная зязюлька?

Болачка

Атляс гісторыі

У выдавецтве «Беларуская энцыкляпэдыя» выйшаў «Атляс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да нашых дзён». У кнігу, якая дапаўняе 6-тамовую «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», увайшло больш за 200 мапаў і схемаў. Самая раньняя мапа ў атлясе датуецца XVI ст. Наклад кнігі 5000 ас.

Фільм паводле Шамякіна

На кінастудыі «Беларусьфільм» распачалася праца над кінапраектам «Лясная баляда» паводле матываў твораў Івана Шамякіна. Фільм мае выйсьці да траўня 2005 г.

Памяці Солтана

У Берасьцейскім тэатры драмы і музыкі прайшла вечарына памяці кампазытара Ўладзімера Солтана. 44-гадовы аўтар легендарнай опэры «Дзікае паляваньне караля Стаха» загінуў у 1997 г., патрапіўшы пад машыну.

«Тэзаўрус» у Торуні

25—26 чэрвеня ў Торуні прайшоў VII Міжнародны экумэнічны фэст хрысьціянскай музыкі «Song of Songs». Беларусь на ім прадстаўляў рок-гурт «Тэзаўрус».

Матэйку знайшлі

У кракаўскай галерэі «Сукеньніцы» адбыўся паказ карціны Яна Матэйкі «Баляслаў Сьмелы са Сьвятаполкам каля Залатой Брамы ў Кіеве». Лічылася, што карціна згінула ў гады другой сусьветнай вайны, але нядаўна яна знайшлася ў прыватным зборы.

Самалёт Сэнт-Экзюпэры

Рэшткі самалёта Lockheed P38 Lightning, у якім загінуў Антуан дэ Сэнт-Экзюпэры, зьявіліся ў Музэі паветраплаваньня і касманаўтыкі ў Буржэ пад Парыжам (Францыя). Знойдзеныя яшчэ ў 1998 г., яны былі паднятыя летась з дна мора.

Далі-фальсыфікатар

У Хельсынкі закрылася выстава твораў Сальвадора Далі: 400 карцін і скульптураў могуць быць падробкамі. Паліцыя апячатала выставу пасьля заявы аднаго з пакупнікоў: ён засумняваўся ў сапраўднасьці набытай на выставе карціны. Вынікі экспэртызы будуць вядомыя праз некалькі дзён.

Помнік інтэлігенцыі...

У Маскве каля будынку фонду імя Сахарава зьявіўся помнік расейскай інтэлігенцыі, пацярпелай у гады таталітарызму, — «Працяты Пэгас»: крылаты конь ляціць над мноствам зазубраных шыпоў.

...і апосталу Паўлу

У мястэчку Какаб (Сырыя) у кастрычніку мае зьявіцца помнік апосталу Паўлу. Менавіта ў Какабе Хрыстос зьявіўся перад Паўлам. Помнік будзе ўяўляць зь сябе бронзавую фігуру апостала Паўла з кнігай Новага Запавету ў руках.

Пясочная Італія

У Бэльгіі на ўзьбярэжжы ўвесь ліпень будзе ісьці штогадовы фэст пясочных скульптураў. У сёлетнім фэсьце, прысьвечаным Італіі ды яе помнікам архітэктуры й мастацтва, бяруць удзел 70 скульптараў з 17 краінаў. Для іхных працаў вылучаная плошча, роўная тром футбольным палям, і 30 тыс. тонаў пяску. У Беларусі падобны фэст пакуль ёсьць сьвятаднаго энтузіяста — мастака Гэніка Лойкі.

Памёр дон Карлеонэ

У Лос-Анджэласе на 81-м годзе жыцьця памёр славуты актор Марлон Брандо. Сваю акторскую кар'еру ён пачаў яшчэ ў 1944 г. Найбольш вядомая ягоная роля — Віта Карлеонэ ў фільме Фрэнсыса Копалы «Хросны бацька», адзін з самых складаных і таямнічых небажыхароў Галіўду.

АШ

Пісаць пра Быкава

Наш Быкаў: Кніга ўспамінаў. Укладальнік Генадзь Бураўкін. —Менск: Кніга, 2004.

38 аўтараў пасьпелі пад адной вокладкай падзяліцца тым, што запала ім у памяць пры знаёмстве з выдатным Беларусам.

Будзем спадзявацца, што кніга «Наш Быкаў» — гэта толькі першы том праекту, які абавязкова будзе мець працяг. Спадзяюся, што ўжо напісалі ці пішуць свае згадкі альбо й эсэ пра самага вядомага ў шырокім сьвеце беларуса-гуманіста Сяргей ды Ірына Быкавы, Янка Брыль ды Сьвятлана Алексіевіч, Аляксандар Лукашук ды Якуб Лапатка, Крыстаф Гойбнэр ды — чаму б і не? — Вацлаў Гавал; урэшце, сам Генадзь Бураўкін, які ў рэцэнзаваным томе абмежаваўся толькі вытрыманым у традыцыйнай манеры словам «Ад укладальніка». Трэба пісаць пра Быкава, пакуль не пасьціраліся ў памяці дэталі, пакуль іх месца трывала не пазаймалі міты. Бо чым болей будзе праходзіць часу, тым болей будзе знаходзіцца быкаўскіх «сяброў» і «дабрадзеяў», што, не раўнуючы як у гісторыі з тым «бервяном Уладзімера Ільліча», захочуць ахвотна прыляпіцца да імя Быкава альбо хоць якім бокам прасьлізнуць усьлед за ім у Гісторыю.

Лявон Баршчэўскі

Віктар Купрэйчык

КАІСА

Купрэйчык. Народжаны ў Менску

Гэтага каржакаватага дзядзьку няцяжка прыняць за барца. Ён і ёсьць барэц, адно што дужаецца за шахматнай дошкай — на працягу чатырох дзесяцігодзьдзяў. Шахматы зьмяніліся, сталі кампутарна-прадказальнымі, а ён усё гэтак жа прадукуе ідэі, шукаючы ісьціну. Толькі ці ёсьць яна ў шахматах?

Стыль Купрэйчыкавай гульні апішуць ва ўсіх падручніках як непаўторны сваёй напорыстасьцю. Першы беларускі гросмайстар вандрує па сьвеце, вырываючы перамогі ў рознакалібэрных супернікаў. Асабліва яму ўдаецца сыцыліянская абарона за чорных. Яшчэ гадоў 20 таму канадзкі сябар выпусьціў кнігу выбраных партый Купрэйчыка, а ў аналягічным зборніку беларускіх аўтараў («Гульня без кампрамісу») назьбіралася больш за тысячу ўзораў творчага падыходу да шахматаў.

Характар у яго нялёгкі, кажуць многія. Былы камсамолец і актывіст рухаў «за мір ва ўсім сьвеце» адзіны сярод членаў Нацыянальнага алімпійскага камітэту прагаласаваў супраць абраньня іншага «актывіста» на старшыню НАКу. Летась, насуперак меркаваньню калегаў па фэдэрацыі, публічна заявіў, што беларуская мова надасьць папулярнасьці часопісу «Шахматы»… Здольны сесьці ў аўтобус і паехаць у Слонім, каб згуляць з тузінам аматараў у сэансе адначасовай гульні.

Як бы вы згулялі?

Пазыцыя з партыі Купрэйчык — Сакалоў А., 2001. Ход белых.

На пачатку ліпеня, якраз да 55-годзьдзя чэмпіёна Беларусі 1972 і 2003 г., менская шахматная школа на Ракаўскай арганізавала турнір па хуткіх шахматах у гонар Купрэйчыка. Насамрэч, лепшага віншаваньня для шахматыста не прыдумаеш. З вынікам 9 з 11 першым стаў Аляксей Аляксандраў — рэваншаваўся за няўдалае выступленьне на чэмпіянаце сьвету ФІДЭ ў Лібіі. На закрыцьці юбіляр раздаваў усім цукеркі ды кніжкі. А неўзабаве ў той жа 11-й школе распачаўся турнір, прысьвечаны настаўніку Купрэйчыка, выдатнаму беларускаму гульцу Гаўрылу Верасаву, пра які гаворка асобная.

ВР



Згадкі пра Акудовіча

14 ліпеня а 17-й у залі Пушкінскай бібліятэкі (вул.Гікалы, 4) адбудзецца творчая вечарына «Згадкі пра Акудовіча». У рамках акцыі — прэзэнтацыя кнігі Валянціна Акудовіча «Разбурыць Парыж». Удзел бяруць В.Аксак, А.Анціпенка, У.Арлоў, Ю.Барысевіч, Адам Глёбус, Джэці і В.Жыбуль, А.Клінаў, А.Хадановіч (вядзе імпрэзу) ды інш. Уваход вольны.

Хроніка вызваленьня

Да 23 ліпеня ў галерэі «Nova» (вул.В.Харужай, 16) экспануецца выстава «Хроніка вызваленьня» — матэрыялы з фондаў архіву кінафотафонадакумэнтаў. Апроч дакумэнтаў, у экспазыцыю ўлучаны мантажныя фатаздымкі і фотаплякаты тых часоў — узоры савецкага прапагандысцкага мастацтва. Уваход вольны.

Джаз-атмасфэра

У Тэатры юнага гледача **21 ліпеня** — Джаз-Атмасфэра. Дайва Старынскайтэ і квартэт. Дайва выконвае west coast jazz, боса-нову і джазавыя стандарты. Яе лічаць узыходзячай зоркай балтыйскага джазу. Пачатак а 19-й. Квіткі 10000—20000.

«Памяць» Леаніда Шчамялёва

У мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) ідзе выстава «Памяць». Уся сэрыя работ Л.Шчамялёва — апасродкаванае раскрыцьцё ваеннай тэмы. Пах малака і хлеба, пораху і крыві — настрой большасьці «ваенных» карцін пакаленьня майстроў, да якіх адносіцца і Леанід Шчамялёў. Выстава працуе да **15 верасьня**. Т.: 291-16-76.

Абвяшчаецца конкурс

творчых прац да 490-х угодкаў Вялікай перамогі пад Воршай (8 верасьня 1514 г.) Будуць вітацца творчыя працы:
у галіне літаратуры (верш, апавяданьне, нарыс, эсэ, лібрэта, сцэнар і інш.);
выяўленчага мастацтва (праект помніка, карціна, партрэт, плакат, мэдаль і інш.);
музыкі (песьня, кантата, сымфонія і інш.); ужытковай прыкладной творчасьці;
кінамастацтва (дакумэнтальны кіначасопіс, навукова-папулярны, мастацкі фільм); асобны конкурс-выстава дзіцячай творчасьці.
Конкурс працягнецца да верасьня 2004 г.
Адрас: г.Менск, вул.Рэвалюцыйная, 15, 2-гі паверх, Скарынаўскі цэнтар, пакой №4.

Нацыянальны аргкамітэт па сьвяткаваньні

Эксьлібрыс

У Музэі сучаснага мастацтва (Скарыны, 47) **да 26 ліпеня** можна паглядзець выставу «Эксьлібрысы Міколы Рыжага».

Марк Шагал і сцэна

Да 12 верасьня ў Мастацкім музэі экспануецца выстава «Марк Шагал і сцэна». Квіткі 3000.

Джазаманія

16 ліпеня ў клюбе-рэстарацыі «Гудвін» (Скарыны, 19) — сяброўскі джэм-сэйшн, на які зьбяруцца вядомыя музыкі і пачаткоўцы, выканаўцы фанка, сьвінгу, фьюжн, баса-новы і блюзу. Т.: 226-13-05, 625-13-03

Быў месяц ліпень

Да 2 жніўня ў Музэі гісторыі і культуры экспануецца фотавыстава «Быў месяц ліпень» фатаклюбу «Менск» сумесна з Музэем гісторыі і культуры Беларусі. Рэпартажныя здымкі, гарадзкія панарамы, рэдкія фатаграфічныя дакумэнты. Квіткі 2000.

Канцэрт Аляксандра Новікава

У Канцэртнай залі «Менск» **8 ліпеня** (чц) а 19-й — канцэрт Аляксандра Новікава. Квіткі 15000—70000.

Unplugged Тодара

Зьміцер Вайцюшкевіч наважыўся даць летні канцэрт у Менску. **20 ліпеня** Зьміцер Вайцюшкевіч будзе сьпяваць у Палацы вэтэранаў. Такім чынам музыка справіць сваё 33-годзьдзе. Лідэр «WZ-orkiestra» прэзэнтуе першую частку праграмы на вершы Рыгора Барадуліна. Як нам паведаміў Зьміцер, канцэрт пройдзе ў яшчэ больш камэрнай атмасфэры, чым ранейшыя ягоныя выступы: «На сцэне будзе адзін-два музыкі, мы вырашылі даць мінімалісцкі акустычны канцэрт». Акрамя новых песень прагучаць ужо вядомыя творы Тодара: «У нас у абойме больш чым 50 песень, будзем граць пад настрой», — зазначае Вайцюшкевіч.

На сцэну зь віншаваньнямі і сюрпрызамі таксама выйдуць вядомыя музыкі — Ігар Варашкевіч, Аляксандар Памідораў, Алесь Камоцкі, Алег Хаменка. Пачатак а 19-й. Квіткі: ад 6000 да 8000. Т.: 649-08-88, 766-24-25.

Сяргей Будкін

Тэатры

Опэра

8 (чц) — канцэрт «Вянок папулярных мэлёдый».

Балет

9 (пт) — «Легэнда пра Ўленшпігеля».

Музычны тэатар

8 (чц) — «Прынцэса цырку».
11 (ндз) — «Вальпургіева ноч», «Шапэніяна».
12 (пн) — «Каралева чардашу».
13 (аўт) — «Даратэя».
14 (ср) — «Вясёлая ўдава».
15 (чц) — музычнае шоў «Галяктыка каханьня».

Заля камэрнай музыкі

8 (чц) — фартэпіянны дуэт Натальлі Котавай і Валера Баравікова.
12 (пн) — канцэрт вакальнай музыкі. Сьпявае Івона Кавалькоўска (Польшча).
13 (аўт) — канцэрт «Ад Баха да Афэнбаха» ў выкананьні ансамблю «Клясык-авангард».
15 (чц) — вечар арганнай музыкі. Выканаўца — Уладзімер Неўдах.

АФІША

Клюбнае жыцьцё

Графіці

8 (чц), 20.00 — вечар аўтарскай песьні. Т.: 693-74-16, 280-01-54.
13 (аўт), 20.00 — прэзэнтацыя новага дыску аўтара-выканаўцы Сяргея Герасімовіча. Т.: 758-40-54.
22 (чц), 20.00. Выступае сямейны дуэт з Масквы — Віктар Дурыцын і Людміла Кіліўнік з праграмай «Жарты прэч. Лірыка і гумар». Т.: 758-40-54.

Bronx

8 (чц), 22.00. Клюбны чацьвер. dj Aik (Moscow).
9 (пт), 22.00. Live jazz. Flat
10 (сб), 22.00. Teddy Lady Party. D'Jane Uma Junior (Night Life Laboratory).
14 (ср), 22.00. «Carnival of Venice» (струнны квартэт).
15 (чц), 22.00. dj Necto lucas (Масква).
16 (пт), 22.30. «N.C.».

Белая Вежа

8 (чц), 22.00. White Tower party. dj Grizzly. Квіткі 5000.
9 (пт), 22.00. White Tower party. dj Grizzly. Квіткі 5000.
10 (сб), 22.00. dj Mixell (europop), go-go. Квіткі 10000—20000.

Гудвін

8 (чц), 21.00. Жывая музыка. Група «P.S. Jazz».
9 (пт), 21.00. Жывая музыка. Джаз-трыё «N.C.».
10 (сб), 21.00. Жывая музыка. «Мадэра Хард Блюз».

Ямайка

9 (пт), 21.00. The Preparty + The Afterparty.
10 (сб), 3.00. The Afterparty.

X-Ray

9 (пт), 22.00. dj Top.
10 (сб), 22.00. dj Noche.

Кінатэатры

«Аўрора»

«Ізноў пра вайну». **8—11** (чц—ндз) 18.30.
«Забойная парачка. Старскі і Хач». **8** (чц), **9** (пт) 17.00, 19.00, 21.00, **10** (сб), **11** (ндз) 15.00 (іл) 17.00, 19.00, 21.00.
«Зімовая сьпёка». **8—11** (чц—ндз) 16.30, 20.30.

«Бярэсьце»

«Брудныя танцы-2»***: **8—11** (чц—ндз) 16.30.
«Ван Хельсынг»***: **8** (чц), **9** (пт) 14.00, 18.30, 21.00, **10** (сб), **11** (ндз) 14.00 (іл) 18.30, 21.00.

«Дружба»

«Ван Хельсынг»***: **8—10** (чц—сб) 18.00, 20.30, **11** (ндз) 18.00 (іл) 20.30.

«Мір»

«Маладыя таткі»***: **8—11** (чц—ндз) 17.00, 19.00, 21.20.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **8** (чц), **11** (ндз) 12.30, 15.00, **9** (пт) 10.00 (іл) 12.30, 15.00, **10** (сб) 12.30, 15.00.
«Апошні самурай»: **8—11** (чц—ндз) 18.00, 20.40.

«Масква»

«Пазаўтра»: **8** (чц), **9** (пт) 16.20, 18.40, 21.00, **10** (сб), **11** (ндз) 14.00 (іл) 16.20, 18.40, 21.00.

«Кастрычнік»

«Пазаўтра»: **8** (чц), **9** (пт) 16.00, 18.30, 21.00, **10** (сб), **11** (ндз) 13.30 (іл) 16.00, 18.30, 21.00.

«Піянер»

«Барвовыя рэкі-2. Анёлы апакаліпсысу»****: **8—11** (чц—ндз) 21.00.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **8** (чц) 10.20 (іл) 16.00, 18.30, **9—11** (пт— ндз) 16.00, 18.30.

«Перамога»

«Ван Хельсынг»***: **8** (чц) 15.50, 21.00, **9** (пт) 15.50, 18.40, 21.00, **10** (сб), **11** (ндз) 16.00 (іл) 18.40, 21.10.
«Маё маленькае прадпрыемства»: **8** (чц) 18.40.

«Цэнтральны»

«Вечнае зьзяньне жарсьці»***: **8—11** (чц—ндз) 13.30, 16.00, 18.30, 21.00.
«Пітэр Пэн»: **8** (чц), **9** (пт) 11.00, **10** (сб), **11** (ндз) 11.00 (іл).

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

Для дзетак

«Аўрора»

«Тайна Заборскага віру»: **9** (пт) 10.30.
«Маленькі Сьцюарт-2»: **10** (сб), **11** (ндз) 14.30.

«Бярэсьце»

«Шрэк»: **9** (пт) 10.30, **10** (сб), **11** (ндз) 12.00.

«Дружба»

«Карлсан, які жыве на даху»: **9** (пт) 10.30, **10** (сб) 15.00, **11** (ндз) 13.00.

«Мір»

«У пошуках Нэма»: **8** (чц) 10.30, 14.00, **9** (пт) 14.00, **10** (сб), **11** (ндз) 11.30 14.00.

«Перамога»

«Блізард»: **10** (сб), **11** (ндз) 14.00.

«Піянер»

«Дзеці шпіёнаў-3D. Гульня скончана»: **8** (чц) 14.20, **9** (пт) 10.20, **10** (сб), **11** (ндз) 14.00.
«Зорныя сёстры»: **8** (чц) 12.50, **9** (пт) 14.20, **10** (сб), **11** (ндз) 12.20.
«Дзеці дажджу»: **9** (пт) 12.20, **10** (пт), **11** (ндз) 10.30.

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

Беларускае порна

Яшчэ пра вайну (Ещё про войну)
Беларусь, 2004, каляровы, 55 хв.
Жанр: Мэлядрама
Адзнака: 3 (з 10)

У апошняй прадукцыі «Беларусьфільму» — «Яшчэ пра вайну» — экран то заліецца летнім і лёгкім трапяткім сьвятлом, то ў кадры паўстануць стрыманыя засьнежаныя дрэвы, а няўлоўны чалавечы адбітак задрыжыць у замерзлай сажалцы. Творца гэтых пекных і празрыстых выяваў — адна з найлепшых апэратараў Тацяна Логінава. Але больш пра фільм сказаць няма чаго. Дакладней, фільму як такога няма.

Ёсьць эклектычная і нікчэмная гісторыя «Муж вярнуўся з камандзіроўкі», дзе апошняя мода — чысьценькія вайсковыя шынэлі, а гукавы фон — урачыстыя паведамленьні Інфармбюро. (Сцэнар Ізольды Кавелашвілі паводле твораў Віктара Канецкага).

Ёсьць дзьве гераіні-мэдсястрычкі, якія невядома нашто парацца ў лазьні і аголеныя бегаюць па сьнезе — што мусіць азначаць лірычныя пакуты й расслабленьне. Зрэшты, нават апранутая жанчына ў карціне выглядае непрыстойна: тупыя вочы, хрыплы подых, дотык — і анічога ўнутры. Ёсьць бабка, тыповыя прадстаўніца народу, якая спрабуе размаўляць на трасянцы. Анатоль Кот у ролі абуранага мужа спрабуе ажывіць гэтую кардонавую пустату, але ягонаму магутнаму таленту патрэбныя іншыя фільмы.

Невядома, на якую аўдыторыю разьлічаны гэты дэбют Пятра Крывастаненкі. Ня думаю, што вэтэранаў парадуюць эратычныя штампы. Аднак яшчэ парачка такіх фільмаў — і «Партызанфільм» будзе гатовы да перайменаваньня ў «Парнафільм».

Андрэй Расінскі

Я марыў стаць парашутыстам

Сяргей Астравец

Адным часам я марыў пра парашуты. Скакаць з самалётнага люка ў цемру. Дагэтуль ня ведаю, ці здолеў бы зрабіць крок наперад, у прадоньне, ці адчуваў бы сябе ў сваёй талерцы ў паветры. Мая аднаклясьніца, якая была ў мяне закаханая, пайшла ў аэраклюб, можа, каб давесьці нам абаім сваю здатнасьць. Яна сама прызналася, калі прыяжджала да мяне ў войска. Бо я казаў ёй, што лунаць з парашутам — для мяне спакусьлівая мара. Сёньня яна навучае хлопцаў не баяцца скакаць. Хлопцаў, якія прыходзяць служыць у літоўскае войска. Яна капітан ці, можа, ужо маёр. Прынамсі, мела капітанскія адзнакі, калі я бачыў яе апошнім разам.

Так, я не сказаў яшчэ, што мае школьныя гады скончыліся ў цяпер незалежнай краіне, у Літве. Але атрымалася, што сёньня я з паўднёвага боку мяжы. Я мог, мог, я гэта выразна усьведамляю — што мог бы цяпер жыць з эўрапейскага боку ад калючага дроту, за якім яшчэ ня здохла янычарская навала. Розныя полаўцы, хазары ці сарацыны. Але лёс выпаў іншы, зусім іншы. Сапраўды, ці мала кім нам хочацца стаць у дзяцінстве, падлеткамі, маладзёнамі, а выходзіць зусім інакш, жыцьцё выводзіць на свой, часам нечаканы шлях. Дарога можа быць убітым роўным гасьцінцам, аўтабанам, а можа выпасьці балоцістая пуцявіна з куп'ём або, наадварот, горная сьцяжына, камяністая, уздоўж цясьнін. Перапады тэмпэратуры, вышынь, кліматычных умоў, недахоп кісларода ў разрэджаным паветры.

Усё жыцьцё я адчуваў сябе на абмежаванай тэрыторыі, адасоблена. У пэўным сэнсе ў фартэцыі. Але не заўсёды. Часам — у лягеры. (Сёньня — хутчэй у вежы.) Маленства ў вайсковых гарадках за плотам. І так было заўжды — штодня абгароджаны плотам, які ўзмацнялі шэрагі калючага дроту. Мы, сьцішыўшыся, назіралі за небам, за тым, як з заўсёднага «кукурузьніка» выпадалі чорныя кропкі, узьнікалі белыя плямкі, ператвараліся ў дзьмухаўцы парашутаў. Думаю, што кожны ў гэтую хвілю марыў пра парашут, толькі не прызнаваўся. Мы падлічвалі сэкунды свабоднага падзеньня, абавязкова — колькасьць парашутаў, сачылі, куды іх адносіць ветрам. Было прыгожа. Парашутыстаў заўжды скідалі ў добрае, лётнае надвор'е: сонца, блакітнае неба, белыя падушкі аблокаў. Зьнікала стракаценьне нябачнага прапэлера разам з самалётным абрысам. У пэўным бязмоўі парашутысты набліжаліся да зямлі.

Вайсковыя гарадкі за калючым дротам на чужой тэрыторыі, вартавая вышка побач з домам, жаўнеры з аўтаматамі. Раптоўны зыход узброенай калёны дзеля акупацыі яшчэ адной суседняй краіны. Страх неабароненага жыхарства, чуткі аб прызабытым «дніікс», калі мясцовае насельніцтва нападала на гарадкі, на вартавых, на вайсковыя машыны. Жыцьцё, якое мела на ўвазе заўжды магчымы напад. Боязь небясьпекі. Лёгкі адрэналін.

Я захапляўся фільмамі пра парашутыстаў. Нават не падазраючы, што мне наканавана быць на другім баку. У тыя дні цэлыя парашутныя дывізіі з боезапасам дэсантаваліся на чужыя гарады і аэрадромы. Супрацоўнікі падпольных радыёстанцыяў з рызыкай для жыцьця паведамлялі пра рух акупацыйнай арміды, пра супраціў ёй, пра ахвяры, заклікалі заблытваць ворага, уводзіць у зман, зьнішчаць дарожныя знакі, паказальнікі, мяняць іх месцамі. Яны паведамлялі ўказаньні ўраду, які мусіў перайсьці на нелегальнае становішча, паведамлялі пра хвалю абурэньня ў сьвеце.

Але мне яшчэ было невядома, што самому давядзецца паведамляць пра танкавыя калёны, пра вяртаньне чужынскіх парадкаў. Гэта было потым. А ў школьныя гады я захапляўся парашутыстамі. Дзіва што: змалку я гадаваўся пад «Марш авіятараў». Яго круцілі на розныя сьвяты, у выхадныя ў клюбе і асабліва часта — на спартовых спаборніцтвах, якія для арміі — абавязковая справа. Сваёй бравурнасьцю марш здаваўся не зусім савецкім. Нядаўна я даведаўся, што ён быў насамрэч маршам люфтвафэ.

Ня мне аднаму падабаўся Ота Скарцэні. Не, немцаў мы не любілі, у сэнсе — фашыстаў, пра якіх амаль штодня распавядалі настаўніцы, пра якіх была палова кніг у школьнай бібліятэцы і мноства фільмаў у клюбе. Ота Скарцэні падабаўся тым, што быў парашутыстам. Мужны твар, нібы ў якога-небудзь Шварцэнэгера, жалезны твар, някідкая зухавасьць, бездакорны вайсковы выгляд. Арлы, крыжы, нашыўка — адзнака за раненьне. З чаго тут зьдзіўляцца? Я рабіў урокі пад «Марш авіятараў», а шточацьвер, калі толькі не было дажджу, над галавой луналі парашутысты. І гэта яшчэ ня ўсё. Адным часам мы жылі ў нямецкім доме, які займаў раней начальнік школы пілётаў люфтвафэ. Мне вельмі хацелася мець нагрудны знак у выглядзе парашута, да якога чаплялася бляшка зь лічбай — колькасьцю зробленых скачкоў зь неба.

Мяне праводзіла ў войска аднаклясьніца. Нашых усіх забралі раней, а нехта паступіў і зьехаў на вучобу. Было няўтульнае золкае надвор'е, сумны непрыемны дзень, хутка сьцямнела. Карацей, было пагана на душы. На камісіі мяне спыталі, куды б я хацеў трапіць. Я сказаў, што ў парашутныя часьці. Афіцэр-літовец паказаў мне запіс мэдыкаў. У цябе адваротны прыкус — на лоб прычапі назад — замест старажытнага гербу, хоць ятаганы крывыя — яны не адрэагуюць.

Прызнаюся: мяне тады апаноўвала жаданьне набыць мундзір з рыцарскай атрыбутыкай і выйсьці ў горад. Урэшце, я афіцэр у рэзэрве. Ну, а потым, потым, пасьля ўмоўнага сыгналу, у радыёэтэры заварушылася пятая калёна. «Над усёй Гішпаніяй бязвоблачнае неба». Асобныя сьмелыя хадзілі з рыцарскай цэшкай, калі ўсё рыцарскае трапіла пад забарону. Яны рызыкавалі. А я, спаткаўшы на вуліцы такога, унутрана ўмацоўваўся. Я ганарыўся за іх. У нас парашутныя войскі і бранятанкавыя супрацьпаказаныя. Так і сказаў: «Супрацьпаказаныя». У нас пакуль недабор у супрацьпаветраную абарону, згаджайся… Яна мяне спрабавала супакоіць: вернешся, скончыш унівэрсытэт. Яна першай прадказала мне, што я ў жыцьці буду займацца тым, чым займаюся ўжо дваццаць гадоў. Аказваецца, яна ведала мяне лепей за мяне самога. І таму мела рацыю. Відушчай яе, напэўна, зрабіла закаханасьць.

Як жа я зайздросьціў ня толькі афіцэрам, а нават жаўнерам парашутнага батальёну, які стаіць у нашым горадзе! Пасьля вядомай катавасіі я на ўсе вочы, нібы хлопчык, узіраўся ў іхнія шаўроны, цэшкі, гузікі з рыцарам на кані. Ён трымаў у левай руцэ шчыт з крыжам, а ў правай — узьняты над галавою меч. «Біце ў сэрца іх, біце мячамі, — шапталі мае вусны хрэстамацыйныя радкі, — не давайце чужынцамі быць». Але я бачыў, што самім ім напляваць, што хоць серп з молатам яшчэ ёсьць парашутысты, яшчэ ня ўсё безнадзейна страчана…

А потым усё зрабілася — горш не прысьніш. Глынуць сьвежага паветра ўдавалася штораз радзей. Аднойчы я трапіў на грунвальдзкую ўрачыстасьць. І замежныя прэзыдэнты на трыбуне абменьваліся салодкай пахвальбой, нібы певень зь зязюляй. Яны ні словам не ўзгадалі пра войска, якому замест цэшак з грунвальдзкім рыцарам выдалі янычарскія ятаганы. Быццам гэтага войска ніколі не існавала. Было ганебна, сорамна, прыкра. І міжволі зайздросьціў я жаўнерам брыгады імя вялікага князя Гедыміна, якія хорам прымалі прысягу на гістарычным месцы, і літоўскаму палкоўніку Ёнасу Жукасу. Я думаў пра сваю аднаклясьніцу, уяўляў яе ў форме з адзнакамі з старажытным ваярскім гербам. Я ганарыўся ёю.

Вярнуўся, нібы атрымаўшы паразу на грунвальдзкім полі. А так і здарылася. Хацелася кінуць усё і ўцячы куды-небудзь у замежны легіён, пакуль ня позна, думалася мне. Але, як высьветлілася, было запозна. Мая аднаклясьніца вучылася ў аэраклюбе з былым ужо літоўскім прэзыдэнтам. Яны нават знаёмыя, разам скакалі з парашутам. Яго напаткала цяпер такая мітрэнга… Можа, яны і маюць у чымсьці рацыю. Ледзьве што — імпічмэнт. Але, але. Некаторыя абіраюць прэзыдэнтамі тых, хто не баіцца праляцець на самалёце пад рачным мостам навідавоку ўсёй сталічнай публікі. Папулізм? Магчыма. Але іншыя абіраюць на гэтую пасаду тых, хто правярае на рынку, ці вострыя ў мясьнікоў сякеры і ці пасыпаны калоды сольлю, а таксама — па колькі яек даюць у адны рукі. Кожны любові натоўпу дамагаецца па-свойму. І змагаецца з пагрозай уласнага імпічмэнту.

Мне ня выпала скакаць з парашутам, бачыць зямлю ў выглядзе вялізнай, надзвычай прыгожай і каляровай тапаграфічнай мапы. Замест гэтага я апынуўся ў падземным бункеры, дзе нам не давалі адпачываць уначы, пакідалі наглядчыка, астатнія «дзяды савецкай арміі» ішлі спаць. Мы, зьняможаныя, сядзелі на баявых пастах, не адчуваючы сябе больш людзьмі, вочы заплюшчваліся самі, галовы не трымаліся. І нас з злавеснай радасьцю каралі. На падлогу вылівалі нашымі ж рукамі сьцюдзёную ваду, якую трэ было анучкай зьбіраць назад у плястыкавую сьметніцу безь дзяржаньня. Ваду забаранялася браць на месцы, у бункеры. Па ваду нас пасы-

Насамрэч яны зьбілі пакуль адзін толькі паветраны шар і страшэнна ганарацца.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Ці чулі вы цуд...

быліцы

лалі на вольнае начное паветра, у загаджаную прыбіральню, якая знаходзілася на паверхні на адлегласьці ад уваходу ў падзямельле.

Мы марылі, каб за зьдзек адпомсьцілі паветраныя армады, якіх баяліся і ад якіх ахоўвалі паветраныя межы дзяжурныя каманды ў бункеры. Найлепшага моманту немагчыма было прыдумаць. Парушаючы статут, «дзяды» спалі, змардаваныя «маладыя» безвынікова змагаліся са сном, а «дзяжурны» зьдзекаваўся з тых, хто не вытрымліваў. Так, а неба з сутарэньняў бачылася ў выглядзе сэктараў, у іх рухаліся паветраныя аб'екты, зьвесткі пра якія былі зашыфраваны ў лічбы, што неабходна было перадаваць суседзям па ланцужку. Заўсёды была магчымай каманда — «зьбіць». І ледзь ня зьбілі пасажырскі, які ляцеў з Эўропы, калі адны зьдзекаваліся, астатнія храплі, а маладзён Марыскін ня вытрываў бяссоньніцы.

Парашутыст — гэта лятучы стралок, баявая адзінка. Адважны, спрытны, нібы Робін Гуд. Людзі з падзямельля іншыя. Яны ў лёхах любяць зьневажаць чыйсьці гонар і годнасьць, прыгнятаць, зьдзекавацца, выклікаць маральныя і фізычныя пакуты. Людзі зь неба часта маюць задачу перамагчы падземнікаў, захапіць бункер. Вось за гэта ў той час мне і падабаліся парашутысты яшчэ болей. Быў бы я парашутыстам, думалася мне… Пакуль мы сядзелі пад зямлёю як у друхле, недзе зьбівалі карэйскія пасажырскія «Боінгі», каля крамлёўскага маўзалею сядалі на аднаматорных летаках нямецкія паветраныя хуліганы. А мы марылі пра сонца і сьвежае паветра, пра глыток свабоды і кубак кавы.

Пасьля ўсёй вядомай катавасіі наступіў мір, сонца асьвятліла Эўропу, паветра ачысьцілася. Стала лягчэй дыхаць. Зрабілася адзіным, супольным яно — сонца, якое было раней падзелена на дзьве часткі, як Бэрлін. Але падземныя чалавекі, як сьляпыя краты, баяцца сонечнага сьвятла. Ненавідзяць усё сьветлае, зыркае. Нездарма паэт-клясык напісаў калісьці: «Ты цёмны, сьляпы, быццам крот». Народ падземнікаў, цэлы народ кратоў — фантасмагорыя дый годзе! Яны сядзяць пад зямлёю ў чорных піначэцкіх акулярах і праводзяць бясконцыя вучэньні «Над усёй Гішпаніяй зачышчанае неба». На іхніх падземных маніторах уяўныя касякі скандынаўскіх, балтыйскіх летакоў лятуць і лятуць — хмарамі, як стрэлы, а падземныя чалавекі іх зьбіваюць-зьбіваюць, цалуюцца і прышпіляюць сабе янычарскія ордэны з крывымі ятаганамі. Насамрэч яны зьбілі пакуль адзін толькі паветраны шар і страшэнна ганарацца.

У іх усё крывое. Крывыя люстэркі, у якіх яны разглядаюць свае каўтуны; сапсаваныя крывыя бінаклі, празь якія яны бачаць Эўропу. Яны дагэтуль трызьняць пра халодную вайну, якая для іх — што тая родная матка, дагэтуль трымаюць бамбасховішчы і сьняць ядзерную зіму. Яны па-ранейшаму ўяўляюць сьвет чорна-белым. Я ня стаў парашутыстам. Я стаў адным з тых, хто гаворыць праўду аб тых, якія ненавідзяць пах Эўропы. Яны працягваюць гуляць у Чапая, рыхтуючы свае тачанкі з максімамі, бронецягнікі, маўзэры, наганы і шаблі.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

* * *

Даглядаў дзед калгасныя пчолы. Меў, вядома, і свае. Калі калгасны мёд зьбіраў, наўмысна распуджваў пчолы, каб яны лёталі па вуліцы, а людзі не маглі прайсьці. Неблагі прыбытак меў прадпрымальны пчаляр. У сваё апраўданьне ён заўсёды казаў:

— Бач ты, калгасныя пчолы! Лянівыя. Мёд насіць ня хочуць!

* * *

Было гэта яшчэ за тым часам, калі сельсаветаўскія позвы па-беларуску пісаліся. Атрымаў такую позву адзін з жыхароў Асіповіцкага раёну, раскрыў і чытае ўголас:

— Паваж́аны таварыш Батура, — дзівіцца. — І хто мяне важыў? Хіба тым годам на зернетаку? Дык чаму толькі цяпер пішуць?

* * *

Пачатак 90-х. Пераход да рынкавай эканомікі. Першыя біржы і аўкцыёны. У закінутай вёсцы за 30 кілямэтраў ад Бабруйску таксама ідзе аўкцыён. Хлопцы выдурваюць у старой бутэльку:

— Баба, прадай самагонкі.

— Не магу, дзед прадаваць забараніў. І жыта жаць трэба. І на сьмерць трэба.

— Баба, ты паміраць ці жыта жаць сабралася?

— Купіце ў Веры, яна прадае.

— У нас грошай няма.

— А я за так не аддам.

Пашурудзіўшы па кішэнях, пабегаўшы па суседзях, патрэбную суму ўсё ж знаходзяць.

— Не, за етыя грошы я не аддам, дзед забараніў.

Накідваюць яшчэ трохі. Старая ўпарціцца. У ход ідзе апошні аргумэнт:

— Грошы і дзьве буханкі хлеба!

Бабка ідзе па пляшку. Пашчасьціла выгодна прадаць. Крама за два кілямэтры. Хлеб там даўно раскупілі, а сьвежы толькі праз чатыры дні прывязуць.

* * *

Састарэлую жыхарку Бабруйшчыны дачка на зіму забрала да сябе ў Кобрын. Бабулі хутка надакучыла гасьцяваньне. Нягледзячы на гады, старая мела баявы нораў. Выйшла на шашу. Спыніла спадарожную машыну. Адлегласьць больш у як трыста кілямэтраў яе не зьбянтэжыла:

— Вадзіцель, завязі мяне туды, дзе мая сястра жыве.

* * *

Гудзе бяседа. Адзін з гасьцёў падвыпіў і крычыць зухавата:

— Дайце мне гітару! Дайце мне гітару!

Нейкая цётка не вытрымлівае:

— Дайце яму гітару, хай бы пайграў!

Жонка самазванага музыкі:

— Дык ён жа ня ўмее!

* * *

У тыя часы, калі цукар яшчэ драбкамі быў, пахаў селянін у горад. А вярнуўшыся дадому, распавядае аднавяскоўцам пра сваю кемлівасьць:

— А я іх абманіў, чай сьпіў, сьпіў, а цукар з сабой забраў!

* * *

Старая вяскоўка з-пад Бабруйску абгаворвае сваю знаёмую, таксама пэнсіянэрку:

— Баба яна харошая, але распусная. Грошы распусьціць, распусьціць, от і няма!

* * *

Калісьці прафэсія касманаўта была дужа прэстыжнай. Прыехаў у госьці да сваячкі былы вясковец, а цяперака мянчук, і пачаў землякам пра свае посьпехі распавядаць. Кульнуў чарку, другую, трэцюю, дагаварыўся да таго, што зьбіраецца ў космас. Сёй-той са старэйшых разьвесіў вушы. Хто адгаворвае, хто даводзіць, нібыта вёска цяперака праславіцца на ўвесь Саюз. Маладзейшыя адно пасьміхаюцца. «Касманаўт» з адукацыі меў будаўнічы тэхнікум, а з хваробаў — цукровы дыябэт.

Адзін зь дзецюкоў цішком тлумачыць старому бацьку:

— Раз ён з намі самагонку піў, дык у космас яго ўжо не пашлюць. П'яніцу ў космас нізавошта не адправяць, бо там ён не пахмяліцца.

* * *

На лаўцы сядзяць бабулькі ды выхваляюцца сваімі дзецьмі. Да іх падыходзіць суседка, у якой зяць у турме, і кажа з гонарам:

— Я грошы палучыла. Перадачу зьбяром ня горай як у людзей. Бо хораша ён там сябе вядзець!

Тацяна Барысік

● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ ●

Беларусь у малюнках Напалеона Орды / Аўт. уст. арт. А.Кулагін; Уклад. А.Кулагін, У.Герасімовіч; Маст. А.Хількевіч. — Менск: Беларусь, 2004. — 144 с.: іл. 1500 ас.

Мастак і кампазытар, удзельнік паўстаньня 1830—1831 г., сябар А.Міцкевіча й Ф.Шапэна, Напалеон Орда пасьля вяртаньня з эміграцыі амаль 20 гадоў прысьвяціў падарожжам па Беларусі. У альбомах майстра засталося каля 1000 замалёвак старажытных храмаў, замкаў, палацаў, сядзіб: Бялынічы, Бяроза, Гомель, Горадня, Лагойск, Ліда, Мір, Наваградак, Нясьвіж, Полацак, Ружаны... Орда адлюстраваў веліч і ціхі заняпад шляхецкае Беларусі. Кожны яго малюнак — сапраўдны мастацкі дакумэнт, тым болей што некаторыя з намаляваных мастаком архітэктурных помнікаў не зьберагліся. Тэксты альбому — па-беларуску і па-ангельску. Першае выданьне выйшла ў 2001 г. Цана 14410 руб.

Тычына М. Кузьма Чорны: Эвалюцыя мастацкага мысьленьня / НАН Беларусі; Ін-т літ. імя Я.Купалы. — 2-е выд., выпр. і дап. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 168 с. 1500 ас.

У даўняй кнізе знанага беларускага літаратуразнаўца (першае выданьне дасьледаваньня выйшла ў 1973 г.) разглядаюцца фэномэн мастацкага мысьленьня й шляхі, якімі пісьменьнік ператварае факт жыцьця ў факт мастацтва.

Леся Украінка. Мэлёдыі журбы і надзеі: Вершы і паэмы / Укл. В.Жуковіч, В.Стралко. — Менск: Кавалер Паблішэрс, 2003. — 128 с.: іл. 500 ас.

Дзякуючы працы М.Аўрамчыка, Н.Гілевіча, С.Грахоўскага, Н.Мацяш і інш. гучаць па-беларуску лірычныя цыклы «Мэлёдыі», «Сьлёзы-пэрлы», «Сем струнаў», творы, прысьвечаныя Сяргею Мяржынскаму — каханаму паэткі. У зборніку друкуецца таксама паэма «Апантаная», якую Леся Украінка напісала ў Менску. Шукайце ў «Акадэмкнізе». Цана 3100 руб.

Брест: Путешествие сквозь века / Сост.И.Лавровская, А.Кондак. — Брест, 2004. 1900 ас.

Прысьвечаная гісторыі Берасьця й багата ілюстраваная гербамі старажытных мясцовых родаў, гравюрамі, жывапісам, выявамі архітэктурных помнікаў XVII—XIX ст., гэтая брашура зьмяшчае тэксты на расейскай і ангельскай мовах.

Владимир Мулявин: Нота судьбы / Ред.-сост. Л.Крушинская. — Минск: Мастацкая літаратура, 2004. — 446 с.: ил. 3000 ас.

«Нота лёсу» — праект маштабны: тут сабраны выказваньні дзясяткаў асобаў, у тым ліку найбуйнейшых палітычных ды рэлігійных дзеячоў Беларусі, а таксама вядомых музыкаў, мастакоў, літаратараў, артыстаў (А.Пахмутавай, М.Фінбэрга, Э.Ханка, Я.Паплаўскай і інш.). Большасьць сабраных матэрыялаў — эксклюзіўныя, нязначная частка — перадрукоўкі з пэрыёдыкі. Стварэньне «Песьняроў», гісторыя напісаньня песень, выступы й гастролі ў Беларусі й за мяжою, Мулявін як чалавек, музыка, сьпявак — усё гэта знайшло сваё адлюстраваньне ў зборніку. У выданьні друкуецца вялікая колькасьць фатаздымкаў і дадатак-падсумаваньне — «Даты жыцьця й творчасьці Мулявіна».

Тацяна Вабішчэвіч

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Апошні вэтэран

Неяк, тусуючыся на нямецкай антыфа-канфэрэнцыі, стаў сьведкам цікавай дыскусіі. Абмяркоўвалі далікатнае пытаньне — усё большы фізычны дэфіцыт удзельнікаў другой сусьветнай.

Няма больш эфэктнай зброі супраць уздыму правага экстрэмізму, чым асабістыя сустрэчы маладняку і былых сябраў СС, СА і Вэрмахту, якія, натуральна, вызналі памылкі маладосьці. Старыя хутка прамываюць мазгі юным сымпатыкам Алаізавіча: «Што за музыку слухаеш, сынок? «Die Fahne hoch» Хорста Вэсэля? Кажаш, быў такі герой арыйскай расы, якога забілі жыдакамуністы? Ведаў я гэтага Хорста з Фрыдрыхсхайму. Пяро яму пад рабро сапраўды засунулі, аднак не дзеля расы. Прычына банальнейшая — адмовіўся башляць за кватэру. Братва, якой руліў сябра кампартыі, паставіла яго на «лічыльнік», забілі стрэлку — і ў выніку макруха. А ты кажаш — раса. Заплаціў бы Хорст своечасова — дасюль бы гарланіў свае куплеты».

Аднак гады бяруць сваё, і сьведкаў тых легендарных часоў становіцца ўсё менш. Як вынік, антыфа чэшуць у патыліцах — чым і як замяніць.

Цікава, што падобнае пытаньне стаіць і перад беларускімі ўладамі, якія дзякуючы жывым удзельнікам вайны ў значнай ступені легітымізуюць свой рэжым. Памятаеце бацькаўскі постэр напярэдадні рэфэрэндуму 96-га «Мы свой выбор сделали» з выявай старушэнцыі-вэтэранкі. Парушыць аўтарытэт вэтэранаў у грамадзтве — табу, і з пункту гледжаньня таго, якую ролю адыграла вайна ў фармаваньні масавай нацыянальнай сьвядомасьці, гэта нармальна. Пытаньне ў тым, ці захаваецца міт другой сусьветнай у яго сучаснай інтэрпрэтацыі, калі вэтэранаў, на жаль, будзе станавіцца ўсё меней. Няцяжка падлічыць, што такая сытуацыя не за гарамі. Каб у сьвядомым стане ўдзельнічаць у тых падзеях, WW-2 патрэбна было нарадзіцца як мінімум у 1930-м. Такім чынам, сёньня самаму маладому вэтэрану павінна быць 74, што паводле дэмаграфічнай сытуацыі лукашэнкаўскай Беларусі — ужо цуд. Беларусы, старэйшыя за 75 гадоў, як правіла, разьменьваюць зямную карму на прапіску ў пекле або райскіх шатах.

Дык што будзе з тэмай другой сусьветнай, скажам, у 2010-м, калі вэтэранаў можна будзе сьмела запісваць у кнігу рэкордаў Гінэса як доўгажыхароў? Баюся, што нічога добрага.

У сваіх мэмуарах вядомы клоўн Нікулін прыгадвае апавяданьне бацькі, які на пачатку XX ст. бачыў апошняга ўдзельніка вайны 12-га году. Той вэтэран быў аточаны ўвагай, а сама вайна была часткай расейскай сьвядомасьці. І дзе той міт цяпер? Сьмеху варты быў бы цяпер перадвыбарчы постэр Пуціна ў гусарскіх ласінах.

Калі айчынны міт другой сусьветнай ня будзе тычыцца актуальнай тэмы барацьбы з фашызмам, ён таксама будзе прырэчаны. На жаль, адпаведна лёгіцы чыноўнікаў, у краіне, якая перамагла фашызм, фашызму быць проста ня можа, а ўсе антыфа — гэта апазыцыянэры.

Дарэчы, нямецкія антыфа ў выніку дыскусіі вырашылі падтрымліваць свой антыфа-міт, юзаючы былых сябраў нацысцкіх партый. Яны могуць шмат што распавесьці юнацтву аб сапраўднай сытуацыі ў «белым руху». Адна постаць піянера нэанацызму Хофмана, які на выхад аказаўся не карычневым, а блакітным, чаго вартая! Калі нашыя ўлады паступяць такім жа чынам, то відавочна галоўным вэтэранам XXI ст. наказана быць паліткамэнтатару БТ Сяргею Новікаву, які ў свой час зь несьвядомасьці засьвяціўся ў шэрагах праваабаронцаў — нашчадкаў Кубэ і Гітлера.

Лёлік Ушкін

Балтыка чакае

Вынікі конкурсу для падпісчыкаў на старонцы 2.

Пад фанфары

фэльетон

Працяг са старонкі 2.

Сонца блішчыць на мэдалях вэтэранаў, на пазумэнтах маршальскага мундзіра самага сумленнага ў сьвеце Кіраўніка. Перад галоўнай трыбунай праходзіць калёна спэцбрыгады АМАПу №1, пераможцы спаборніцтва атрадаў хуткага рэагаваньня. Яна дэманструе гледачам інсцэніроўку разгону апазыцыйнай дэманстрацыі. Для ўраўлівых паведамляем: замест сьлезацечнага газу выкарыстоўваецца весяляшчы, замест крыві ліецца журавінавы сок.Сьледам крочаць фізкультурнікі. Фурор у публікі выклікае самы вялікі ў сьвеце 2000-літровы акварыюм, у якім плавае самая прыгожая ў сьвеце плаўчыха, наша Натальля Урасіменя.

Не адстаюць і весьляры. Яны плывуць побач, проста па напаленым сонцам асфальце на ролікавых байдарках, што ня маюць аналягаў у іншых краінах. Праект быў распрацаваны пад асабістым кантролем Кіраўніка нашай краіны.

Стройнымі шыхтамі рухаюцца рэктары найпрэстыжнейшых ВНУ краіны. Перад сабою яны гоняць ня вартых насіць імя студэнта малойчыкаў, якія апаганілі сьвятыя сьцены альма-матэр сумневамі ў дзяржаўнай ідэалёгіі ў цэлым і сьвятой ідэі моўна-культурнай інтэграцыі з Расеяй у прыватнасьці.

А цяпер на праспэкт выяжджае сельскагаспадарчая тэхніка. Яе парад адкрывае новая распрацоўка гомельскіх інжынэраў — супэрбульбакапалка «Спутнік-2004». Перад ёй рухаецца самазвал, рассыпаючы зямлю, сьледам бягуць калгасьнікі, якія зь песьнямі, танцамі й кошыкамі ўпрысядкі садзяць бульбу, а капалка ўсьлед вылівае. Слава пра супэркапалкі шырока разышлася па сьвеце: партыю замовіла падсобная гаспадарка сыктыўкарскага мясакансэрвавага камбінату і аж тры адзінкі — вусьць-каменагорскі сьпіртзавод.

І вось, нарэшце, кульмінацыя сьвяткаваньня, той момант, для якога яно й было арганізавана, для чаго і сабраліся тут вэтэраны і інваліды, фізкультурніцы і аквалянгісты. Кіраўнік спускаецца з трыбуны, каб быць разам са сваім народам, якому ён гарантаваў стабільнае, квітнеючае жыцьцё. Ён узначаліць калёну самых заслужаных людзей краіны, якім выпаў гонар першымі падысьці да залатой калясьніцы з сымбалічнай выбарчай скрыняй і прагаласаваць на рэфэрэндуме за падаўжэньне паўнамоцтваў Кіраўніка краіны, абвясьціўшы тым самым пачатак усенароднай эстафэты. Гэтая скрыня, як алімпійскі агонь, аб'едзе кожны горад, кожную вёску нашай краіны.

Грымяць фанфары.

Сяргей Мікулевіч

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У мінулым нумары «НН» зь віны Рэдакцыі празь няўдалыя падкароты ўтрапілася прыкрая памылка. Замест «св.п.япіскап Ізяслаў (Бруцкі)» трэба чытаць «я.м.мітрапаліт Ізяслаў (Бруцкі)». Няхай Бог умацуе здароўе і дасьць доўгія леты Яго міласьці мітрапаліту Ізяславу.

Дзякуем А. зь Менску за шчодрую і ўчасную падтрымку «НН». Дзякуем таксама спадарыні Юзэфе Найдзюк з Пасадэны (ЗША), што падпісала на газэту «Наша Ніва» на паўгодзьдзе 2-х жыхароў Беларусі. Вялікі ім дзякуй!

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАНЬНІ

Даражэнькай Madre Cosmica нагадваюць пра Дзень сочыва, канфітуру, джэму ды палескага мядочка касьмічныя сыночкі & дачочкі. Гэпінісу й сукцэсу! Лыцар У., Паганка Г., Шляхціц А. ды працавітая гёрлаўка-фром-Інглянд

Віншаваньні ды найлепшыя пажаданьні Юлі Букасавай з нагоды яе Дня народзінаў ад сяброў

Юлю віншуе з Днём народзінаў Сяржук. Зычыць шчасьця, удачы ды ўсяго самага добрага. Жыве Беларусь!

Jula, z Dniom narodzinaŭ! Zyču šmat ščaścia, soniečnaha nastroju dy ŭsiaho najlepšaha. Ščyra tvoj. S.H.

Шчыра віншую Лаеўскага Дзяніса з паступленьнем у БДУ. Гісторыю сваю трэба ведаць кожнаму, а ты яе ведаеш лепш за ўсіх. ВалерКА

Ад усяго сэрца вялікі дзякуй лепшаму сябру Лаеўскаму Дзянісу! Тваё вітаньне — у маёй душы. ВалерКа

Шаноўная Вальцэся! Аматары піва (алькагалічнага і без) віншуюць Вас з народзінамі. Няхай п'янкім ад шчасьця будзе Вашае жыцьцё!

КАНТАКТЫ

Прапануем шырокі выбар беларускай музыкі (дыскі, касэты, плакаты, значкі): NRM, КРАМА, ПАРТЫЗОН, Сокалаў-Воюш і інш. Шукаем прыватных распаўсюднікаў. Зьвяртайцеся: 220085, Менск, а/с 5, 6490888, witals@tut.by, www.BMA.home.by

Стварацца фан-клюб беларускай музыкі. Патрабуюцца актыўныя людзі для папуляризацыі айчыннай музыкі. Тэл. 766-24-25

Турыстычныя выправы ў Полацак. Экскурсіі па горадзе і музэях, начлег. Замова: majsternia@tut.by

Пазнаёмлюся зь беларускім хлопцам. Валянціна. Т.: 259-97-80

Ігар Мухін-Рабянок, патэлефануй мне ў Барысаў па тэлефоне 576-69. Сяржук

Збор ПАТРЫЁТАЎ! Штодзень (open.by чат) 22.00—24.00, пакой «Прыгажосьць роднага»

ПАКОЙ

Здыму пакой танна. Т.: 8-029-676-87-36

ПРАПІСКА

Прапішыце мяне, калі ласка. Т.: 8-029-676-87-36

ПРАЦА

Якасныя пераклады з ангельскай, польскай, французкай, украінскай, маскоўскай на беларускую/ангельскую. Уладзь.Т.: 8-029-678-33-38

Беларускамоўная рэпэтытарка па ангельскай, беларускай, швэдзкай мовах. Вопыт выкладаньня, замежныя стажаваньні. Т. 202-97-20. Наста

Паслугі беларускамоўнага рэпэтытара ў Гомелі на летні час: ангельская, беларуская (любыя ўзроўні), польская, французская (для пачатковцаў). Уладзь. Т.: 8-029-678-33-38

Адказ на шахматную задачу з №24: 1…Тс6, і пагроза 2…Td8 фатальная для белых. Каб ня страціць фэрзя, им давялося б аддаць каня (2. Kb5). У партыі было 1…Фb6? 2. Крg2? Тс6! і чорныя ўсё-такі выйгралі фэрзя і партыю.

9—12 ліпеня
(а таксама 30 ліпеня — 2 жніўня)
запрашаем у вандроўку

«Золота Підкова» Львоўшчыны

Менск—Жоўква—Крэхіў—Львоў—Алеск—Падгорцы—Золачыў—Сьвірж—Менск

Кошт вандроўкі: для дарослых — 45 у.а. + 15000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. +15000 руб.

Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі 0,1—0,5 у.а.).

Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўналетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абаіх бацькоў.

Т.: 8-029-551-30-75, 222-88-76
http://altusplus.narod.ru

Запрашаем на падарожжа **11 ліпеня** (нядзеля) па маршруце: **Менск—Іўе—Лаздуны—Жамыславы—Суботнікі—Геранёны—Тракелі—Беняконі—Гайцюніскі—Менск.**

16—19 ліпеня: Кракаў—Вялічка.

Т. 232-54-58; 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38; 776-24-35 (Павал)

Запрашаем на рок-фэст

«Басовішча»

23—24 ліпеня ў Гарадку (Польшча). Ад'езд — 22-га ўвечары, прыезд — 25-га ўдзень.

Кантакты: 232-54-58; 622-57-20 (Зьміцер)

15–18 ліпеня запрашаем у вандроўку па былой **Прусіі** (**Мальбарк, Гданьск, Грунвальд, Ольштын**) з наведваньнем інсцэнізацыі **Грунвальдзкай бітвы**.

Кошт вандроўкі — 50 у.а. + 21000 руб.

Т.: 620-68-74, 754-24-41

Запрашаем на падарожжа

10-11 ліпеня

Кракаў

Кантакты: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38; 8-029-776-24-35 (Павал).

Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
фота-рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 30152120000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3358. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 7.07.2004.
Замова № 4151.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а